*Анатоль*

*БЕНЗЯРУК*

# К р у п ч ы ц ы

## *1 7 9 4 год:*

Падзеі і памяць
роднай гісторыі

УДК
ББК 84 (4 Беи)-5
Б 46

Н а в у к о в ы р э д а к т а р:
*Г.В. Прыбытка* (Масква)– кандыдат гістарычных навук

Р э ц э н з е н т ы:
*Л.М. Несцярчук* (Брэст) – кандыдат гістарычных навук
*С.У. Дансківх* (Гродна) – кандыдат культуралогіі, дацэнт

Кніга публікуецца па рэкамендацыі кафедры методыкі выкладання беларускай літаратуры і краязнаўства Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна (загадчык кандыдат філалагічных навук, дацэнт *У.А. Сенькавец*) і аддзела культуры Жабінкаўскага райвыканкама (начальнік *В.В. Чапялевіч*).

**Бензярук А.Р.**
Б 46 Крупчыцы. 1794 год: Падзеі і памяць роднай гісторыі / Анатоль Бензярук. – Брэст: ААТ “Брэсцкая друкарня”, 2007. – с.

ISBN

Кніга прысвечана аднаму з найбольш драматычных момантаў беларускай гісторыі. На падставе шматлікіх крыніц паказаны падзеі лета і восені 1794 года, якія разгортваліся на землях Берасцейшчыны. Тут вырашаўся лёс не толькі нацыянальна-вызвольнага паўстання, узначаленнага Тадэвушам Касцюшкам, не толькі Беларусі і Польшчы, але і ўсёй Еўропы.

У цэнтры апавядання – знакамітая Крупчыцкая бітва, якая адбылася 17 верасня 1794 года на землях сучаснага Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці паміж паўстанцкім корпусам генерала Караля Серакоўскага і расійскімі палкамі генерал-аншэфа Аляксандра Суворава.

Апошні раздзел кнігі распавядае пра гістарычныя помнікі, што паўсталі ў вёсцы Чыжэўшчына (колішнія Крупчыцы) у напамін пра падзеі, што адбываліся тут звыш 210 гадоў назад.

Напрыканцы падаюцца спісы афіцэраў – удзельнікаў згаданых падзей, колькасны склад паўстанцкіх аддзелаў, спісы архіўных дакументаў, што ўтрымліваюць звесткі пра баявыя дзеянні ў жніўні – верасні 1794 года.

ББК 84 (4 Беи)-5

ISBN

© Бензярук А.Р., 2007
© Афармленне. ААТ “Брэсцкая друкарня”, 2007

# УВОДЗІНЫ

*Гісторыю скажаючы, пісалі*
*Падзея да спадобы – на скрыжалі*
*Заносілі, а не – вялі на згубу, –*
*Сваёй мінуўшчыны не ведаем, не любім.*
*Калі ж распавядаць пачнуць у школе*
*Праўдзіва пра баі за Крупчыцамі ў полі?..*
Расціслаў БЕНЗЯРУК

Гэтая кніга прысвечана адной з амаль забытых старонак вайсковай гісторыі Беларусі. Крупчыцкая бітва 17 верасня 1794 года – яркая і трагічная падзея, што, безумоўна, заслугоўвае і помнікаў, і памяці. Аднак калі мемарыяльныя знакі, усталяваныя паміж Кобрынам і Брэстам, перыядычна ўзнікаюць на нашых землях, дык народная памяць яшчэ не дастаткова ўспрыняла веліч і трагізм тых гераічных дзён. Яна патрабуе паглыбленага вывучэння розных бакоў мінулага Беларусі, асабліва такіх вузлавых момантаў, якімі адзначаліся вясна, лета і восень 1794 года.

У гэты час Берасцейшчына стала арэнаю моцнага ваеннага супрацьстаяння. Таму нельга лічыць занадта пафаснымі сцвярджэнні, што на гэтых абшарах вырашаўся лёс краін і народаў, а ў шматлікіх сутычках гартавалася ідэя волі, якую распаўсюджвалі паўстанцы. Складаны лёс Беларусі, бы ў люстэрку, адбіўся ў перамогах і паразах 1794 года – першага нацыянальна-вызвольнага паўстання, скіраванага на змаганне за незалежнасць Рэчы Паспалітай.

На жаль, занадта доўга падзеі, знітаваныя з Касцюшкаўскім паўстаннем, ці замоўчваліся айчыннымі гісторыкамі, ці апісваліся вельмі фрагментарна, з дастатковай колькасцю памылак і недакладнасцяў. Усё гэта, у сваю чаргу, не дазваляла скласці аб’ектыўнае ўяўленне пра тыя працэсы, што адбываліся напрыканцы XVIII стагоддзя на Беларусі. Таму для большасці беларусаў гэты час і ягоныя героі не ўспрымаліся як частка нацыянальнай гісторыі і не былі прадметам гонару ды шанавання. Складвалася ўяўленне, што на гэтых тэрыторыях разыгрываліся падзеі, у якіх чужынцы вырашалі свае палітычныя задачы, а беларусы не мелі да гэтага ніякага дачынення. Любы народ гэткую пастаноўку пытання ўспрымаў бы як прыніжэнне нацыянальнай годнасці.

Аднак раней нярэдка па-за дужкамі гістарычнага апісання заставаліся і ўдзел нашых суайчыннікаў у паходах ды бітвах 1794 года, і адметнае месца Беларусі ў паўстанні. Замоўчваліся факты ўдзелу

беларусаў як у расійскіх войсках, так і ў войсках паўстанцаў, што надавала б падзеям 1794 года рысы сапраўднай грамадзянскай вайны. Гэта стала адной з прычын адсутнасці дэталёвых апісанняў бітваў, якія мелі месца на беларускіх землях. На доўгія гады галасы ўдзельніў 1794 года гучалі прыглушана ці ўвогуле маўчалі. І гэта прымушала нас з асаблівай ашчаднасцю адносіцца да дакументаў, пакінутых эпохай, разумеючы асаблівую адказнасць перад памяццю тых, хто пакінуў пасля сябе жывыя сведчанні складаных падзей. Разам з тым, мы спрабавалі глядзець на ўчынкі людзей канца XVIII стагоддзя не столькі вачамі крытычнага нашчадка, колькі поглядам зацікаўленага сучасніка.

Сёння сярод гісторыкаў розных поглядаў і накірункаў ужо не ўзнікае сумненняў наконт адметнай ролі, што адыгралі ў тых падзеях беларускія землі: тысячы шэраговых удзельнікаў, дзесяткі кіраўнікоў збройнага чыну (сярод іх выбітнейшыя – Тадэвуш Касцюшка, Томаш Ваўжэцкі, Стэфан Грабоўскі) не толькі паходзілі з Літвы-Беларусі, але і выказвалі гонар звацца ліцьвінамі.

Стварэнню кнігі, натхненню гістарычнага пошуку спрыялі шмат людзей, сапраўды ўлюбёных у мінуўшчыну Беларусі. З задавальненнем выказваем шчырую ўдзячнасць сябрам, што пазнаёміліся з рукапісам. Іх уважлівае чытанне, шматлікія ўдакладненні ды прапановы паспрыялі паляпшэнню тэкста. Асабліва хочацца сказаць вялікі дзякуй Генадзю Прыбытку, Сяргею Данскіх, Сяргею Літвінцу, Леаніду Несцерчуку, Васілю Чапялевічу, Галіне Бяляк, Юрыю Барысюку, Галіне Снітко – усім разам і кожнаму паасобку. Іх падтрымка канчаткова пераканала нас не спыняцца на складаным і доўгім гістарычным гасцінцы, давесці распачатую справу да лагічнага завяршэння.

Канчатковаю нашаю мэтаю, вобразна кажучы, стала жаданне прыйсці на Крупчыцкае вайсковае поле. Гэтая дарога акрэслена ў кнізе, што атрымала назоў *“Крупчыцы. 1794 год: Падзеі і памяць роднай гісторыі”*. На яе старонках будзе павольна адбывацца збліжэнне з гісторыяй. Але спачатку мы агледзім іншае своеасаблівае “поле бітвы” – той гістарычны дыскурс, тое палемічнае змаганне, што ўжо не адно дзесяцігоддзе вядзецца паміж расійскімі, польскімі ды беларускімі гісторыкамі вакол пытанняў, звязаных з Касцюшкаўскім паўстаннем.

# ЧАСТКА I

## XIX – XXI стагоддзі
## «КРУПЧЫЦКАЯ ВАЙНА»
## Ў ГІСТАРЫЧНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

На працягу стагоддзяў Беларусь неаднаразова станавілася арэнаю жорсткіх знешнепалітычных і ўнутраных канфліктаў. У пісьмовых крыніцах усяго за тры стагоддзі, паміж 1500 і 1800 гадамі, зафіксавана не менш за 350 бітваў, вайсковых паходаў, аблог гарадоў і замкаў, якія адбываліся на беларускіх землях [1].

Здаецца, пры такім стане рэчаў апісанне бітваў, якія фактычна вырашалі лёс краіны, павіннае знаходзіцца ў цэнтры увагі айчынных гісторыкаў. Тым больш што і цяпер, у XXI стагоддзі, многія актуальныя палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і дэмаграфічныя пытанні сваімі каранямі ўзыходзяць да неспакойных часоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Аднак, як гэта ні дзіўна, у сённяшняй беларускай гістарыяграфіі практычна адсутнічаюць навуковыя даследаванні дый проста папулярныя выданні, прысвечаныя асобным бітвам, што адбываліся на Беларусі. І ў гэтым нам бачыцца відавочнае адрозненне ад іншых еўрапейскіх нацыянальных гістарычных школ, якія шматразова падрабязна апісвалі найбуйнейшыя вайсковыя сутыкненні ў гісторыі сваіх краінаў, скрупулёзна разбіраючы, напрыклад, бітвы ля Гастынгса і Пуацье, пад Ватэрлоа і Ляйпцыгам, на Барадзінскім і Куліковым палях, тым самым будуючы моцны фундамент нацыянальнай і патрыятычнай годнасці на прыкладах не толькі пераможных, але і няўдалых для сябе баёў, робячы іх узорам самаадданага служэння Айчыне ў цяжкі для яе час.

Калі сёння не існуе ніводнай манаграфіі, прысвечанай нават тым бітвам, што адбываліся на Беларусі паміж 1941 і 1944 гадамі – у прыярытэтны для сучаснай айчыннай гістарыяграфіі перыяд [2], – чакаць больш-менш поўнага апісання бітваў папярэдніх часоў тым больш не даводзіцца. Здаецца, аксіёма: войны не бываюць без бітваў. Бітва ёсць найбольшай канцэнрацыяй намаганняў варожых бакоў дзеля набыцця часовай перавагі ці поўнай перамогі. Таму дэталёвага апісання вайны без разгляду асобных бітваў проста не можа быць. Аднак для беларускай гістарыяграфіі гэтая аксіёма, бадай, не існуе. Наадварот: калі войны тут яшчэ апісваюцца, дык асобныя бітвы не знаходзяць сваіх даследчыкаў.

Падзеі Касцюшкаўскага паўстання дык і ўвогуле на працягу амаль стагоддзя заставаліся не толькі па-за ўвагаю беларускіх гісторыкаў, але і ўвогуле пад забаронаю. Гэта значна адрознівалася ад сітуацыі, што

складалася ў польскай гістарыяграфіі, дзе падзеі 1794 года асвятлялі шматлікія даследаванні, прысвечаныя не толькі агульным праблемам, звязаным з развіццём паўстання, але і асобным бітвам "рэвалюцыйнай вайны". Цалкам зразумела, што асноўную ўвагу даследчыкаў выклікалі дзве вайсковыя падзеі перыяду паўстання, у якіх непасрэдна браў удзел Тадэвуш Касцюшка: бітвы пад Рацлавіцамі (4 красавіка) [3] і Мацяёвіцамі (10 кастрычніка) [4]. Кожная з іх была знакаваю для лёсу паўстання. Аднак калі першая бітва падавалася як яскравы прыклад усеагульнага ўздыму польскага народа і каталізатар далейшага распаўсюджвання паўстання, то другая ілюстравала трагічны лёс збройнага чыну, станавілася сімвалам яго заняпаду і адначасова – пачаткам новага перыяду змагання за незалежнасць.

У ланцугу гістарычных падзей у перыяд з сакавіка па лістапад 1794 года належнае месца павінныя заняць і яшчэ два важныя звёны: бітвы пад Крупчыцамі і Тэрэспалем, што адбыліся 17 і 19 верасня 1794 года паміж паўстанцкім корпусам генерала Караля Серакоўскага і карнымі войскамі, узначаленымі Аляксандрам Суворавым [5].

## РАСІЙСКІЯ ДАСЛЕДЧЫКІ

Расійскія гісторыкі XIX – пачатку XX стагоддзяў, зыходзячы з пазіцый вялікадзяржаўнасці, у сваіх ацэнках рэзка негатыўна ставіліся да падзеяў нацыянальна-вызвольнага паўстання на землях Рэчы Паспалітай. Дзеянні царызму па падаўленні "польскага мяцяжу" ў іх працах разглядаліся як цалкам натуральныя і атрымлівалі толькі станоўчую ацэнку. Законнасць гегеманісцкай палітыкі Расійскай імперыі, накіраванай на планамерную ліквідацыю суседняй дзяржавы і інкарпарацыю Вялікага Княства Літоўскага не выклікала ў расійскіх даследчыкаў аніякіх сумненняў. У сваіх ацэнках падзей 1794 года яны цалкам адмаўлялі жыхарам беларускіх земляў у іх праве на барацьбу за незалежнасць і самастойнае існаванне. Пры гэтым зусім не браўся пад увагу той факт, што расійскій імперскі ўрад супольна з кіраўніцтвам Прусіі і Аўстрыі парушыў палітычную раўнавагу ў рэгіёне, закладаючы падмурак будучых моцных забурэнняў. Менавіта таму так званае "польскае пытанне" стала адной з найбольш спрэчлівых тэм еўрапейскай дыпламатыі і палітыкі XIX і XX стагоддзяў.

У расійскай гістарыяграфіі (як дарэвалюцыйнай, так і сучаснай) ніводная бітва Касцюшкаўскага паўстання не зрабілася тэмаю асобнай манаграфіі. Хаця да падзеяў "інсурэкцыі", і, у прыватнасці, Крупчыцкага бою ваенныя гісторыкі звярталіся неаднаразова, аднак абмяжоўваліся,

галоўным чынам, фрагментарнымі, прыблізнымі, а часам і памылковымі звесткамі. Напрыклад, падпалкоўнік П. Баброўскі, складаючы “Матэрыялы для геаграфіі і статыстыкі Расіі”, прысвечаныя Гродзенскай губерні, сцвярджаў: *“У 1794 г. 18 верасня граф Сувораў ў паселішчы Крупчыцах, за 14 вёрстаў ад Кобрына, разбіў польскага генерала Серакоўскага, бітва працягвалася ўвесь дзень”* [6]. У дадзеным выпадку былі памылкова названыя дата і працягласць бою.

Артыкул у “Ваеннай энцыклапедыі”, выдадзенай напярэдадні Першай сусветнай вайны, паведамляў пра Крупчыцкую “справу” наступнае: *“Крупчыцы, сяло Кобрынскага павета Гродзенскай губерні. Справа 6 верасня 1794 (у польскую інсурэкцыйную вайну). У Суворава – 13 тыс. корпус. Нашы страты па розных крыніцах вагаюцца ад 350 да 700 чалавек; палякі страцілі каля 3000 чалавек”* [7].

Для расійскіх дарэвалюцыйных гісторыкаў галоўным героем падзеі станавіўся генерал А. Сувораў. Бітва разглядалася толькі як яшчэ адна яркая старонка ў біяграфіі будучага фельдмаршала. Дз.М. Бантыш-Каменскі, ствараючы ў 1840 годзе партрэт палкаводца, коратка спыніўся на ягонай дзейнасці пад Крупчыцамі: *“Ягонымі ўзважанымі распараджэннямі польскія войскі былі абяззброеныя ў розных пунктах... Сувораў падчас паходу ехаў вярхом, каб падаць прыклад афіцэрам. Зрабіў за тры тыдні 560 вёрстаў. Авалодаў у Кобрыне магазінамі. Разбіў пры Крупчыцах семнаццацітысячны корпус Серакоўскага; паклаў на месцы да трох тысяч чалавек; прымусіў да ўцёкаў; схапіўся ў другі раз з ім і Касінскім* (Красінскім. – А.Б.) *пры Бжэсце; захапіў усю іх артылерыю, якая складалася з 28 гармат; данёс Задунайскаму: “Корпус Серакоўскага скончыў!” – узнагароджаны брыльянтаваю пятліцаю на капялюш і трыма гарматамі”* [8].

У прыведзеным урыўку хапае недакладнасцяў. Галоўная з іх – значнае, больш чым ў тры разы, перабольшванне колькасці паўстанцаў, якімі камандаваў К. Серакоўскі. Аднак, як аказалася, і гэта яшчэ не было мяжою. У 1867 годзе пабачылі свет “Запіскі” ўдзельніка згаданых падзей Льва Энгельгардта (1766-1836). Мемуары, падрыхтаваныя да друку ягоным зяцем М. Пуцятаю, выйшлі ў свет толькі праз трыццаць гадоў пасля смерці аўтара. Яны ўтрымлівалі цікавыя замалёўкі з натуры, але ў апісанні падзей, якія разгортваліся паміж Берасцем і Кобрынам, мемуарыст дапускаў вялікую колькасць недакладнасцяў: *“Граф Сувораў... сабраўшы корпус тысяч у 12-ць каля Варковічаў, раптоўна пад Кобрынам разбіў Серакоўскага* (?), *які адступіў да Крупчыцаў на моцную пазіцыю і атрымаў значныя посілкі* (?), *але і там другі раз быў знішчаны* (?). *Пасля гэтага, не даючы ніякага адпачынку, Сувораў разбіў моцны корпус, што знаходзіўся ля Брэста-Літоўскага пад камандаю Макраноўскага* (?). *Ва*

*ўсіх гэтых справах 25 тысяч* (?!) *чалавек палякаў з іх артылерыяй быццам і не было"* [9]. У згаданым тэксце пераблытана літаральна ўсё. На самой справе, пад Кобрынам Суvotraў разбіў атрад Казіміра Рушчыца, і таму пад Крупчыцамі сустрэўся з К. Серакоўскім упершыню. Тым больш што гэтую бітву нельга аднабока трактаваць як паражэнне паўстанцаў. Каля Берасця расійцы зноў сутыкнуліся з серакоўцамі, але названы Станіслаў Макраноўскі ў той час знаходзіўся далёка ад месца бою – у Гародні, куды выехаў загадзя па асабістым распараджэнні Тадэвуша Касцюшкі. Мы ўжо нават і не гаворым, што сама колькасць паўстанцкіх сілаў перабольшаная ажно ў пяць разоў!

Пасля ўключэння беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі так званая "касцюшкоўская традыцыя" была штучна замененая на "сувораўскую". Бітвы пад Крупчыцамі і Берасцем не былі забытыя, але падаваліся толькі як яшчэ адно пераканаўчае сведчанне непераможнасці Суворава і славы рускай зброі. Таму спачатку расійская, а затым і савецкая гістарыяграфія папрацавалі над тым, каб у абодвух баях лаўры пераможцы (выключна на падставе рэляцый расійскага боку) безумоўна дасталіся будучаму фельдмаршалу. Пры гэтым нават не рабілася спробы крытычна прааналізаваць крыніцы, якімі ў першую чаргу з'яўляліся рапарты самога Суворава, поўныя недакладнасцяў і нават супярэчнасцяў.

Прыкладам, каб высветліць колькасць паўстанцаў, даследчыкі шырока карысталіся сувораўскім лістом, накіраваным 17 (6) верасня 1794 года з-пад Крупчыцаў на імя Пятра Румянцава-Задунайскага. У рапарце, прынамсі, адзначалася: *"Па паказанні палонных, у Бржэсце цяпер знаходзіцца мяцежнікаў... пяхоты больш за 13000, кавалерыі да 3500 рэгулярных"*. На падставе гэтых дадзеных пэўны час лічылася, што Караль Серакоўскі прывёў з сабою пад Крупчыцы не менш за 16000 ваяроў. Аднак ніжэй у тым самым сувораўскім лісце даводзілася: *"Атакаваны непрыяцель змагаўся моцна болей за пяць гадзінаў, але разбіты. Згубіў забітымі да двух тысяч... Я з войскамі іду к Бржэсцю, дзе па паказанні засталося іх не больш за тысячу"* [10].

Простая арыфметыка і элементарная логіка, здаецца, не дазваляюць давяраць гэтым супярэчлівым лічбам, значна перабольшаным расійскім бокам напярэдадні бою. Аднак і сёння ў публікацыях як расійскіх, так і айчынных даследчыкаў можна сустрэць згадкі пра 16000 серакоўцаў, якія пасля Крупчыцаў знікаюць у невядомым кірунку, каб праз нейкія суткі цудоўным чынам адрадзіцца, падобна легендарнаму Феніксу, і прыняць новы бой пад Берасцем [11].

Дакументы, прысвечанныя Крупчыцкаму бою, пачалі з'яўляцца ў друку з пачатку XX стагоддзя. Значная роля ў гэтым належыць капітану 2-

га Брэст-Літоўскага пяхотнага батальёна Філіпу Харкевічу, які зімой 1899/1900 года наведаў Крупчыцы і сумесна з фатографам (афіцэрам таго ж батальёна Высоцкім) зафіксаваў мясціны, звязанныя з боем, і апавяданні навакольных сялян пра падзеі на Крупчыцкіх палях у верасні 1794 года. Вынікам працы Харкевіча і яго сябра сталі публікацыі на старонках "Варшаўскага ваеннага часопіса" некалькіх артыкулаў і выданне ў якасці дадатку да часопіса "Альбома Сувораўскіх палёў бітваў" [12]. Публікацыі папярэднічалі цалкам справядлівыя словы рэдакцыі "Варшаўскага ваеннага часопіса": "*Вынікі вышукаў надзвычай важныя... і служаць доказам, як шмат можа зрабіць чалавек, калі ён паставіцца з поўнай любоўю да справы*" [13].

Пачынаючы з 40-х гадоў XX стагоддзя, калі афіцыйная ідэалагічная машына пачала геразаваць "подзвігі" расійскай зброі і ствараць сапраўдны культ Суворава, у расійскім друку сталі з'яўляцца дакументальныя зборнікі, прысвечанныя асобе генералісімуса. Сярод вайсковых справаў, у якіх браў непасрэдны ўдзел палкаводзец, неаднойчы згадваліся вераснёўскія падзеі 1794 года, што разгортваліся на палескіх абшарах [14].

## ПОЛЬСКІЯ ДАСЛЕДЧЫКІ

Польская гістарыяграфія, у адрозненне ад расійскай, адводзіла крупчыцкім падзеям значнае месца ў Касцюшкаўскім паўстанні. У XIX стагоддзі публікацыі польскіх аўтараў, прысвечаныя Крупчыцам, выходзілі выключна ў эміграцыі ці на тэрыторыях колішняй Рэчы Паспалітай, якія па выніках падзелаў апынуліся па-за межамі расійскай юрысдыкцыі, а значыць – і расійскай цэнзуры.

У 1871 годзе ў Дрэздэне Юзаф Крашэўскі надрукаваў нататкі Міхала Дэспат-Зяновіча, прысвечаныя апісанню ваеннай кампаніі дывізіі Караля Серакоўскага ўлетку і ўвосень 1794 года. Там, натуральна, знайшлося месца і для падзеяў паміж Берасцем і Кобрынам [15].

Напярэдадні сотых угодкаў паўстання ў кракаўскім часопісе "Касцюшка" з'явілася апісанне Крупчыцкай бітвы, якое проста стракацела недакладнасцямі. Днём бітвы памылкова было названае 18 верасня, а вынікі бою, у піку расійскім гісторыкам, былі ацэненыя як пераканаўчая перамога паўстанцаў. Сілы А. Суворава, паводле артыкула, налічвалі 15000 чалавек пры 60 гарматах, а К. Серакоўскага – 5000 салдат з 35 гарматамі. Бітва апісвалася наступным чынам: "*Пасля шматгадзіннай жорсткай атакі і страты пары тысяч людзей* (Сувораў – А.Б.) *пераправіў за Мухавец так званым Казіным Бродам (які яму за 50 дукатаў*

*паказаў яўрэй), сваю конніцу і гарматы з батальёнам стральцоў, заняў выгаднейшыя пазіцыі і з іх пачаў біць нашых. Толькі тады, пасля зацятага бою, які працягваўся цэлы дзень* (?), *Серакоўскі вымушаны быў адысці, што і зрабіў у найлепшым парадку... гэта прызнаў і сам Суvotraў. Занятыя пазіцыі непрыяцель аплаціў стратаю больш чым 3000 чалавек* (?), *з трупаў пабудаваў грэблю на Крупчыцкіх балотах і не ўзяў аніводнага палоннага* (?), *не захапіў аніводнага парахавога воза. Нашыя страты склалі 192 палеглых і 67 параненых"* [16].

Як бачым, у процівагу расійцам, палякі інтэрпрэтавалі вынікі бою на сваю карысць. Пра гібель трох тысяч царскіх жаўнераў распавядалі таксама Казімеж Барташэвіч [17] і Антоні Хланеўскі [18]. Аднак, як высветлілася, і гэта яшчэ быў далёка не канчатковы "падлік" чужых стратаў. Яўстахій Сьмялоўскі ў біяграфіі Т. Касцюшкі сцвярджаў: *"Суvoраў, хоць і пабіў Серакоўскага, рушыў за ім вельмі павольна, бо з 17 тысяч ягонага войска нашы забілі пяць тысяч чалавек"* [19].

У часопісе "Касцюшка" таксама прыводзіўся рапарт Караля Серакоўскага ад 19 верасня: "... *маскоўскае войска пад камандаю генерала Суворава ў пераважнай колькасці атакавала войска Рэчы Паспалітай пад Крупчыцамі. У той дзень нашы далі мужны адпор са значнымі стратамі для непрыяцеля і з належным адступленнем нашага войска да Берасця"* [20].

Тадэвуш Корзан у 1894 і 1906 гадах двойчы выдаў змястоўную біяграфію Т. Касцюшкі, у якой змяшчалася сціслае апісанне Крупчыцкага бою. Пры гэтым аўтар асабліва падкрэсліваў, што бітва адбылася зусім побач (1¼ мілі) з Сяхновічамі – спадчынным маёнткам Тадэвуша Касцюшкі, фактычна малой радзімай кіраўніка нацыянальна-вызвольнага паўстання [21].

Пяру Т. Корзана таксама належыць шматтомнае даследаванне часоў караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага (1764 – 1795 гады). Апошні, шосты том гэтага выдання амаль цалкам прысвечаны падзеям Касцюшкаўскага паўстання. Завочна палемізуючы з А. Суворавым, Т. Корзан цалкам прыводзіць "Рапарт корпуса войска Рэчы Паспалітай (з пералікам) як забітых, параненых, так і збеглых у двух акцыях з пляцу". Гэты дакумент, дасланы Каралем Серакоўскім 8 кастрычніка 1794 года з Карытніцы на імя Т. Касцюшкі, падрабязна апісвае страты паўстанцаў, і гэтыя звесткі абвяргаюць фантастычныя дадзеныя, прыведзеныя раней расійскім военачальнікам. У кнізе Т. Корзана прыводзіцца значная колькасць сведчанняў, якія дазваляюць аднавіць не толькі карціну бітваў пад Крупчыцамі і Тэрэспалем, але і ўвогуле падрабязна прасачыць рух

паўстанцкай дывізіі па Берасцейшчыне і Гарадзеншчыне летам і восенню 1794 года [22].

Адраджэнне ў XX стагоддзі польскай дзяржавы, якую афіцыйныя ўлады называлі Другой Рэччу Паспалітай, падкрэсліваючы тым самым гістарычную, палітычную і духоўную пераемнасць паміж ранейшай краінай і дзяржавай найноўшага часу, выклікала вялікую хвалю публікацый, прысвечаных ключавым момантам польскай гісторыі. Асаблівая ўвага, безумоўна, надавалася Касцюшкаўскаму паўстанню. Часам гэта рабілася з мэтаю яшчэ раз давесці законнасць прэтэнзіяў польскага боку не толькі на ўласную незалежнасць, але і на тэрыторыі, якія да першага падзелу ўваходзілі ў старую Рэч Паспалітую, званую Дзяржаваю Абодвух (а часам і Чатырох) народаў. Навуковая вартасць гэтых публікацый звычайна была невысокаю. Па-ранейшаму яны ўтрымлівалі значную колькасць неабгрунтаваных памылак і неправераных гістарычных фактаў. Напрыклад, у 1917 годзе выйшла кніга А. Сьлівіньскага “Касцюшкаўскае паўстанне” (другое выданне пабачыла свет у 1920 годзе), якая змяшчала кароткае апісанне Крупчыцкай бітвы. Аўтар без падстаў перабольшваў колькасць удзельнікаў бою з абодвух бакоў, ацэньваючы сілы Суворава ў 18000 чалавек пры 60 гарматах, а Серакоўскага – у 6000 жаўнераў пры 28 гарматах [23].

Такім чынам, практычна немагчыма адшукаць польскамоўную публікацыю канца XIX – першай чвэрці XX стагоддзя, якая б не ўтрымлівала пры апісанні Крупчыцкай бітвы нейкай недакладнасці. Значна большую карысць для вывучэння нацыянальна-вызваленчага паўстання маюць выданні дакументальных зборнікаў [24].

На працягу амаль паўстагоддзя (1930 – 1980-ыя гады) выдатны даследчык вайсковай гісторыі Станіслаў Хербст выдаваў працы, у якіх асвятляліся падзеі 1794 года. У вялікай змястоўнай манаграфіі “З вайсковых спраў Касцюшкаўскага паўстання” цэлы раздзел быў прысвечаны падзеям, што разгортваліся на Заходняй Беларусі паміж ліпенем і вераснем 1794 года [25]. Развіццё паўстанцкага руху на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага разглядаў Веслаў Маеўскі [26]. Для нашага даследавання вельмі карыснымі таксама сталі звесткі, прыведзеныя Здзіславам Сулекам у працы “Ваенныя дзеянні дывізіі генерал-маёра Караля Серакоўскага” [27]. Гэтая манаграфія, на жаль, доўгі час захоўвалася ў рукапісе і была часткова скарыстаная толькі пасля смерці аўтара ў фундаментальным калектыўным выданні “Касцюшкаўскае паўстанне 1794 года. Ваенныя справы”, створаным Вайсковым гістарычным інстытутам у Варшаве пад навуковай рэдакцыяй прафесара Тадэвуша Раўскага [28]. Тамы “Паўстання...” ўтрымліваюць багаты фактычны і картаграфічны матэрыял, падрабязна асвятляюць этапы

паўстання, ваенна-стратэгічныя планы супрацьдзеючых бакоў, узбраенне і колькасны склад як паўстанцаў, так і іх праціўнікаў. Асобны раздзел "Крупчыцы – Тэрэспальская грэбля", створаны С. Хербстам, непасрэдна тычыцца тэмы нашага даследавання [29].

Амаль адначасова са з'яўленнем калектывнай працы вайсковых даследчыкаў свае манаграфіі выдаў вядомы гісторык Баўтрамей Шындлер. У крыніцах і каментарах да біяграфіі Тадэвуша Касцюшкі, якая ў асноўным вызначаецца змястоўнасцю і нават педантычнасцю, відаць, па недарэчнасці закраліся памылкі, якія тычацца падзей верасня 1794 года. Даследчык, між іншым, згадвае, што генерал-маёр К. Серакоўскі *"16 і 18 верасня правеў бітвы з Суворавым пад Крупчыцамі і Тэрэспалем, абедзьве прайграныя"* [30]. І ўжо зусім інакш ацэньваюцца вынікі Крупчыцкага бою непасрэдна ў тэксце манаграфіі (дзе, дарэчы, правільна падаюцца і даты бітваў, што насамрэч адбываліся пад Крупчыцамі і Тэрэспалем 17 і 19 верасня 1794 года) [31]. Аднак, паколькі Касцюшка не браў непасрэднага ўдзелу ў "Крупчыцкай справе", аўтар не стаў падрабязна апісваць гэты бой. Між тым, самому паўстанню, найважнейшаму і вызначальнаму перыяду ў жыцці генерала, адводзілася значнае месца. Але каб больш шырока раскрыць падзеі вызвольнага чыну, напярэдадні 200-ых угодкаў Б. Шындлер выдаў спецыяльную працу "Касцюшкаўскае паўстанне. 1794", у якой цэлы раздзел быў адведзены апісанню і аналізу надбугскіх аперацый дывізіі Караля Серакоўскага, а асобныя главы прысвячаліся Крупчыцкай і Тэрэспальскай бітвам [32].

## БЕЛАРУСКІЯ ДАСЛЕДЧЫКІ

Дэталёва даследаваць паўстанне 1794 года беларускія гісторыкі пачалі толькі напрыканцы XX стагоддзя. Перашкодаю на шляху з'яўлення сумленых гістарычных твораў станавіліся ідэалагічныя меркаванні і штампы, якія не дазвалялі асвятляць падзеі і працэсы, у якіх беларускі і расійскі народы выступалі ў якасці праціўнікаў. Асаблівасцю айчыннай гістарыяграфіі, на думку прафесара Міхаіла Біча, заставалася таксама працяглае панаванне ў ёй дзвюх іншанацыянальных канцэпцый – вялікапольскай і вялікарасійскай, якія ў рэшце рэшт зводзіліся да адмаўлення самога факта існавання беларускага этнасу, яго мовы, культуры і да прызнання Беларусі часткай Польшчы ці Расіі [33].

Гэтыя антыбеларускія па сваёй сутнасці погляды доўгі час не дазвалялі гісторыкам увогуле распрацоўваць пытанні, што тычыліся нацыянальна-вызваленчага руху, які разглядаўся як выключна "польская з'ява", скіраваная супраць Расіі. Характэрна, што ў акадэмічнай

пяцітомнай “Гісторыі Беларускай ССР” не знайшлося месца нават для сціслага апісання падзей 1794 года, якія згадваюцца толькі аднойчы: *“Пасля падаўлення паўстання Т. Касцюшкі (восень 1794 г.) Рэч Паспалітая была навогул ліквідавана: у 1795 г. быў падпісаны дагавор аб трэцім падзеле гэтай дзяржавы”* [34]. І гэта ўсё! А між тым агульны аб’ём выдання склаў 3432 старонкі...

На сённяшні дзень на Беларусі ўвогуле не існуе ніводнай працы, прысвечанай нейкай асобнай бітве 1794 года. А невялікія артыкулы, змешчаныя на старонках энцыклапедычных выданняў, гістарычных дапаможнікаў і навукова-папулярных кніг, пры апісанні Крупчыцкай бітвы дасюль стракацяць шматлікімі недакладнасцямі і памылкамі. Відавочна, што ў айчыннай гістарыяграфіі раней не было ўсебаковага разгляду падзеяў 17 верасня.

Доўгі час праблемаю заставалася нават правільная лакалізавацыя месца бітвы. У 1994 годзе рэдакцыя часопіса “Беларуская мінуўшчына”, змяшчаючы храналогію нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі, з аднаго боку, слушна назвала Крупчыцкі бой *“найбуйнейшай бітвай паўстанцаў”*, але з іншага боку, чамусьці аднесла мясцовасць, дзе адбывалася гістарычная падзея, да Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Таму зварот да ўладаў Кобрыншчыны Арганізацыйнага камітэта па святкаванні 200-х угодкаў паўстання з заклікам належным чынам ушанаваць памяць ахвяраў бітвы на Крупчыцкім полі, натуральна, не знайшоў водгуку з боку кіраўніцтва раёна [35]. Разам з тым, на тэрыторыі Берасцейшчыны існуе вялікая колькасць гістарычных мясцінаў, непасрэдна звязаных з падзеямі і ўдзельнікамі Касцюшкаўскага паўстання.

У Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А.В. Суворава экспануюцца рэчы і дакументы, прысвечаныя падзеям 1794 года на Беларусі. У старым музейным памяшканні (так званым “Доміку Суворава”) захоўваюцца матэрыялы, якія непасрэдна тычацца баёў пад Крупчыцамі і Тэрэспалем [36].

У экспазіцыі прадстаўлена палатно беларускага мастака П. Драчова “Бой каля Крупчыцкага манастыра” [37] (выява карціны выкарыстаная таксама пры афармленні ў 2004 годзе Крупчыцкай капліцы ў вёсцы Чыжэўшчына), схемы бітваў, ядры, знойдзеныя на полі каля Крупчыцаў, медная мемарыяльная дошка, прысвечаная падзеі. Дошка, адлітая ў 1913 годзе на сродкі вайскоўцаў кобрынскага, берасцейскага і бярозаўскага гарнізонаў, была ўмацаваная на будынку царквы, узведзенай на месцы колішняга Крупчыцкага каталіцкага манастыра [38].

У беларускай гістарыяграфіі цікавасць да вывучэння падзей паўстання 1794 года ўзрасла з 1990-х гадоў. Увагу даследчыкаў прыцягвалі не толькі агульныя палажэнні, што тычыліся, напрыклад, удзелу ў паўстанні асобных сацыяльных груп насельніцтва Беларусі. Пачалі вывучацца і пэўныя моманты ды постаці нашай гісторыі, звязанныя з падзеямі паўстання, больш дэталёва сталі распрацоўвацца пытанні краязнаўства.

На жаль, айчынныя гісторыкі і краязнаўцы пры апісанні Крупчыцкага бою дасюль дапускаюць зашмат фактычных памылак, якія пераходзяць з выдання ў выданне.

Недакладнасцяў не пазбег нават такі аўтарытэтны даследчык, як прафесар Анатоль Грыцкевіч. У вялікім артыкуле, напісаным для "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі", ён сцвярджаў: *"Разгром паўстання на Беларусі давяршыў корпус Суворава (12 тыс. чал.), які нанёс паражэнне 17 вер(асня) корпусу К. Серакоўскага і атраду К. Князевіча (5 тыс. чал.) у час Крупчыцкага бою"* [39]. Хоць гістарычныя крыніцы сведчаць, што пасланы на дапамогу серакоўцам атрад пад кіраўніцтвам Караля Князевіча спазніўся, а таму ўдзелу ў бітве не браў.

Былая дырэктарка "Сувораўскага" музея Ніна Пліско, справядліва ацэньваючы Крупчыцкую бітву як *"самую значную"* ў паўстанні і называючы паражэнне ў ёй Караля Серакоўскага падзеяй, якая *"перадвызначыла вынік усёй кампаніі"*, памылкова сцвярджае, што паўстанцкі корпус складаўся з 20000 чалавек, а яму супрацьстаяў Аляксандр Сувораў з 5000 салдатамі [40].

У навукова-папулярным выданні Міхася Грыгор'ева "Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі" ўпершыню ў беларускай гістарыяграфіі разглядаліся розныя аспекты вайсковай справы ў Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII стагоддзя. Пры гэтым асаблівая ўвага надавалася гістарычным рэканструкцыям вайсковага абмундзіравання розных фарміраванняў Вялікага Княства Літоўскага. Упершыню ў навуковы ўжытак аўтарам былі ўведзеныя ўзоры формы, графічная рэканструкцыя зброі, разглядалася ўзбраенне кавалерыі, пяхоты, артылерыі ВКЛ, асобная глава была прысвечаная баявым дзеянням рэгулярных вайсковых частак і паўстанцкіх аддзелаў Вялікага Княства Літоўскага пад час паўстання 1794 года. Сярод іншых тагачасных падзеяў на беларускіх землях М. Грыгор'еў сцісла, усяго ў некалькіх радках, апісвае Крупчыцкі бой: *"З 9 раніцы гарматы Серакоўскага адкрылі агонь, але расійскія гарматы маўчалі. Потым адразу пачалася расейская атака, дывізія Серакоўскага была захоплена з флангаў, на тылах таксама з'явіўся праціўнік. Серакоўскі вырашыў адыходзіць, прыкрываючы адыход пяхотным карэ і 3-м паўком*

*Пярэдняй Стражы. А 4-й гадзіне бітва скончылася"* [41]. Пазбягаючы ўласнага каментару бітвы, што разгарнулася на Крупчыцкім полі, даследчык не здолеў адлюстраваць ягоную паслядоўнасць, таму некалькі гадзін вострага супрацьстаяння аказаліся скамканыя. Міхась Грыгор'еў абмежаваўся толькі канстатацыяй факту ды вельмі няўдалаю спробаю апісання.

Значна больш паслядоўным у паглядах на гэтую гістарычную падзею быў Уладзімір Емяльянчык, які першы з беларускіх навукоўцаў вызначыў месца і значэнне Крупчыцкай бітвы як *"найбуйнейшай бітвы часоў паўстання 1794 года на Беларусі"*.

У сваёй кнізе, выдадзенай да 200-годдзя паўстання, У. Емяльянчык адзін з першых разглядаў маладаследаваныя старонкі гісторыі Беларусі, звязаныя з падзеямі нацыянальна-вызвольнага чыну. У тым ліку значнае месца адводзілася апісанню партызанска-дыверсійных рэйдаў паўстанцаў на чале з Міхалам Клеафасам Агінскім, Стэфанам Грабоўскім, Каралем Серакоўскім. Аднак пры апісанні дзейнасці корпуса Серакоўскага на Беларусі аўтар не здолеў пазбегнуць памылак сваіх папярэднікаў. Так, У. Емяльянчык суадносіў сілы К. Серакоўскага і А. Суворава як прыкладна аднолькавыя і вызначаў колькасць салдат з абодвух бакоў ці не ў 20000 чалавек. Гісторык лічыў, што ў крупчыцкім супрацьстаянні ўдзельнічалі *"амаль дзве тысячы беларускіх-сялян касінераў, набраных Серакоўскім пад Берасцем, Кобрынам, Пружанамі, Слонімам і Бярозай"*. Натуральна, даследчык перабольшваў колькасць касінераў і занадта драматызаваў вынікі бою, называючы *"берагі рэчкі Трасцяніцы... крывавымі"*. Агульныя страты паўстанцаў, пад уплывам традыцыі, якая выводзілася з рапартаў расійскіх военачальнікаў, У. Емяльянчык у сваіх ранніх публікацыях даводзіў да 2000 чалавек, дадаючы, што *"бальшыню палеглых складалі маласпрактыкаваныя ў вайсковых справах касінеры"* [42].

Пазней, пішучы артыкулы пра Крупчыцкую бітву для айчынных энцыклапедый і даведнікаў, што выходзілі напрыканцы XX стагоддзя, У. Емяльянчык паслядоўна выкладаў свой погляд на згаданую гістарычную падзею [43]. Для шматтомнага выдання "Гісторыя Беларусі" ён таксама падрыхтаваў змястоўны артыкул, прысвечаны паўстанню 1794 года (трэці том, які ахопліваў гісторыю XVII – XVIII стагоддзяў, пабачыў свет у 2004 годзе, на вялікі жаль, ужо пасля смерці У. Емяльянчыка). Гісторык паслядоўна разглядаў падрыхтоўку нацыянальна-вызваленчага чыну, пачатак узброеннай барацьбы, апісаў адметнасці выступлення на Беларусі, асабліва партызанскую тактыку, якую актыўна выкарыстоўвалі кіраўнікі ліцвінскіх атрадаў. Належнае месца было адведзенае і Крупчыцкая бітве. Даследчык ізноў назваў яе *"найбуйнейшай бітвай часоў паўстання 1794 г. у Беларусі"*, дзе з абодвух бакоў бралі ўдзел каля 15000 чалавек. Ізноў

падкрэслівалася роля амаль 2000 сялян-касінераў, набраных К. Серакоўскім пад Берасцем, Кобрынам, Пружанамі, Слонімам і Бярозай. Аўтар напрыканцы жыцця прыйшоў да высновы, што пад Крупчыцамі страты паўстанцаў не перавышалі 300 жаўнераў, аднак у пасмяротным выданні зноў вярнуўся да лічбы ў 2000 палеглых, параненых ды зніклых без звестак серакоўцаў [44].

Высновы, зробленныя Уладзімірам Емяльянчыкам, паступова былі прынятыя іншымі беларускімі гісторыкамі, асабліва тымі, хто непасрэдна не займаўся падзеямі 1794 года. Прыкладам, у дапаможніку для ВНУ, выдадзеным у 1996 годзе пад рэдакцыяй А.Г. Каханоўскага, змяшчалася характарыстыка падзеі, цалкам пазычаная з прац Уладзіміра Емяльянчыка: *"Пад Крупчыцамі адбылася самая вялікая бітва часоў паўстання: з абодвух бакоў у ёй прыняло ўдзел да 20 тысяч чалавек"* [45].

Звесткі пра Крупчыцкі бой трапілі на старонкі і іншых навучальных дапаможнікаў Беларусі, што, безумоўна, сведчыла пра прызнанне значнасці падзеі ў гістарычным лёсе краіны. Аднак нават гэта не выратавала ад паўтораў старых памылак, кшталту: *"Атрады Касцюшкі не вытрымлівалі ўдараў расійскіх войск Ферзена і Суворава. У жніўні капітулявала Вільня, у верасні каля вёскі Крупчыцы пад Кобрынам церпяць паражэнне атрады К. Серакоўскага (амаль 2 тысячы сялян палягло). Потым разгром пад Берасцем, адыход ад Гародні. Паўстанне пакінула Беларусь"* [46].

На сённяшні дзень у беларускай гістарыяграфіі, дзякуючы найперш працам У. Емяльянчыка, усталявалася ўяўленне пра Крупчыцы як пра значную гістарычную падзею на нашых землях. Таму амаль ніводнае гістарычнае выданне, прысвечаннае часам трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, цяпер не абыходзіцца без згадкі пра Крупчыцкі бой.

Значнаю з'яваю ў айчынным касцюшказнаўстве стала падрыхтоўка і выданне шматлікіх дакументаў, якія тычацца паўстання 1794 года. Гэтую працу апошнім часам паслядоўна ажыццяўляе Яўген Анішчанка. Пачынаючы з 2000 года, ім выдадзены шэраг зборнікаў, дзе, у прыватнасці, змяшаюцца матэрыялы, прысвечаныя жнівеньскім і верасьнёўскім падзеям, што разгортваліся паміж Кобрынам і Берасцем. У нашай працы цытаты з дакументаў, апублікаваных Я. Анішчанкам, прыводзяцца даволі часта, аднак мы вымушаныя падаваць іх ва ўласнай рэдакцыі. Гэта выклікана не толькі вельмі кепскай беларускай мовай перакладаў, але і безліччу фактычных памылак. Напрыклад, амаль паўсюль Ражскі полк называецца Рыжскім, кіраўнік батальёна Крулікоўскі – Кралікоўскім, а генерал Караль Князевіч – Княжэвічам. Палкоўнік 18-га рэгімента Шушкоўскі ператвараецца то ў Сушкоўскага, то ў Рушкоўскага.

Будучы генерал Гябдоўскі ў адным выпадку названы Грабоўскім, а ў іншым – Гедбоўскім. Падпалкоўнік Горман насамрэч меў прозвішча Гофман, а паручнік 18-га рэгімента Рудзінскі, які гераічна загінуў пад Крупчыцамі, – Рудніцкі. Падпаручнік Банчкоўскі беспадстаўна называецца Бучкоўскім, а паручнік Ляшчынскі – Ляшчэжынскім...

Аднак вяршыняй неахайнасці лічым наступны пасаж: *"Асабліва асаромілiся маёр Кiсароўскi з коннай гвардыi, падпалкоўнік Кулеша з батальёна Рафаловiча"*. Па-першая, пад "псеўданімам" "Кісароўскі" хаваецца постаць мемуарыста Станіслава Касмоўскага. Па-другое, замест слова "асароміліся" павіннае ўжывацца слова "адзначыліся". Па-трэцяе, "сорам" маёра Касмоўскага быў настолькі вялікі, што праз дзесяць дзён ён атрымаў за Крупчыцы (адзіны з усяго корпуса!) з рук самога Тадэвуша Касцюшкі залаты пярсцёнак з надпісам "Айчына свайму абаронцу" [47].

У біяграфіі Тадэвуша Касцюшкі, складзенай Леанідам Несцерчуком, асноўная ўвага была нададзеная беларускім старонкам жыцця генерала, найбольш нераспрацаваным ранейшымі даследчыкамі. Вядома, што Т. Касцюшка ў часы паўстання наведваў Беларусь толькі аднойчы – напрыканцы верасня 1794 года. На гарадзенскай нарадзе кіраўнік паўстання, узнагародзіўшы найлепшых сваіх паплечнікаў, фактычна абвясціў пра спыненне супраціву на землях Вялікага Княства Літоўскага. Паўстанцкія атрады, якія яшчэ заставаліся на захадзе Беларусі, накіроўваліся на абарону Варшавы. Нарада адбылася ўсяго праз дзесяць дзён пасля паразы корпуса К. Серакоўскага, якое і вырашыла канчатковы лёс паўстання ў Літве-Беларусі. Таму ў кнізе Л. Несцярчук пэўнае месца адвёў апавяданню пра Крупчыцкую бітву і "Берасцейскую катастрофу" (так аўтар называе Тэрэспальскі бой) [48]. Коратка разглядаецца гісторыя Крупчыцаў і Тэрэспаля, якія сталі арэнаю значных гістарычных падзей, расказваецца пра адраджэнне мемарыяльнай капліцы ў памяць воінаў, што загінулі пад Крупчыцамі 17 верасня 1794 года, прапаноўваецца ўнесці Крупчыцкі мемарыяльны комплекс ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь як значны аб'ект беларускай ваеннай гісторыі. У кнізе разглядаюцца прычыны, ход і вынікі бітваў К. Серакоўскага з войскам А. Суворава, прыводзяцца схемы руху армій паміж 14 і 19 верасня 1794 года і копіі планаў, выкананых суворaўскім картографам падпалкоўнікам Пятром Івашовым [49].

Цяпер, праз два стагоддзі пасля славутай і трагічнай бітвы, наспела вострая неабходнасць вярнуць сапраўдную памяць пра адну з найбольш яркіх і трагічных старонак беларускай вайсковай гісторыі, а таксама выправіць шматлікія памылкі, што суправаджаюць згадкі пра бой К. Серакоўскага з А. Суворавым [50].

Нельга недаацэньваць сапраўднае значэнне Крупчыцкай бітвы, замоўчваць, як было раней, яе агульнаеўрапейскае значэнне. Гэта была сапраўды маштабная падзея, якая не толькі вызначыла лёс Касцюшкаўскага паўстання ў пэўны перыяд, але і стала прычынаю канчатковага трагічнага выніку ўсяго вызвольнага чыну, прывёўшы да скасавання Рэчы Паспалітай як сувярэннай дзяржавы. На гэтую акалічнасць мы неаднаразова звярталі ўвагу ў сваіх ранейшых публікацыях, прысвечанных паўстанню [51], жадаючы падкрэсліць, што ў сярэдзіне верасня 1794 года паміж Берасцем і Кобрынам адбылася не проста значная вайсковая сутычка, але гістарычная падзея, якая мела выключную вайсковую і палітычную важнасць.

Асаблівае ўражанне бітва пакінула ў свядомасці тутэйшых людзей. Вялікая падзея, што адбылася на вачах іх продкаў, засталася ў памяці не аднаго пакалення жыхароў Крупчыцаў ды навакольных вёсак. Таму нават праз стагоддзе сяляне называлі бітву не інакш як “Крупчыцкай вайной”, паданні пра якую дажылі да нашых часоў [52].

KAMUNIKAT.org

# ЧАСТКА II

## 9 мая – 12 ліпеня 1794 года
## ПАЎСТАННЕ БЕРАСЦЕЙЦАЎ

Падзеі, што адбываліся ў сярэдзіне верасня 1794 года на Берасцейшчыне, шмат у чым прадвызначылі далейшы трагічны лёс паўстання, узначаленага ўраджэнцам гэтай зямлі генералам Тадэвушам Касцюшкам. Аднак першапачаткова ніхто з удзельнікаў канфлікту не разглядаў Берасце у якасці месца вырашэння галоўных ваенна-стратэгічных задач кампаніі.

Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай, які быў ратыфікаваны на Гарадзенскім сойме 1793 года, войскі федэратыўнай дзяржавы на тэрыторыі ВКЛ дыслакаваліся найперш у Жмудзі і на землях сучаснай Гарадзеншчыны, галоўным чынам, па-за межамі населеных пунктаў. Расійскія ж сілы, наадварот, кватаравалі ў асноўным па значных гарадах і мястэчках. Найбольш буйныя гарнізоны месціліся ў Вільні, Гародні, Пінску і Берасці, меншыя – у Наваградку, Слоніме, Коўне [53]. Расійскае камандаванне, добра разумеючы выключную стратэгічную ролю, якую адыгрывала Берасце, раскватаравала ў горадзе Санктпецярбургскі драгунскі полк пад началам палкоўніка Аляксандра Часменскага (усяго каля 1880 чалавек) [54].

З выбухам у канцы красавіка 1794 года віленскага паўстання большасць як ліцьвінскіх, так і расійскіх сілаў была сцягнутая пад Вільню, таму Берасце часова апынулася ўбаку ад актыўных баявых дзеянняў. Аднак увага ўладаў суседняе дзяржавы да сітуацыі, што складалася на берагах Буга і Нёмана, не слабела.

6 мая галоўнакамандуючы расійскімі войскамі, размешчанымі у Польшчы і Літве, князь Мікалай Рапнін загадаў генералу Вільгельму Дэрфельдэну: *"А ў той адлегласці належыць вам усе мяцежніцкія зборышчы разбіваць і вынішчаць. Калі будзеце непадалёк ад Бржэсца-Літоўскага..., тады належыць вам схіляцца да месцаў, што ляжаць паміж Слонімам і Гародняй, што дазволіць прыкрыць Нясвіж, з якім надзейную камунікацыю неабходна вам наладзіць, прычым гэтым самым вы аддзеліце літоўскіх бунтаўнікоў ад польскіх"* [55].

Загадваючы падначаленым дзейнічаць больш актыўна, каб не дапусціць злучэння паўстанцаў, галоўнакамандуючы паказаў сваю поўную некампетэнтнасць: ён нават не ведаў колькасць сілаў, падпарадкаваных

Дэрфельдэну, вымяраючы іх ажно ў 32000 чалавек, што амаль у тры разы перавышала рэальную лічбу. Да таго ж расійскія фарміраванні былі раз'яднаныя, сувязь паміж імі была слабою. Не ведаючы пра загад, выдадзены Дэрфельдэну, Аляксандра Часменскі 9 мая вывеў свой полк з Берасця і скіраваўся ў бок Пінска, дзе месціўся значны двухтысячны расійскі гарнізон.

Адразу пасля адыходу царскіх войскаў у Берасці быў скліканы сход "грамадзянаў і жыхароў ваяводства Берасцейскага". На сходзе, які ўзначальваў берасцейскі староста Казімір Нестар Сапега, было ўхваленае далучэнне ваяводства да так званага "Кракаўскага акта паўстання" [56]. У склад утворанай паўстанцамі Берасцейска-Кобрынскай парадкавай камісіі, між іншымі, увайшлі восем праваслаўных святароў.

Гэтая ініцыятыва выклікала разуменне і падтрымку з боку Т. Касцюшкі. 15 мая Найвышэйшы Начальнік (гэтак у час паўстання тытулавалі Тадэвуша Касцюшку) звярнуўся "да абывацеляў берасцейскіх і кобрынскіх" са спецыяльнаю адозваю, у якой падкрэсліваў: "*Далучэнне вашае, грамадзяне і суайчыннікі мае, да Акта народнага паўстання, учыненнае з той шчырасцю і дакладнасцю, якая можа быць уласцівая толькі сапраўдным сынам Айчыны, выклікала наймацнейшае хваляванне ў маім сэрцы*". Т. Касцюшка прасіў землякоў актыўна распаўсюджваць ідэі нацыянальна-вызваленчага руху "*ў іншыя літоўскія паветы, да якіх бліжэйшы ўплыў мець можаце*" [57].

На шчасце паўстанцаў, паміж урадамі Аўстрыі, Прусіі і Расіі, якія бралі ўдзел у задушэнні паўстання, існавала пэўная канкурэнцыя. Члены кааліцыі не давяралі адзін аднаму, бо кожны жадаў прыдбаць сабе больш новых уладанняў, а ва ўмовах вядзення ваенных дзеянняў – і атрымаць лепшую дыспазіцыю. Нават сярод саміх расійскіх генералаў пляліся ніці інтрыг, што таксама дазваляла палякам і ліцьвінам утрымліваць свае пазіцыі, нягледзячы на тое, што па колькасці людзей і ўзбраення агульныя сілы іх праціўнікаў значна пераўзыходзілі паўстанцкія. Прыкладам, расійскія войскі фактычна адмовіліся падтрымаць летні штурм Варшавы, што значна ускладніла становішча прусакаў, якія ў хуткасці вымушаныя былі адмовіцца ад беспаспяховай аблогі сталіцы Рэчы Паспалітай. Прускі ж кароль Фрыдрых Вільгельм II быў моцна незадаволены чуткамі пра намер расійцаў нанова заняць пакінутае імі раней Берасце [58]. І, як выявілася неўзабаве, гэтыя чуткі мелі пад сабою падставу.

У ліпені 1794 года расійскі генерал Вільгельм Дэрфельдэн з 13-тысячнай дывізіяй рушыў з-пад Любліна ў раён Берасця. Генерал-маёр Мацей Франкоўскі, які кіраваў берасцейскаю залогаю, вымушаны быў загадаць сваім людзям пакінуць горад. Гэта было зроблена зусім не з-за

баязлівасці: у Берасці налічвалася толькі 913 паўстанцаў, такім чынам, сілы праціўніка перавышалі іх больш чым у 13 разоў... Расійцы амаль без аніякіх перашкодаў сіламі аднаго авангарда захапілі пакінуты горад.

Дывізія Дэрфельдэна заставалася на берагах Буга тыдзень. За гэты час была праведеная франтальная разведка, жаўнеры адпачылі і папоўнілі свае запасы. 12 ліпеня дывізія рушыла трыма калонамі ў глыб Вялікага Княства. Першыя дзве калоны (на чале з генералам Іванам Загражскім і самім Вільгельмам Дэрфельдэнам) пайшлі на Шарашова і Пружаны. Трэцюю вёў брыгадзір Глазенгофт. Ён ішоў на Пінск – для абароны межаў, якія ўсталяваліся паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай пасля другога падзелу 1793 года. Паход Дэрфельдэна радыкальна змяніў становішча ваенных спраў на сучаснай Берасцейшчыне [59].

Па загадзе Тадэвуша Касцюшкі наўздагон за расійскай дывізіяй рушыў сфарміраваны ў Варшаве корпус генерал-маёра Караля Серакоўскага. Паўстанцкія сілы значна саступалі царскім. Апроч таго, дзеянні Дэрфельдэна былі цалкам непрадказальныя, а ягоная групоўка настолькі ўнушальнай, што яе падыход пад Вільню ці пад Гародню адразу кардынальна змяніў бы там становішча на карысць расіян.

## 12 – 26 ліпеня
## СЕРАКОЎСКІ СУПРАЦЬ ДЭРФЕЛЬДЭНА

Асноўная задача, пастаўленная перад корпусам Караля Серакоўскага, заключалася ў пільным адсочванні руху расійскіх войскаў [60]. Кіраўніцтва паўстанцаў разумела, што паміж Берасцем і Кобрынам адбываюцца надзвычай важныя падзеі. Галоўнакамандуючы ліцьвінскімі войскамі Міхал Вяльгорскі даводзіў Серакоўскаму: “*Пільнуйце Дэрфельдэна, бо цяпер ад вас залежыць лёс Вільні і нават усёй Літвы*” [61]. Прыкладна ў такіх самых выразах пісаў генералу і Тадэвуш Касцюшка: “*Паколькі ад ліквідацыі калоны Дэрфельдэна залежыць лёс Вільні і, бадай, усёй Літвы, заклінаю цябе, генерал, міласцю Айчыны: паколькі цяпер па злучэнні з Хлявінскім ты досыць моцны, пастарайся зрабіць гэта як мага лепей. Твае таленты і шчырая служба Айчыне дазваляюць мне спадзявацца на паспяховы вынік*” [62].

Старонкі ранейшай біяграфіі Караля Серакоўскага сведчылі, што ён здольны выканаць ускладзеную на яго няпростую задачу. К. Серакоўскі нарадзіўся ў 1750 годзе ў Польшчы (нейкі час памылкова лічылася, што ён з’явіўся на свет у Берасці). Як і Тадэвуш Касцюшка, быў выхаванцам варшаўскай Рыцарскай школы (Шляхецкай акадэміі корпуса кадэтаў Яго Вялікасці караля Рэчы Паспалітай), а пасля заканчэння застаўся ў ёй

інструктарам выкладаць матэматыку і геаметрыю. У 1773 годзе атрымаў званне харунжага і падбрыгадзіра, праз пяць гадоў зрабіўся капітанам і брыгадзірам, а 8 верасня 1783 года – маёрам. Напрыканцы 1789 года, ужо ў званні палкоўніка, Серакоўскі атрымаў у каралеўскай школе артылерыі пасаду прафесара і стаў шэфам кароннага корпуса інжынераў. У якасці інжынера праводзіў тапаграфічныя замеры, выконваючы таксама фартыфікацыйныя работы. У 1792 годзе, напярэдадні чарговай вайны з Расіяй, палкоўнік Серакоўскі ўласнаручна распрацаваў план умацаванняў Яснагурскай крэпасці, а калі распачаліся непасрэдныя баявыя дзеянні, кіраваў узвядзеннем у Пулавах маста праз Віслу і стварэннем плана пабудовы кароннага вайсковага лагера ў Сецяхове. Увесну 1794 года, калі Рэч Паспалітую ахапіла паўстанне, палкоўнік умацоўвае падыходы да Варшавы і яе прадмесця Прагі. У маі Касцюшка авансаваў Караля Серакоўскага на генерал-маёра, даверыўшы яму ў чэрвені кіраўніцтва самастойным корпусам, які дзейнічаў пад Блонамі, а таксама даручыў яму дывізію, прынятую ад генерала Ціхоцкага [63].

Першапачаткова дывізія Серакоўскага налічвала каля 3000 жаўнераў. У яе склад уваходзілі: эскадроны кароннай коннай гвардыі генерала Дзянізія Панятоўскага, І-й брыгады вялікапольскай народнай кавалерыі маёра Шышкі і 5-га палка міроўскіх уланаў Караля Кёніга; часткі пешай кароннай гвардыі Яна Фантаны, 5-га кароннага рэгімента фузілераў, 15-га кароннага рэгімента; брыгада вялікапольскіх стральцоў, узначаленая Міхалам Сакальніцкім, а таксама муніцыпальныя батальёны Ксаверыя Крулікоўскага і Яна Рафаловіча.

Са Збучына К. Серакоўскі запытаўся ў Тадэвуша Касцюшкі: ці і надалей рушыць з усімі сіламі следам за Дэрфельдэнам, ці выслаць толькі выведку для высвятлення далейшых планаў расійскіх атрадаў.

Аналізуючы загады Найвышэйшага Начальніка, якія той дасылаў у ліпені – жніўні 1794 года военачальнікам, што дзейнічалі паміж Гародняй і Берасцем, можна зрабіць выснову: уварванне Дэрфельдэна ў Літву расстроіла планы касцюшкаўцаў і пасеяла ў іх шэрагах разгубленасць. Загады, часам супярэчлівыя, выконваліся кепска. Удзельнікі непасрэдных баявых дзеянняў нярэдка не ведалі, каму яны павінныя ў дадзеную хвіліну падпарадкоўвацца, чыіх распараджэнняў слухацца.

Да Караля Серакоўскага быў спешна накіраваны ўпаўнаважаны Народнай Нацыянальнай Рады Ян Непамуцэн Гарайн, які перадаў дывізіі загад ўтрымліваць сярэдняе цячэнне Буга. Выконваючы гэты загад, серакоўцы 12 ліпеня перасунуліся да Янава-Падляскага, дзе неўзабаве атрымалі паведамленне, што Вільгельм Дэрфельдэн пакінуў Берасце [64].

Тады Серакоўскі неадкладна перайшоў Буг і рушыў у бок Камянца. 15 ліпеня з Высока-Літоўска ён выправіў следам за Дэрфельдэнам полк Караля Кёніга і народную кавалерыю, якія павінныя былі сачыць за перамяшчэннямі праціўніка, непакоіць яго, а таксама неадкладна захапіць фураж, пакінуты расіянамі.

Як сведчаць рапарты, дасыланыя К. Серакоўскім на імя Тадэвуша Касцюшкі і Юзафа Арлоўскага, у гэты час дывізія значна вырасла: калі 20 ліпеня яна налічвала 3731 жаўнера, дык праз тыдзень, 26 ліпеня, – ужо 4818 чалавек. Генерал Драгічынскай зямлі Урбанскі далучыўся да паўстанцаў з 300 жаўнерамі і 70 конямі, а таксама Асалінскі і Мажкоўскі прывялі з сабою кавалерыю, складзеную часткова з рэгулярных вершнікаў, часткова з казакоў, а таксама пяхоту – стральцоў і пікінераў. Апроч таго, падчас маршу да дывізіі ўвесь час далучаліся міліцэйскія фарміраванні з Берасця і Кобрына.

Аднак пэўнае непаразуменне ў дзейнасць серакоўцаў на Палессі ўнеслі загады вышэйшага камандавання: ужо выправіўшыся ў паход, паўстанцы атрымалі ад генерала Арлоўскага загад неадкладна паварочваць на поўдзень і ісці ў кірунку Коцка. Выконваючы гэтае распараджэнне, Караль Серакоўскі праз Ратайчыцы і Чарнаўчыцы 16 ліпеня рушыў у бок Берасця і неўзабаве спыніўся каля Тэрэспаля [65].

Але тут прыйшоў ліст ад галоўнакамандуючага Міхала Вяльгорскага, які, запатрабаваўшы, каб дывізія перайшла ў ягонае непасрэднае падпарадкаванне, загадаў К. Серакоўскаму тэрмінова злучыцца з Антоніем Хлявінскім і сумесна разграміць корпус Вільгельма Дэрфельдэна. Выконваючы гэтае распараджэнне, серакоўцы 18 ліпеня скіраваліся з Тэрэспаля на Зэльву, дзе праз дзесяць дзён злучыліся з дывізіяй А. Хлявінскага. Аб'яднаныя сілы паўстанцаў склалі 9000 шабляў. Генералы вырашылі ісці следам за В. Дэрфельдэнам, абраўшы кірунак праз Езярніцу і Слонім ў бок Вільні.

## 31 ліпеня – 7 жніўня
# ПАД СЛОНІМАМ

31 ліпеня пад Слонімам авангардны полк Караля Кёніга быў атакаваны казацкімі раз'ездамі расійскага генерала Барыса О'Брыена дэ Ласі, войскі якога занялі абарончыя пазіцыі на правым высокім беразе Шчары ў слонімскім прадмесці Замосце. Левае крыло расійцаў месцілася паміж стаўком і млынам, правае прыкрывалі лес і рачная пойма.

Паўстанцы ўшыхтаваліся на левым беразе Шчары. Пры гэтым каронныя аддзелы стаялі насупраць горада, а вялікакняскія атрады занялі пазіцыі злева ад іх. Правае крыло трымалі кавалерыя Кёніга і муніцыпальны батальён Крулікоўскага, які размесціўся каля моста абок грэблі.

О'Брыен дэ Ласі, адчуваючы значную перавагу паўстанцаў, паслаў кур'ера да Вільгельма Дэрфельдэна па дапамогу. Той накіраваў пад Слонім генерала Івана Загражскага, які фарсіраваным маршам прыбыў з Беліцы над Нёманам, прайшоўшы за няпоўныя суткі прыблізна 70 кіламетраў.

1 жніўня Караль Серакоўскі загадаў сваёй батарэі пачаць абстрэл пазіцый расійцаў. Аднак, паколькі пазіцыі непрыяцеля былі добра ўмацаваныя, гарматны агонь не зрабіў яму вялікай шкоды. Уранку наступнага дня паўстанцы ўсталявалі дзве гарматы на лузе каля горада, яшчэ дзве – насупраць грэблі, а адну – за ставам. Гэтая артылерыя пачала абстрэльваць расійскі лагер. Адначасова добраахвотнікі з правага крыла рушылі ў бой і, перайшоўшы Шчару, адкінулі патрулі на левым крыле праціўніка. Аднак далейшага развіцця падзеі не атрымалі.

Генерал О'Брыен, адчуўшы недахоп арганізаванасці ў стане паўстанцаў, перайшоў у контрнаступ. У атаку быў кінуты Старааскольскі мушкецёрскі полк пад кіраўніцтвам палкоўніка Пятра Канаўніцына. Мушкецёры перайшлі грэблю, прымусіўшы адступіць батальён Ксаверыя Крулікоўскага, і замацаваліся ў надрэчных дамах. Аднак К. Серакоўскі здолеў спыніць адступленне муніцыпальнага батальёна і, узмацніўшы яго стральцамі 5-га рэгімента, ізноў скіраваў у гушчу бітвы. Як пазначаў польскі даследчык Б. Шындлер, салдаты, жадаючы рэабілітавацца і давесці, што яны не баязліўцы, з імпэтам рушылі ў наступ і выкінулі непрыяцеля са Слоніма. Затым кінуліся за ім у пагоню, здабылі і спалілі на Замосці млын і тартак. Пасля артылерыйскай падрыхтоўкі імкліва фарсіравалі Шчару і выбілі расіян з акопаў. Тыя, адступаючы, кінулі пашкоджаную гармату [66].

Конныя ахвотнікі, узмоцненыя эскадронам кароннай гвардыі, пад вечар атакавалі два эскадроны Кіеўскага коннаегерскага палка, што месціліся каля вёскі Петралевічы. Кавалерыйская атака паўстанцаў зламіла лінію расійскай конніцы, і тая пачала неарганізавана адступаць у бок узвышша, дзе стаяў мушкецёрскі батальён, узмоцнены дзвюма гарматамі. Мушкецёры, баючыся трапіць пад капыты ўласнай кавалерыі, што галопам неслася на іх пазіцыі, зрабілі залп з гармат і стрэльбаў. Страляніна заспела знянацку не толькі расійскіх вершнікаў, але і аддзелы Рэчы Паспалітай, якія не чакалі сустрэць за ўзвышшам непрыяцеля. Яны прыпынілі атаку і, "уцякаючы, паказалі тыл", страціўшы пры адступленні двух афіцэраў і

трох жаўнераў. З надыходам змроку расійцы адышлі да бліжэйшага лесу, а паўстанцкая артылерыя прыпыніла агонь.

У баі пад Слонімам дывізія Караля Серакоўскага згубіла 2 афіцэраў і 15 жаўнераў, больш за 30 чалавек былі параненыя. Сапраўдныя страты расійцаў невядомыя. Паўстанцкая "Газета Жандова" пісала пра 300 забітых ворагаў, але гэтыя дадзеныя з пэўнасцю можна лічыць неверагоднымі [67].

У ноч на 3 жніўня пад Слонім прыбыў Іван Загражскі. У чаканні падыходу і асноўных сіл, якія павінен быў прывесці Вільгельм Дэрфельдэн, расійцы раніцай збудавалі пераносны мост.

Паўстанцы таксама не прадпрымалі актыўных баявых дзеянняў, тым больш што іх сілы былі падзеленыя: паводле атрыманага загада Антоній Хлявінскі перадаў большую частку сваёй дывізіі пад начала Караля Серакоўскага, а з меншай рушыў пад Вільню, дзе ягоныя вайсковыя здольнасці і таленты былі надта запатрабаваныя. У такой сітуацыі К. Серакоўскі палічыў за лепшае перайсці да абароны, апанаваўшы броды цераз Шчару непадалёк ад Дзярэчына. Генерал перш за ўсё абапіраўся на свае ліцьвінскія аддзелы – два эскадроны 4-га літоўскага палка пярэдняй варты і полк уланаў, выстаўлены К. Кёнігам. Рапарт, накіраваны Каралем Серакоўскім да Тадэвуша Касцюшкі 6 жніўня 1794 года, на думку польскіх даследчыкаў, дазваляе рэканструяваць планы генерала, які імкнуўся пазбегнуць сутычак, а тым больш непасрэднага бою з мэтаю як мага далей адцягнуць расійцаў ад Вільні, каб потым, у самы рашучы момант, выслізнуць з-пад самага носа непрыяцеля, заманьваючы Дэрфельдэна за сабою яшчэ далей.

Корпус Серакоўскага быў адным з найбольш баяздольных вайсковых фарміраванняў, што дзейнічалі на тэрыторыі цяперашняй Заходняй Беларусі. Аднак "латаць" з ягонай дапамогай усе шматлікія "дзіркі", што ўзнікалі ў абароне паўстанцаў, было справай бесперспектыўнай. Да таго ж, вышэйшае кіраўніцтва паўстання ў асобе генерала Т. Касцюшкі ў гэты самы перыяд заўважыла яшчэ адну пагрозу, што ўзнікла на Палессі. Яна зыходзіла ад брыгадзіра Мікалая Дзівава, які пачынаў праяўляць актыўнасць, і хоць у параўнанні з іншымі расійскімі военачальнікамі сілы меў даволі нязначныя, аднак і іх было дастаткова, каб нанесці непапраўную шкоду серакоўцам, адрэзаўшы іх ад асноўных камунікацыяў.

Разумеючы гэтую пагрозу, 5 жніўня Тадэвуш Касцюшка загадаў К. Серакоўскаму выдзеліць у каманду здольнаму і асцярожнаму афіцэру *"батальён пяхоты лінейнага войска з 4 гарматамі і 400 вершнікамі... для абароны Берасця ад непрыяцеля або выгнання яго адтуль"* [68].

Нягледзячы на тое што паўстанцы ведалі, з якога боку чакаць непрыяцельскага ўдару, яны ўсё ж праявілі нядбаласць і ўначы з 6 на 7 жніўня былі атакаваныя каля Дзярэчына.

Серакоўцы пачалі спешны адыход, разумеючы, што цяпер ім прыйдзецца мець справу не з расійскім авангардам, а з галоўнымі сіламі, якія прывёў Вільгельм Дэрфельдэн [69].

## 7 – 28 жніўня
## НА ЛЕВЫМ БЕРАЗЕ БУГА

Вялікую ролю падчас адыходу корпуса Серакоўскага адыграў аддзел пад камандаю генерала-інспектара Паўла Грабоўскага. Гэты аддзел быў цалкам ліцьвінскі і складаўся з коннай гвардыі, 4-га палка літоўскай пярэдняй варты, паўсотні кобрынскіх стральцоў і 5-га рэгімента літоўскай пяхоты. Увесь час, пакуль корпус адыходзіў з-пад удару, Павел Грабоўскі прыкрываў адыход, па-майстэрску стрымліваючы любыя спробы расійцаў кінуцца ў пагоню. Асабліва значную ролю пры гэтым адыгрывала артылерыя. Толькі калі стала зразумела, што корпус паспяхова выйшаў з небяспекі, П. Грабоўскі ўмела адвеў сваіх жаўнераў.

Толькі праз 20 кіламетраў маршу ў паўночна-заходнім кірунку Караль Серакоўскі дазволіў жаўнерам спыніцца на трохгадзінны адпачынак, папярэдне прыняўшы самыя строгія меры перасцярогі, каб не выдаць праціўніку свайго месцазнаходжання.

Вечарам таго ж дня, 7 жніўня 1794 года, паўстанцы ўвайшлі ў Ружаны – мястэчка з велічным сапегаўскім замкам, але не затрымаліся тут: 8 жніўня яны былі ў Сяльцы, а ў ноч на 10 жніўня прыбылі ў Бярозу-Картузскую, дзе спыніліся на больш працяглы тэрмін. Магчыма, тут Караль Серакоўскі атрымаў ад Найвышэйшага Начальніка ліст, прасякнуты непадробным захапленнем дзеяннямі генерала пад Слонімам. У прыватнасці, Тадэвуш Касцюшка пісаў: *“З вялікім задавальненнем... даведаўся пра павучальнае заканчэнне бою войска пад тваёй камандай з лютым непрыяцелем нашай Айчыны. Гэтая ўдача павінная заахвоціць вас да новых дасягненяў і перамог: маеце для гэтага адкрытае поле, непрыяцель перастаў адыходзіць і трэба яго зносіць... Аднак стасуй свае абароты з абставінамі, не выпускай з вока Берасце і перашкаджай непрыяцелю прабіцца...”* [70].

Няпросты адыход Караля Серакоўскага з-пад Слоніма быў здзейснены ў адпаведнасці з апошнім распараджэннем. Паводле атрыманых звестак, расійскі брыгадзір Дзіваў пачаў праяўляць надзвычайную актыўнасць: з раёна Пінска і Янава-Палескага вырушыў на

поўнач, хутка заняў Бездзеж, маючы, відавочна, намер апанаваць важны стратэгічны шлях каля Бярозы. Свой непакой К. Серакоўскі выказаў у лісце да Тадэвуша Касцюшкі: *“Дзіваў, сабраўшы ўсе свае сілы, ідзе на мяне, таксама і палкоўнік Анрэп з Валыні паварочваецца”* [71]. Найвышэйшы Начальнік пагадзіўся, каб на барацьбу з Дзівавым была выпраўленая частка корпуса, але не больш за тысячу шабляў. Аднак сам Караль Серакоўскі бачыў у наступе гэтага расійскага аддзела значна большую пагрозу, таму накіраваў супраць яго генерала Паўла Грабоўскага з 2860 жаўнерамі і 10 гарматамі [72].

Тым часам асноўныя сілы корпуса заставаліся ў раёне Бярозы-Картузскай. Серакоўскі, здольны і вопытны інжынер, заўсёды ўмеў выбіраць найбольш спрыяльныя пазіцыі. І цяпер хутка знайшоў найлепшае для абароны месца, надзейна прыкрытае з паўночнага ўсходу Ясельдай. Паўстанцам спрыяла і тое, што праз мястэчка Бярозу праходзіў гасцінец са Слоніма на Косава – фактычна адзіная добрая дарога, заціснутая паміж амаль непраходнымі балотамі, якія цягнуліся на многія кіламетры ўздоўж левага берага Ясельды [73]. Відавочныя пазіцыйныя перавагі дазвалялі К. Серакоўскаму спакойна чакаць тут падыходу непрыяцеля.

Аднак у гэты час Тадэвуш Касцюшка, вельмі ўстурбаваны станам спраў у Берасці, накіроўвае на падтрымку горада атрад палкоўніка В. Квасьнеўскага і асобны батальён 18-га кароннага рэгімента. Апроч таго, ён даручае любельскаму земскаму генерал-маёру Пятру Патоцкаму даслаць пад Берасце частку сваіх аддзелаў. Гэтыя сілы з дня на дзень павінныя былі ўзмацніцца паспалітым рушаннем, якое збіралася на землях Падляшша і Палесся – у любельскіх, берасцейскіх і бельскіх ваколіцах [74].

Выдаючы ардананс Каралю Серакоўскаму, Найвышэйшы Начальнік вагаўся, які кірунак дзейнасці вызначыць генералу ў якасці прыярытэтнага: ці сумесна з Антоніем Хлявінскім рухацца пад Вільню, ці па-ранейшаму пільнаваць Дэрфельдэна, адцягваючы на сябе ягоныя сілы і чакаючы моманту для рашучага ўдару. Нарэшце, 9 жніўня Тадэвуш Касцюшка, відаць, вызначыўся з рашэннем, бо літаральна прасіў К. Серакоўскага, злучыўшыся з ліцвінскімі фарміраваннямі, настойліва пераследаваць Вільгельма Дэрфельдэна і, скарыстаўшы зручны момант, разбіць моцнага непрыяцеля [75].

Аднак, разумеючы слабасць сваіх войскаў, паўстанцкі генерал не спяшаўся ізноў атакаваць расійцаў, паколькі галоўнай сваёй задачай лічыў адцягванне значных узброеных сіл праціўніка ад сталіцы Вялікага Княства Літоўскага [76]. Тлумачыў сваю пазіцыю ён такім чынам: *“Адступленне маё з-пад Слоніма, як можа падацца на першы погляд, адкрывае шлях з Вільні на Гародню... Але ж для такога адыходу абодвух корпусаў –*

*літоўскага і кароннага – ёсць тлумачэнне: першы з іх слабы ў інфантэрыі, другі – у кавалерыі, а пяхота па большай частцы складаецца з рэкрутаў. Да гэтага часу я столькі разоў у аперацыях меў шчасце, учыніў Вільні і Берасцю дзейсную дыверсію, адбіваючыся найперш ад Дэрфельдэна, а затым і ад Дзівава. Хачу і надалей кіравацца той мэтай, што дазволіць Вільню, Берасце і Гародню – гэтыя тры прынцыповыя пункты нашай абароны – захаваць абароненымі"* [77].

Тадэвуш Касцюшка вымушаны быў пагадзіцца з аргументамі К. Серакоўскага. Адказваючы 12 жніўня на ліст апошняга, дасланы з-пад Бярозы, Найвышэйшы Начальнік пісаў: *"Намер утрымаць у бяздзейнасці корпус Дэрфельда* (скажоннае ці скарочанае прозвішча Дэрфельдэна – А.Б.) *ухваляю, аднак пры гэтым трэба пільна сачыць, каб Дэрфельд не напусціў дыму, паказваючы табе, генерале, быццам бы ўсе свае каманды, а насамрэч значнымі часцямі не дасягнуў бы Вільні. Корпус свой старайся як мага хутчэй узмацніць коннымі і пешымі кантаністамі, як ужо сабранымі часткова ў Берасцейскім ваяводстве, так і іншымі"* [78].

Цікава таксама прасачыць стаўленне да дзеянняў серакоўцаў на Берасцейшчыне з боку віленскага кіраўніцтва паўстаннем, якое доўгі час у польскай гістарыяграфіі абвінавачвалася ў так званым "літоўскім сепаратызме" [79].

Ліцвіны значна больш крытычна ставілася да паходу Караля Серакоўскага, абвінавачваючы генерала ў тым, што ён фактычна пакінуў Вільню безабароннай. Гарадзенскі напрамак, па-сутнасці, заставаўся адкрыты перад небяспекаю нападу ворага з поўдня. А між тым пасля 12 жніўня, калі паўстанцы страцілі Вільню, шлях на Гародню набыў выключнае значэнне. Некалькі дзён пазней Юзаф Коцел, які знаходзіўся тады ў горадзе, пісаў: *"Гародня ў такім небяспечным стане, што ў любы момант могуць перарвацца камунікацыі паміж калонамі і адбыцца аддзяленне Літвы ад Кароны"*. Таму гарадзенцы даслалі на імя Станіслава Макраноўскага арданакс з просьбай пра дапамогу, аднак генерал у той час накіроўваўся ў супрацьлеглы бок.

Праблемы, звязанныя з серакоўцамі, лічыліся на той час у Варшаве настолькі істотнымі, што хворы кіраўнік ліцьвінскіх войскаў генерал Міхал Вяльгорскі адкамандзіраваў Станіслава Макраноўскага (які неўзабаве стане ягоным пераемнікам на пасадзе галоўнакамандуючага) не пад Вільню ці Гародню, якія рыхтаваліся да наступу расійскіх армій, а непасрэдна пад Бярозу-Картузскую *"для прыняцця кіраўніцтва над калонаю Хлявінскага і Серакоўскага"*. С. Макраноўскі прыбыў да лагера Караля Серакоўскага, праўдападобна, 15 жніўня [80].

У той самы дзень у лагер вярнуўся генерал Павел Грабоўскі, які здзейсніў адважны рэйд у кірунку Хомска і Бездзежа. Вынікам гэтай хуткай акцыі стала фактычная ліквідацыя пагрозы з боку атрадаў Дзівава, захоп шматлікіх расійскіх абозаў з фуражом і палонных, якія далі каштоўныя паказанні.

21 жніўня, адчуваючы значны ціск з боку расіян, К. Серакоўскі вырашыў адвесці свае войскі ў Пружаны, адкуль наступным ранкам генерал П. Грабоўскі з 3100 жаўнерамі скіраваўся на дапамогу Гародні. Асноўныя ж сілы серакоўцаў, пакінуўшы праз тыдзень Пружаны, рушылі яшчэ далей на поўдзень.

28 жніўня генерал Станіслаў Макраноўскі з Беластока раіў Серакоўскаму: *“Мне падаецца, што калі ты станеш у Кобрыне, то здолееш абараняцца ад непрыяцеля і пайсці на Берасце”* [81]. Галоўнакамандуючы яшчэ не ведаў, што ў той самы дзень і час, калі ён перадаваў ліст у рукі веставога, серакоўцы ўваходзілі ў Кобрын, а з Украіны на сустрэчу з імі, імкліва пераадольваючы цяжкасці, рухаецца Аляксандр Сувораў са сваімі “цуда-волатамі”.

# ЧАСТКА III

## Вясна 1794 года
## "МАЎЧАННЕ ПОРТЫ"

У адрозненне ад Прусіі і Аўстрыі, якія вялі вайну і супраць рэвалюцыйнай Францыі, і супраць касцюшкаўцаў, Расія не жадала змагацца на два фронты. Таму напярэдадні выбуху ў Рэчы Паспалітай нацыянальна-вызвольнага паўстання расійская дыпламатыя актыўна шукала шляхі да замірэння са спрадвечным сваім ворагам – Турцыяй, якая напрыканцы XVIII стагоддзя апынулася ў невыгодным ваенна-палітычным становішчы.

Паміж 1735 і 1791 гадамі Расійская імперыя тройчы ваявала з Асманскай дзяржавай, пры гэтым страты туркаў, як адзначаюць даследчыкі, былі ў некалькі разоў большыя, чым у рускіх.

На той час ў галіне ваеннага мастацтва і тэхнікі Турцыя ўжо пачынала значна саступаць еўрапейскім краінам. У выніку велізарная 280-тысячная асманская армія перастала прыносіць імперыі перамогі [82]. У гэтых умовах турэцкі ўрад быў зацікаўлены ў спыненні чарады войнаў, якія падрывалі і без таго незайздроснае эканамічнае становішча дзяржавы.

Стасункі ў "трохкутніку" Расія – Рэч Паспалітая – Турцыя былі моцна ўзаемаабумоўленыя. У 1791 годзе скончылася апошняя ў XVIII стагоддзі руска-турэцкая вайна. Гэта дазволіла Расійскай імперыі распачаць вайну 1792 года з Рэччу Паспалітай і ў выніку дамагчыся другога падзелу федэратыўнае дзяржавы. У маі 1793 года Міхаіл Кутузаў, тагачасны пасол Расіі ў Стамбуле, у лісце на імя графа А.А. Безбародкі адзначаў: *"Паводле звестак з Малдавіі і Валахіі, Порта дэманструе поўную абыякавасць у пытанні далучэння часткі Польшчы да Расійскай імперыі"* [83].

Атрымаўшы ад расійскага пасла ў Варшаве Якава Сіверса паведамленне пра другі падзел Рэчы Паспалитай, Кутузаў выказаў спадзяванне, *"што гэтая прыемная для нас навіна супакоіць Порту, стрымае рэалізацыю многіх збыткоўных задумаў і прымусіць яе да маўчання"* [84]. Утрыманне спакою на турэцкай мяжы ("маўчанне Порты") было абавязковай умовай для вядзення Расіяй паспяховай вайны на захадзе. Ваяваць на два фронты было немагчыма.

Разам з тым, Міхаіл Кутузаў адзначаў, што ў Стамбуле “*пачыналі ў газетах фабрыкаваць тысячы бязглуздых чутак супраць нашых інтарэсаў і сумнявацца ў поспеху нашых спраў у Польшчы... Прызнаюся, аднак, што, крыху ведаючы край, я не чакаў такога хуткага рашэння... Далучэнне да Расійскай імперыі каля 4 мільёнаў жыхароў, што жывуць пад цудоўным небам, але на зямлі ўбогай, створыць, несумненна, эпоху ў гісторыі*” [85].

Вясною 1794 года Кутузаў дакладваў Івану Салтыкову і Пятру Румянцаву: “*Падзеі польскія маюць моцны уплыў на ўчынкі Порты Атаманскай*”, – а таксама: “*Ад спраў у Польшчы, здаецца, і залежаць будуць у наступным паводзіны Порты. Удзел турэцкага міністэрства ў польскіх справах вельмі заўважны, і ўжо князям малдаўскаму і валоскаму даручана пераводзіць... Касцюшку значную суму грошай*” [86]. Разам з тым, пасол неаднаразова настойліва падкрэсліваў, што новая вайна паміж Расіяй і Турцыяй немагчымая, паколькі турэцкі бок апынуўся ў варунках, якія не спрыяюць вядзенню баявых дзеянняў. Асманская імперыя, ахопленая шматлікімі паўстаннямі і мяцяжамі, не мае дастатковай колькасці войскаў у Бесарабіі і не адрамантавала памежныя фартэцыі, патрэбныя для вайны.

Паведамленні, што прыходзілі са Стамбула (Канстанцінопаля), супакойвалі расійскі бок, таму генерал-фельдмаршал Пётр Румянцаў-Задунайскі, якому ў канцы красавіка 1794 года было даручана “*галоўнае кіраўніцтва над значнаю часткаю войскаў... па межах з Польшчаю і Турцыяй*”, адзначаў: “*Навіны з Канстанцінопаля... упэўніваюць нас... ва ўтрыманні міру і спакою з гэтага боку; і наадварот, па тым, што мы маем з Польшчы і Літвы, – робіцца раней нікчэмны непрыяцель раз-пораз усё больш дзёрзкім і хітрым*” [87].

Румянцаў нават быў вымушаны прызнаць, што “*трэба туркам добра верыць*” [88]. Гэтая фраза ў вуснах расійскага военачальніка XVIII стагоддзя гучыць увогуле фантастычна і сведчыць, наколькі небяспечным было для Расіі нацыянальна-вызвольнае паўстанне ў Рэчы Паспалітай.

### Лета – пачатак восені 1794 года

## ЗАНЕПАКОЕНАСЦЬ ЦАРЫЦЫ

18 жніўня 1794 года, пасля высвятленя сітуацыі на турэцкай мяжы, Кацярына II загадала скіраваць супраць паўстанцаў новы корпус, які павінен быў вырушыць з Валыні. У рэскрыпце на імя Румянцава імператрыца выказвала занепакоенасць актыўнасцю касцюшкаўцаў у Літве і нерашучымі дзеяннямі царскіх войскаў, прапануючы перадыслакаваць новаўтвораны корпус у раён Буга дзеля абароны левага крыла расійскіх войскаў у ВКЛ. Галоўная іх частка

павінная была *“заняць не толькі ўвесь абшар правага берага гэтай ракі ад граніцы Галіцыі да Бржэсца-Літоўскага, але і паставіць цвёрды і моцны пост пры гэтым горадзе так, каб не толькі ўся мяжа Ізяслаўскай губерні да Пінска прыкрытая была, але і ўся зямля да Буга сапраўды апынулася ў руках нашых”* [89].

Расійскае кіраўніцтва было ўпэўненае, што прускія войскі, якія ў гэты час штурмавалі Варшаву, абавязкова возьмуць сталіцу Рэчы Паспалітай, і тады *“мяцежнікі, выціснутыя з названага горада і ўцякаючыя з натоўпу галоўнага бунтаўніка”* (Т. Касцюшкі – А.Б.)”, скіруюцца ў землі, што знаходзіліся пад кантролем расійцаў. Таму неабходна было ўмацаваць мяжу, усталяваную паводле апошняга падзелу.

Аднак падзеі на заходнім фронце разбурылі планы Кацярыны ІІ. 8 верасня 1794 года прускі кароль быццам пад пагрозаю паўстання, што выбухнула ў Вялікапольшчы, зняў аблогу. Даведаўшыся пра гэта, Кацярына назвала Фрыдрыха-Вільгельма *“чалавекам без кішак і сораму”* [90]. Цяпер дзейнічаць на тэрыторыі Беларусі карным расійскім атрадам даводзілася без спадзявання на дапамогу з захаду.

Генералы, высланыя для задушэння паўстання, неаднаразова звярталі ўвагу на асаблівы характар збройнага чыну 1794 года, які прынцыпова адрозніваўся ад ранейшых выступленняў у Рэчы Паспалітай: *“... Гэтая вайна не ёсць тым, чым былі папярэднія канфедэрацыі, калі зямля была паміж сабою падзеленая. Цяпер агульны бунт. Мы ходзім як у мурашніку, дзе колькі іх ні б’юць, яны ўсё і паўсюль карыстаюць. Падзел нейкай часткі зямлі і поўнае вынішчэнне цэлай дзяржавы – дзве рэчы надта розныя. У гэтым апошнім выпадку нікога на сваім баку мець не можам. Адчайныя ж людзі і шалёныя ёсць адно і зараза гэтая прыліпае...”* [91].

Расійцы мелі ўсе падставы баяцца, што *“бунт загарыцца і ў нашых нанова набытых уладаннях”*. Звяртаючыся да аднаго з кацярынінскіх фаварытаў Платона Зубава, генерал Мікалай Рапнін, не хаваючы занепакоенасці сітуацыяй на ахопленых паўстаннем землях, дзяліўся сваімі невясёлымі назіраннямі: *“Мы тут не ў Расіі, адкуль бы такі непрыяцель ад адных мужыкоў ніводнага воласа не вынес, калі б толькі асмеліўся туды сунуцца. А тут ён паўсюль ходзіць, знаходзячы сабе хаўруснікаў, ад якіх ён усё патрэбнае атрымлівае і якія за ім дарогі псуюць, а перад ім рамантуюць”* [92].

Па словах генерала, тое, што адбывалася ў Вялікім Княстве Літоўскім, было сапраўднай вайной, прычым “... *не супраць арміі тут вайна, але супраць агульнанароднага бунту ўсяго шляхецтва і чэрні, усіх*

*яўна ці тайна ўзброеных, якіх, адпаведна, прагнаць перад сабою нельга, а заўсёды яны будуць заставацца ў спіне войска, выдаючы сябе за спакойных абывацеляў, таму заўсёды тыл наш будзе захоплены пры аддаленні нашых войскаў ад сваёй мяжы*" [93].

У тон Рапніну ў тыя самыя дні выказваўся і стары фельдмаршал Пётр Румянцаў-Задунайскі, пастаўлены кіраваць выпраўленымі на задушэнне паўстання войскамі: "*... Няма магчымасці прадбачыць і апярэджваць падзеі, дзе вядомая колькасць войскаў, але цэлая зямля змагаецца і дзе непрыяцель раптам у многіх месцах і ў многіх тысячах бачыцца і чакаецца і там знянацку з'яўляецца, дзе б ён, мяркуючы па-вайсковаму, ніяк і быць не мог...*" [94].

Даклады генералаў, якія непасрэдна знаходзіліся на тэатры баявых дзеянняў, былі суровым папярэджаннем для цэнтральнай расійскай улады, што нярэдка грэбавала "нікчэмным непрыяцелем". Пры гэтым погляд з Пецярбургу на падзеі, што адбываліся на "землях, ад Польшчы адарваных", часцей за ўсё заставаўся неадэкватным. Таму М. Рапнін справядліва скардзіўся на тое, што для сталічных стратэгаў "*усё тут лічыцца лёгкім і загадваецца толькі паўсюль наперад ісці, усіх гнаць і біць, а праз гэта, пасля агалення граніц, падвядзецца і ўласнае валоданне пад надзвычайную небяспеку*". Прадказанні генерала, як сведчыла далейшае развіццё падзей, былі цалкам абгрунтаванымі. Калі паўстанцкі атрад Стэфана Грабоўскага ўвайшоў у межы Мінскай губерні, распачаўшы шырокамаштабны партызанска-дыверсійны рэйд, ён здолеў адцягнуць на сябе "*тысяч да трох нашых войскаў, што і дасюль за імі бегаюць, але дагнаць яшчэ не могуць*" [95]. Таму Рапнін рапартаваў з відавочным раздражненнем: "*... гэтыя адчайныя нахабнікі вялікі разлад тут нарабілі і павялі за сабою ў пагоню да трох тысяч чалавек. Пры гэтым трэба было заткнуць іншымі войскамі тыя дзіркі, дзе яны прарваліся, каб па тым жа следзе ўсялякая мяцежніцкая навалач з лясоў за імі яшчэ не ўвалілася, гэтыя войскі вымушаны ўжо быў узяць у Дэрфельдэна*" [96].

Дарэчы, недаацэнка ваенных здольнасцяў паўстанцаў адзначаецца ў запісках амаль усіх расійскіх военачальнікаў [97]. Гэтая пагарда да праціўніка часам перашкаджала прымаць разумныя стратэгічныя і тактычныя рашэнні, што было адной з асноўных прычын паразаў царскіх войск у Рэчы Паспалітай, асабліва на першым этапе паўстання. А між тым, расійцам супрацьстаялі, галоўным чынам, спрактыкаваныя вайскоўцы.

Таму з канца лета 1794 года стан рэчаў пачаў выклікаць усё больш непакой у расійскіх военачальнікаў, якія цяпер перасталі адчуваць упэўненасць у станоўчым зыходзе справы. Той самы генерал Рапнін, не таячыся, пісаў у Санкт-Пецярбург: "*Адным словам... адкрыта скажу,*

*што... тутэйшыя справы цяпер у кепскім стане, і я не валодаю дастаковымі здольнасцямі, каб бачыць ім паспяховы зыход... Галава мая не можа ахапіць усяго гэтага цяжару. Завецца тут арміяй тое, што не звязана паміж сабою... Я не маю той паспяховай неразважнасці, якая, можа, цяпер патрэбная была б, і шчыра кажу, што, здаецца, патрэбны тут чалавек больш здольны за мяне...*” [98].

Цяпер вайсковы і палітычны расклад яшчэ болей запатрабаваў ад расійскага боку весці рашучыя наступальныя дзеянні. Для гэтых мэтаў патрабаваўся валявы і таленавіты военачальнік, здольны ў кароткі тэрмін пазбавіць край ад “французскай заразы”.

## Лета 1794 года
## СУВОРАЎ ІРВЕЦЦА Ў БОЙ

Для гэтай місіі найбольш падыходзіла кандыдатура генерал-аншэфа Аляксандра Суворава, які знаходзіўся ў Няміраве паблізу Вінніцы. Адтуль ён і кіраваў войскамі, што пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай акупавалі ўкраінскія землі. Суворае карыстаўся прызнанай павагай сярод салдат, быў рашучым і смелым палкаводцам, да таго ж добра ведаў тэатр будучых вайсковых дзеянняў як актыўны ўдзельнік падаўлення Барскай канфедэрацыі (1768-1771 гадоў). Вакол Суворава ўжо стварыўся арэол “непераможнага”, і яго прысутнасць сярод войскаў станавілася своеасаблівым талісманам [99].

Састарэлы кіраўнік “польскай кампаніі” Пётр Румянцаў таксама вельмі высока цаніў вайсковыя здольнасці Суворава. Ён пісаў генералу: *Адное вашае імя і папярэдняе абвяшчэнне пра ваш паход падзейнічае на дух непрыяцеля і тамтэйшых абывацеляў больш за многія тысячы*” [100].

Гэтыя меркаванні як нельга лепш супадалі з імкненнямі самога генерала, які, пачынаючы з вясны 1794 года, неаднойчы скардзіўся розным асобам на тое, што яго ігнаруюць, не дазваляючы праявіць здольнасці, патрэбныя для падаўлення паўстання.

Аляксандр Суворае разумеў, што найбольш значныя ў гістарычным і вайсковым плане падзеі разгортваюцца зусім не на турэцкай мяжы, дзе яму выпала несці службу, стрымліваючы туркаў ад уварвання, але на землях Рэчы Паспалітай, ахопленых паўстаннем.

Польскі ваенны гісторык Станіслаў Хербст падкрэсліваў: “Пераможца Рымніка адчуваў сябе абражаным адведзенай яму роляю, скардзіўся, што для стварэння кардону і аховы складоў ёсць людзі больш маладыя. Але тым не менш ад ускладзенай на яго місіі не адмовіўся. Гэты

амбіцыйны генерал бачыў у ёй адзіны шанец праславіць сябе, да чаго імкнуўся, не зважаючы ні на што. Верагодна, ён лічыў, што з дырэктывамі лічыцца не будзе” [101].

Палкаводзец амаль лямантаваў пра сваю адданасць і шчырае жаданне паслужыць. У лісце, накіраваным 26 чэрвеня з Нямірава на імя Дзмітрыя Хвастова, так і гаварылася: “*Адно маё слова – хачу служыць! Тут без справы, тэатр – у Польшчы... Па службе ж, дзе тэатр, адмаўляюся ад усіх узнагарод, сябе забуду і напружу іх* (намаганні. – А.Б.) *для іншых*” [102]. А потым дадаваў: “*Фартуна круціць шчасцем, як кола спіцамі... Ці доўга мне не ўваходзіць у сваю сферу? У бясконцай мары: чаму я не ў Польшчы, там бы ў сорак дзён скончыў. Тут вайны зусім няма, крэпасці – інжынерам*” [103].

Сувораў лічыў, што прычыны занядбання хаваюцца ў інтрыгах, якія снуюцца вакол ягонага імя. Ведаючы сабе цану, генерал-аншэф быў невысокай думкі пра іншых расійскіх военачальнікаў: “*Большая частка* (іх. – А.Б.) *карыстаецца старшынствам, набытым паўлінавымі пёрамі ці лісліваcцю без вартасцяў*” [104].

У сваіх эксцэнтрычных разважаннях будучы генералісімус прыходзіў да нечаканых высноваў: “*Жыццё мне ў цяжар, я перайшоў Рубікон і сабе не здраджу. Калі я вось ужо некалькі гадоў цацка ў руках якога-небудзь графа Мікалая Салтыкова,... дык мне ўсё роўна, дзе памерці: на экватары ці на полюсе*” [105]. Акрамя экватара і полюса, ён гатовы быў ехаць “*хаця ў Японь*” [106], прызнаючыся Дзмітрыю Хвастову: “*Ад тыранства лёсу вырашыў я цвёрда зрабіць рашучы крок*” [107].

Сутнасць гэтых слоў становіцца зразумелаю, калі прачытаць іншыя лісты, складзеныя Суворавым у той самы дзень на імя Кацярыны ІІ і фельдмаршала Пятра Румянцава. Царыцы ён пісаў: “*Прашу літасціва звольніць мяне валанцёрам да саюзных вайскаў, паколькі я шмат гадоў без воінскай практыкі па маім званні*” [108]. А графу П.А. Румянцаву-Задунайскаму: “*Толькі Вы, Вялікі Муж! Цяпер мне жыццё вярнуць можаце*” [109].

Нарэшце, у жніўні 1794 года мары Суворава здзейсніліся. Гэта адбылося ў той час, калі баявыя дзеянні ў Рэчы Паспалітай пачалі набываць зацяжны характар і ім трэба было надаць новы імпульс.

## 25 жніўня – 8 верасня
# МАРШ З НЯМІРАВА НА КОВЕЛЬ

Войскам, якія павінныя былі прыйсці з Валыні, царыца загадала закласці магазіны прыпасаў і фуражу для забеспячэння корпусаў пад кіраўніцтвам генералаў Вільгельма Дэрфельдэна і Івана (Ганса) Ферзена. Паводле меркавання С. Хербста, гэты загад сведчыў пра нявер'е ў магчымасць сканчэння ваенных дзеянняў да надыходу зімы і пра падрыхтоўку да вясенняй кампаніі [110].

Яшчэ не атрымаўшы загада імператрыцы, 18 жніўня галоўнакамандуючы накіраваў ліст Аляксандру Сувораву ў Няміраў. Відаць, планы перадыслакацыі корпуса з Валыні бліжэй да асноўнага тэатра ваенных дзеянняў ужо папярэдне разглядаліся расійскім кіраўніцтвам.

Пётр Румянцаў ускладаў на Суворава вялікія надзеі: "*Усе кучы яго* (непрыяцеля. – А.Б.) *і перадусім тыя, ад якіх... увесь бунт залежыць як у паходзе, так і ў ваколіцах Бржэсца, кожны раз на галаву пабітыя і разагнаныя будуць...*" [111].

Назваўшы генерала Суворава "*жахам палякаў і турак*" [112], галоўнакамандуючы перадаваў пад ягонае кіраўніцтва два корпусы, "*якія складаюцца кожны з аднаго генерал-маёра, трох батальёнаў пяхоты, пяці эскадронаў кавалерыі і 250-ці казакоў з чатырма гарматамі палявой артылерыі*" [113].

Аляксандр Сувораў атрымаў загад злучыцца блізу Ковеля з аддзеламі, сфарміраванымі на Брацлаўшчыне пад началам генералаў Фёдара Буксгеўдэна і Аркадзя Маркава. Аснову гэтых корпусаў складалі 8 батальёнаў, 31 эскадрон, войска было ўзмоцненае 10 гарматамі.

Будучы генералісімус, не хаваючы свайго нецярпення, ірваўся ў бой "*у заўсёднай мары, што я не ў Польшчы, там бы ў сорак дзён скончыў*" [114]. Выкарыстаць Суворава для падаўлення паўстання Кацярына II мела намер яшчэ вясною 1794 года, калі пісала яму: "*Граф Аляксандр Васільевіч! Вядомы вам, напэўна, бунтаўнік Касцюшка, падбухторыўшы Польшчу, у сваіх кантактах з пачварамі, што кіруюць Францыяй, жадае паўсюль сеяць бунт на злосць Расіі*" [115].

Аднак выправіць Аляксандра Суворава на тэатр баявых дзеянняў стала магчыма толькі ў канцы лета. Дз.М. Бантыш-Каменскі прыводзіць

словы, якія быццам пры гэтым прамовіла імператрыца: *“Я высылаю ў Польшчу дзве арміі – адну армію, а другую Суворава”* [116].

Пад кіраўніцтвам генерал-аншэфа на той час былі ўсяго два палкі – Херсонскі грэнадзерскі і Чарнігаўскі карабінерскі, узмоцненыя двума батальёнамі беларускіх егераў ды 250 казакамі (агульным лікам каля 4000 – 4500 салдат). З гэтымі сіламі раніцай 25 жніўня А. Сувораў выйшаў з Нямірава [117].

Рух сувораўцаў быў хутка заўважаны паўстанцамі. Ужо наступным днём кобрынскі павятовы генерал-маёр Казімір Рушчыц рапартаваў Каралю Серакоўскаму: *“Толькі што атрымаў паведамленне ад пасланага да Дзівіна* (разведчыка. – А.Б.), *што 3000 Масквы павярнула з Любяшова на Ковель і, пэўна, ужо сёння ў Ратна, адкуль пойдуць на Берасце і Кобрын”* [118]. Гэтую інфармацыю пацвярджалі і іншыя крыніцы [119]. К. Рушчыц даслаў пад Ратна палкоўніка Яна Ляпарскага з аддзелам у 24 чалавек, *“якія сочаць за кожным абаротам непрыяцеля і мне пра гэта штодня даносяць”*. Павятовы генерал настойліва прасіў К. Серакоўскага дапамагчы: *“Спадзяюся, што зробіш ласку прыслаць мне кавалерыю, якую я прасіў, і хаця адзін батальён з гарматамі”* [120].

Просьба своечасовая, бо рух расійскіх аддзелаў быў імклівы: ужо 26 жніўня Аляксандр Сувораў дасягнуў Прылукаў, дзе цягам двух сутак да яго далучыліся Марыупальскі і Ражскі палкі, а затым узмоцнены корпус накіраваўся праз Беляцкова і Астрог у кірунку Варковічаў [121].

2 верасня Сувораў спыніўся ў Варковічах. Прыпынак быў небходны, паколькі за дзевяць дзён без усялякага адпачынку сувораўцы прайшлі 300 кіламетраў. Тут адбылося злучэнне большасці расійскіх атрадаў, што знаходзіліся на Украіне. Пазней у сваім рапарце палкаводзец зазначаў: *“Усе прыбылі да прызначанага там рандэву..., дзе больш за двое сутак пяклі і сушылі хлеб і, запасшыся ім амаль на месяц, працягнулі марш на Луцк і Ковель па дрэннай ад дажджоў і надта пяшчанай дарозе 146 вёрстаў”* [122].

У Варковічах расійскі палкаводзец атрымаў першыя, вельмі недакладныя звесткі, што тычыліся паўстанцаў. Генералы Караль Серакоўскі і Станіслаў Макраноўскі, на ягоную думку, павінны былі мець кожны па 10000 чалавек [123].

Далейшы шлях паміж Варковічамі і Ковелем даўжынёй у 135 кіламетраў расіяне пераадолелі за чатыры дні – паміж 4 і 8 верасня, паколькі надзвычай цяжкая дарога, непрыстасаваная для руху калонаў, была моцна пашкоджаная няспыннымі восеньскімі дажджамі.

Згодна з ранейшымі распараджэннямі, прайшоўшы праз Муравічы блізу Ковеля, 8 верасня Сувораў злучыўся з лятучым атрадам генерал-маёра Фёдара Буксгеўдэна, а 11 верасня, выправіўшыся ў далейшы шлях, на гасцінцы ля мястэчка Новая Выжва – таксама з атрадамі, якімі кіраваў Аркадзь Маркаў [124].

Адгэтуль корпус Суворава быў цалкам сфармаваны. У ім налічвалася 12000 чалавек: пяхота – амаль 14 батальёнаў (7000 штыкоў) [125], конніца – 41 эскадрон (4000 шабляў), дадамо да гэтай лічбы тры казацкія палкі, якія складаліся з 800 чалавек, ды артылерыстаў (каля 200 чалавек), якія абслугоўвалі 18 гармат [126].

Узмоцненыя расійскія аддзелы дзейнічалі надзвычай зладжана і аператыўна. За два тыдні Аляксандр Сувораў здолеў павялічыць свае сілы ўтрая, што, безумоўна, і стала асновай ягоных далейшых ваенных поспехаў. Імклівыя дзеянні генерала дазвалялі захоўваць у таямніцы ад праціўніка колькасны склад корпуса і напрамак яго руху. Апроч таго, на сваім шляху расійцы амаль не сустракалі супраціўлення: паўстанцкіх сілаў на Украіне не ставала. У дзеяннях Суворава назіралася пэўная імправізацыя. Любы напрамак, абраны ім, мог значна пагоршыць становішча паўстанцаў.

А напрамкаў такіх магло быць некалькі. Аляксандр Сувораў мог пайсці на злучэнне з Іванам Ферзенам. Для гэтага трэба было маршыраваць на Люблін. Аднак такі шлях уяўляўся Сувораву небяспечным, паколькі, не ведаючы сапраўднай колькасці паўстанцаў, ён баяўся пакінуць за сваёй спінай корпус Серакоўскага і Макраноўскага. Прынамсі, 13 верасня расійскі палкаводзец лічыў, што паміж Кобрынам і Берасцем знаходзіцца прыблізна 15000 паўстанцаў (насампраўдзе колькасць серакоўцаў была меншая ў тры разы) [127]. Таму расійскі военачальнік пастанавіў найперш падавіць гэтыя сілы, спадзеючыся на раптоўнасць. Не жадаючы губляць ініцыятыву і пры тым драбіць свае сілы, ён, насуперак загадам вярхоўнага камандавання, не займаў асобнымі камандамі лінію Буга, а накіраваў усе свае сілы ў напрамку Кобрына, плануючы выйсці ў тыл дывізіі К. Серакоўскага, якая, паводле ягоных памылковых дадзеных, знаходзілася пад Пружанамі.

Дый паўстанцы мелі даволі цьмяныя звесткі пра склад і месцазнаходжанне сувораўцаў. Кобрынскі павятовы генерал-маёр Казімір Рушчыц 10 верасня рапартаваў Серакоўскаму, спрабуючы яго супакоіць: *"Тут у нас ізноў спакойна. Масква на адным месцы трымаецца, менавіта ў 7 мілях ад Кобрына за Антопалем"* [128]. Хаця імклівы рух расійцаў павінен быў занепакоіць паўстанцкіх кіраўнікоў, паколькі выразна сведчыў пра намер расійскага военачальніка адрэзаць паўстанцаў ад Берасця.

У той жа час і Серакоўскі, і Сувораў добра разумелі неўнікнёнасць вырашальнага бою. Логіка падзеяў немінуча вяла да сутыкнення. Не для таго военачальнікі вялі свае войскі багністымі шляхамі Палесся, каб разысціся мірам [129].

Ролю, якую меў адыграць зыход гэтай бітвы для далейшага лёсу ўсяго паўстання, выдатна разумелі абодва бакі. Паражэнне Караля Серакоўскага было б для паўстанцаў катастрофай, бо фактычна азначала канчатковую страту Вялікага Княства Літоўскага. Пасля гэтага злучэнне расійскіх войскаў рабілася непазбежным, што, у сваю чаргу, пагражала смяротнай небяспекай Варшаве [130]. Перамога ж пасля доўгай чарады паражэнняў ўзняла б маральны дух усёй паўстанцкай арміі і ўзмацніла б супраціў варожай навале.

**14 верасня**

## СУТЫЧКІ ПАД ДЗІВІНАМ

Дарогі ад Ковеля да Кобрына былі вузкія і надзвычай дрэнныя. Сувораўцы рухаліся паміж двума вялікімі комплексамі балатоў. Значна ўскладнялі справу дажджы, якія не сціхалі ўвесь пачатак верасня. Яны размылі дарогі і яшчэ больш узнялі ўзровень вады ў паўнаводных рэках.

На маршы расійцы непазбежна павінныя былі расцягнуцца. Пры ўсёй зладжаннасці іх дзеянняў пазбегнуць гэтага было немагчыма. А гэта было небяспечна: сувораўскі корпус ужо ўвайшоў у абсяг баявых дзеянняў паўстанцкай дывізіі.

Пачынаючы з Ковеля, тры казацкія палкі пад началам Івана Ісаева пастаянна рухаліся за 15 кіламетраў наперадзе ад асноўных сіл, шукаючы найбольш спрыяльныя праходы і гаці. Апоўдні 14 верасня расійская пярэдняя варта, якая налічвала каля 50 казакоў, сутыкнуліся пад Дзівінам з паўстанцкім дазорам, удвая большым за расійскі атрад. Гэтая сотня вершнікаў Кобрынскай кавалерыі выцесніла казакоў з мястэчка. На дапамогу сваім паспяшыў Ісаеў, які арганізаваў пераслед паўстанцаў.

Праз два дні Сувораў гэтак ацэньваў дзівінскія падзеі. Казацкі атрад быццам меў перад сабою партыю паўстанцаў у колькасці больш за 200 чалавек. Пасля непрацяглай сутычкі паўстанцаў *“хіба што да трыццаці выратавалася, астатнія пабітыя і 17 у палон узята з афіцэрам”* [131].

Аднак, як звычайна, мы маем тут два супрацьлеглыя погляды на падзею, бо ў той самы дзень Казімір Рушчыц у рапарце на імя генерала

Серакоўскага сцвярджаў: *“Пасля таго як маскалі пакінулі Дзівін, камандзір высланага патруля ротмістр Струцінскі выслаў каманду з 60 чалавек на разведку за непрыяцелем, які пачаў уцякаць. Як толькі яны выйшлі за Дзівін, адразу былі адусюль акружаныя непрыяцельскай сілай да 200 казакоў з кавалерыяй, схаванымі ў лесе, і... пяхотай пад лесам”*. Гэта прымусіла паўстанцкія каманды адступіць да Кобрына. Услед за імі рушылі расійцы, якія, аднак, праз мілю прыпынілі пераслед [132]. Даведаўшыся пра падзеі ля Дзівіна, Караль Серакоўскі загадаў Рушчыцу адысці і злучыцца з асноўнымі сіламі. Але той выканаў гэты загад толькі ранкам наступнага дня.

Аляксандр Сувораў адстаяў службу ў Дзівінскай царкве, якая і дагэтуль у мясцовых жыхароў завецца “Сувораўскай”. Потым расіяне адышлі некалькі вёрстаў ад вёскі і зрабілі прывал. Калі надышла ноч, Сувораў асабіста накіраваўся да авангарду свайго войска, што знаходзіўся ў лесе за мястэчкам. Паводле легенды, палкаводзец вырашыў адпачыць пад дубам [133]. Да Кобрына заставалася менш за 30 кіламетраў.

**15 верасня**

## ЗАХОП КОБРЫНА

Пад горадам знаходзіліся міліцэйскія сілы берасцейскай пяхоты і кобрынскай кавалерыі. На 28 жніўня іх агульная колькасць складала 820 чалавек, аднак з гэтага ліку трэба выключыць каля 300 чалавек, што былі задзейнічаныя ў патрулях, служылі пры камісарыяце і інш. Такім чынам, у паўстанцкім лагеры, размешчаным пад Кобрынам, налічвалася не болей за 500 ваяроў, з іх толькі 31 вершнік [134]. Зразумела, гэтых сілаў было занадта мала для спынення расійскіх атрадаў, што насоўваліся з поўдня.

Ад захопленых пад Дзівінам палонных Сувораў ужо ведаў, што ў Кобрыне знаходзіцца паўтысячны паўстанцкі аддзел, і без ваганняў вырашыў ударыць па горадзе. З месца свайго прывалу (прыблізна за 3 кіламетры на поўнач ад Дзівіна) ён выправіў прыкладна 1700 вершнікаў – казацкі аддзел і Пераяслаўскі коннаегерскі полк, каб раптоўным ударам разбіць праціўніка і заняць Кобрын. Гэты авангард, узначалены брыгадзірам Ісаевым, выступіў 14 верасня перад поўначчу. За ім рухаліся 10 эскадронаў рэгулярнай кавалерыі, а следам неўзабаве выступілі і астатнія сілы.

Напачатку расійцы накіраваліся ў вёску Патрыкі, дзе ад гаспадара прыдарожнай карчмы даведаліся пра паўстанцкія сілы [135].

Каля 5 гадзін раніцы 15 верасня часткі сувораўскага корпуса ўдарылі па лагеры Казіміра Рушчыца. Пасля кароткачасовага супраціву заспетыя знянацку паўстанцы былі разбітыя. А. Петрушэўскі паведамляў, што *“кобрынскі атрад быў захоплены знянацку: людзі спалі і спрасонку замітусіліся, не паспявалі адвязваць коней ад канавязяў, абсякалі павады ці ўцякалі пехатою, так што казакам засталося да 300 коней”* [136]. З 500 жаўнераў, якія абараranялі Кобрын, да сваіх прабіліся ледзь 70 чалавек (разам з Казімірам Рушчыцам, хоць Сувораў і паспяшаўся паведаміць пра гібель паўстанцкага генерала). Неўзабаве ўцекачы прынеслі Серакоўскаму трывожную вестку пра блізкасць непрыяцельскага войска.

У расійцаў страты склалі каля 50 чалавек, у тым ліку быў забіты пяцідзесятнік і паранены казацкі палкоўнік Барыс Грэкаў. А 9-ай гадзіне ў Кобрын прыйшла апошняя частка рускага корпуса. Сувораў хацеў быў адразу рушыць далей, каб раптоўным ударам разбіць ворага. Аднак ягоная армія, стомленая цяжкім пераходам з-пад Ратна (60 кіламетраў былі пройдзеныя ўсяго за дзень 14-га і ноч з 14 на 15 верасня, адпачынак у Дзівіне доўжыўся толькі некалькі гадзінаў) і сутычкамі пад Дзівінам і Кобрынам, не магла рухацца далей. Таму было вырашана спыніцца ваенным лагерам ля горада.

Аляксандр Сувораў па-ранейшаму значна перабольшваў паўстанцкія сілы (лічыў, што яны складаюць да 16,5 тысяч чалавек), а таму чакаў непазбежнага нападу праціўніка. Было лагічна дапусціць, што Караль Серакоўскі, маючы перавагу ў людской сіле і артылерыі, будзе паводзіць сябе больш актыўна. Таму Сувораў паклапаціўся пра ўмацаванне подступаў да Кобрына. І адно ўпэўніўшыся, што атакі паўстанцаў не будзе, аддаў войску загад выйсці з горада і рушыць у бок Берасця.

Цяпер расійскі палкаводзец дзейнічаў надзвычай асцярожна. Ягонае войска ішло павольна, кожную хвіліну гатовае заняць кругавую абарону пры набліжэнні праціўніка. І толькі пазней, атрымаўшы больш дакладныя звесткі пра колькасць паўстанцаў, Сувораў змяніў тактыку, перайшоўшы ад абароны да наступу [137].

## 15 – 16 верасня
# МАРШ ПАД КРУПЧЫЦЫ

У той самы дзень і час, як сувораўцы захапілі Кобрын, серакоўцы былі на маршы.

Напярэдадні, 14 верасня, камандуючы Станіслаў Макраноўскі, які знаходзіўся пры паўстанцкім корпусе, выконваючы распараджэнне Т.

Касцюшкі, скіраваўся ў Гародню, загадаўшы Каралю Серакоўскаму неадкладна выступіць супраць расійцаў. Найвышэйшы Начальнік выдатна разумеў значэнне гэтага аддзела, пра што сведчыла ягонае жаданне асабіста ўзначаліць "берасцейскі корпус". Тадэвуш Касцюшка нават выехаў у кірунку Берасця і даслаў у дапамогу Серакоўскаму з лагера пад Чыстым свайго ад'ютанта генерала Караля Князевіча з атрадам у 1074 чалавек [138].

У панядзелак 15 верасня яшчэ да світання, а 4-ай гадзіне раніцы, у лагеры пад Тэрэспалем быў дадзены сігнал да маршу, і праз гадзіну корпус выступіў у паход. К. Серакоўскі не адважыўся забраць з Тэрэспаля ўсе войскі, усведамляючы, што тым самым пакіне безабаронным Берасце. На Кобрын рушылі 13 эскадронаў і 5 батальёнаў, узмоцненых 26 гарматамі, – усяго каля 4000 чалавек. На маршы на нейкай адлегласці ад асноўнай часткі дывізіі першым рухаўся авангард, узначалены Вайцяхоўскім. Перадавую частку складалі конныя палкі уланаў, Казаноўскага і народнай кавалерыі, за імі ўслед ішлі стральцы. Наступнымі рухаліся вайсковыя фарміраванні, што непасрэдна складалі корпус: каронная конная гвардыя, батальён 15 рэгімента, правая батарэя, 18 рэгімент, батальён Рафаловіча і Кулешы, затым – дзве часткі 5 рэгімента фузілераў, а паміж імі – левая батарэя. Апошнімі ў корпусе рухаліся літоўскія татары, якія складалі 4-ты полк пярэдняй варты войска ВКЛ. У ар'ергардзе дывізіі знаходзіўся 3-ці полк пярэдняй варты Антонія Хлявінскага [139].

Паўстанцы ішлі кобрынскім трактам на Трышын, Вычулкі, Ямна, Шэбрын да Булькова, перад якім прыпыніліся на начлег.

На наступны дзень, 16 верасня, а 6-ай гадзіне раніцы серакоўцы рушылі далей. Мінуўшы Каралін і Рагозна, верагодна, а 10-ай гадзіне раніцы яны дасягнулі Крупчыцаў, дзе Караль Серакоўскі заняў выгодную абарончую пазіцыю [140].

Рака Трасцяніца ў некалькіх кіламетрах ад упадзення ў Мухавец утварала своеасаблівы прыродны бастыён, што цягнуўся на тры кіламетры ў шырыню і прыкладна на кіламетр у глыбіню. Уздоўж фронту бастыёна месціўся забалочаны луг у выглядзе трохкутніка, асновай якога з'яўлялася рака, а бакамі – лініі лясістых халмоў, што прыкрывалі флангі. Па аснаванні бастыёна гаццю цягнулася дарога, уздоўж якой месціліся вёска Крупчыцы, кармеліцкія касцёл і кляштар [141].

Усё гэта было ў левай часцы, дзе дарога крыжавалася з Кобрынскім трактам. З Крупчыцаў шлях ішоў далей на паўночны ўсход і ў кіламетры ніжэй за левую луку Трасцяніцы перасякаў раку гаццю і мостам. Другі

мост знаходзіўся на правым флангу пры манастырскім фальварку Нелаевічы [142].

Пазіцыя была абраная вельмі ўдала, самая прырода, здавалася, паклапацілася пра яе непрыступнасць. Трасцяніца – рака ў звычайных умовах вузкая – з-за восеньскіх дажджоў ператварылася ў цяжкую для пераходу, а зважаючы на дадатковае ўмацаванне рэдутамі – дык і ў зусім непраходную дрыгву. Таму адбіваць лабавыя атакі паўстанцы маглі паспяхова. Затое непрыяцельскі наступ на флангі, асабліва на левы, быў вельмі небяспечны [143].

Пасля дасканалага вывучэння мясцовасці Караль Серакоўскі расставіў войскі. Аддзелы размяшчаліся ўздоўж невысокіх пагоркаў, што цягнуліся да вёскі Чыжэўшчына. Тракт, па якім набліжаўся А. Сувораў, быў абсаджаны войскамі: справа – батальён 18-га рэгімента, злева – батальён 5-га рэгімента. Флангі прыкрывалі два эскадроны 4-га палка літоўскай варты. Наперадзе былі выстаўленыя дзве батарэі, кожная з іх складалася з шасці гармат. З другога боку Трасцяніцы, пры карчме, якая стаяла на тракце, для абароны моста былі ўсталяваныя яшчэ дзве гарматы, прыкрытыя батальёнам 5-га рэгімента. Гэта быў той самы небяспечны левы фланг, якім камандаваў генерал Красінскі. Тут знаходзіўся і сам генерал-маёр Караль Серакоўскі.

Далей размяшчалася правае крыло паўстанцаў: батальён кароннай пешай гвардыі і 15-га рэгімент з 6 гарматамі. Фланг прыкрывала конная гвардыя генерала Дзянізія Панятоўскага. Гэты фланг, размешчаны ў баку ад тракта, таксама быў абаронены шырокімі балатамі [144].

Астатнія часткі дывізіі пад кіраўніцтвам Караля Кёніга складалі рэзерв і размяшчаліся за Крупчыцамі. Сюды ўваходзілі Берасцейскі батальён падпалкоўніка Кулешы, аб’яднаны з батальёнам Рафаловіча, а таксама палкі Кёніга, Казаноўскага і два эскадроны 3-га палка літоўскай варты [145].

Патрулі, высланыя авангардам, ачысцілі мясцовасць ад дробных непрыяцельскіх групаў. Рэшта 16 верасня і наступная ноч у цэлым прайшлі спакойна. Справа даходзіла толькі да невялікіх сутычак паміж фарпостамі і патрулямі, пры гэтым паўстанцам *“без забітых дасталіся ў няволю 7 маскоўскіх гусараў”* [146]. Ад палонных, нарэшце, даведаліся пра сапраўдную колькасць праціўніка. К. Серакоўскі выслаў у бок Кобрына конны раз’езд у сто шабляў, які ў паўмілі за Крупчыцамі наткнуўся на галоўныя расійскія сілы і вымушаны быў адступіць [147].

У той самы час, 16 верасня, абапіраючыся на паказанні палонных і разведчыкаў, Сувораў лічыў, што серакоўцы ірвуцца на Кобрын, жадаючы *“адсюль напасць на Пінск і разбіць атрад Дзівава, аднак калі пачулі, што да Кобрына рухаецца корпус, то і засталіся нерухомыя ў намеры не саступіць Бржэсця”* [148].

Таму будучы генералісімус пісаў брыгадзіру Мікалаю Дзіваву: *“Я з корпусам войскаў цяпер знаходжуся пры Кобрыне, адкуль неадкладна выступлю к Бржэсцу, дзе палякаў знаходзіцца больш за 16000 рэгулярных з 24 гарматамі... зрабіце ласку, паспяшайцеся да мяне к Бржэсцу, дзе вашае як найхутчэйшае прыбыццё вельмі патрэбнае”* [149].

Аднак Аляксандр Сувораў не чакаў падыходу палка Дзівава. Згрупаваўшы ўвесь корпус пад Кобрынам, палкаводзец паставіў яго ў абарончым парадку на лініі Патрыкі – Забужкі – Мазічы. Але калі наступу паўстанцаў так і не адбылося, расійцы рушылі наперад. Конніца бродам фарсіравала Мухавец, а пяхота перайшла мост у Кобрыне. Прыблізна а 20-й гадзіне вечара 16 верасня ўвесь сувораўскі корпус ізноў заняў пазіцыю ўздоўж рэчкі Каніны – правага прытока Мухаўца [150].

У гэты час быў захоплены яшчэ адзін палонны, які паказаў, што серакоўцы лічылі сваімі галоўнымі праціўнікамі Буксгеўдэна і Маркава [151], а пра рух з поўдня сувораўскага корпуса чулі, аднак лічылі, што ён знаходзіцца яшчэ ў наваколлі Варковічаў, і толькі пасля падыходу да Крупчыцаў Караль Серакоўскі нарэшце ўпэўніўся, што будзе змагацца менавіта з Суворавым, які ўжо праз лічаныя гадзіны даў бой паўстанцам пад Крупчыцамі [152].

# ЧАСТКА IV

## 17 верасня 1794 года

## КРУПЧЫЦКАЯ БІТВА

### *2.00 – 8.00*

### Перад боем

Надыходзіў вырашальны дзень – серада 17 верасня 1794 года.

Ноччу Сувораў вывеў свае войска з Кобрына [153]. Прасунуўшыся наперад прыблізна на 5 вёрстаў у напрамку вёскі Агароднікі [154], расійцы прыпыніліся на пяць гадзін, і толькі атрымаўшы больш дакладныя звесткі пра сілы паўстанцаў, рушылі далей на збліжэнне з непрыяцелем.

Агульнае камандаванне калонамі Сувораў усклаў на генерал-паручніка Паўла Пацёмкіна, стрыечнага брата знакамітага кацярынінскага фаварыта.

Былі ўтвораныя тры калоны. Правая, узначаленая генерал-маёрам Георгіем Шэвічам, складалася з Алівіяпольскага гусарскага, Чарнігаўскага карабінернага, Марыупальскага і Александрыйскага лёгкаконных палкоў, да якіх былі дададзеныя пяць эскадронаў кінбурнскіх драгунаў. Такім чынам, агульным лікам Шэвіч кіраваў 26 эскадронамі.

Сярэдняя калона, сфарміраваная цалкам з пяхотных часцей, знаходзілася пад началам генерал-маёра Фёдара Буксгеўдэна (усяго 12 батальёнаў). У яе склад уваходзілі Херсонскі грэнадзерскі, Азоўскі і Ражскі мушкецёрскія палкі. Да іх далучыліся егерскія часткі: 2-гі і 3-ці батальёны Беларускага ды 2-гі і 4-ты батальёны Ліфляндскага карпусоў. Апроч таго, у калону ўваходзілі 14 гармат палявой артылерыі, да якіх былі дададзеныя дзве роты Маларасійскага грэнадзерскага палка.

У левую калону, узначаленую генерал-маёрам Пятром Ісленьевым, уваходзілі Пераяслаўскі коннаегерскі і Глухаўскі карабінерны палкі, што складаліся з 10 эскадронаў.

Важная роля адводзілася і часцям Войска Данскога агульным лікам у тысячу казакоў пад кіраўніцтвам брыгадзіра Івана Ісаева. Рухомыя казацкія аддзелы маглі нанесці адчувальную шкоду праціўніку, пра што сведчылі ранейшыя падзеі пад Дзівінам і Кобрынам.

У рэзерве стаяў полк карабінераў, які складаўся з 5 эскадронаў пад камандай брыгадзіра Уладычына [155].

Я. Анішчанка, абапіраючыся на дакументы, выяўленыя ў расійскіх архівах, даводзіў, што пазней Аляксандру Сувораву былі прадстаўленыя фармуляры палкоў, якія бралі ўдзел у Крупчыцкай бітве. З іх вынікала, што адных толькі шарагоўцаў і малодшых афіцэраў налічвалася 10857 чалавек [156]. Да гэтага дадамо 6 генералаў і прыблізна 300 афіцэраў, якія ўдзельнічалі ў бітве пад Крупчыцамі [157].

Такім чынам, агульны лік войска, прыведзенага Суворавым на Вялікае Крупчыцкае поле, вагаўся паміж 11 і 12 тысячамі чалавек [158]. Абапіраючыся на гэтыя сілы, ён рушыў з Кобрына ў кірунку Крупчыцкага кармеліцкага кляштара, дзе яго чакалі асноўныя сілы паўстанцкай дывізіі, падзеленыя Сéракоўскім на два крылы.

Левае крыло, якім кіраваў 20-гадовы генерал-маёр Ізыдар Красінскі, складалася з 5-га і 18-га рэгіментаў, прыкрытых двума эскадронамі 4-га палка літоўскай пярэдняй варты [159]. Перад іх лініямі былі ўсталяваныя дзве батарэі, кожная з іх складалася з 6 гармат.

У правае крыло пад камандаваннем генерал-маёра Дзянізія Панятоўскага ўваходзіла частка 15-га рэгімента, якая таксама мела дзве батарэі па 6 гармат кожная [160].

Рэшта дывізіі, аддадзеная пад начала Караля Кёніга, месцілася за левым крылом і выконвала ролю рэзерву. Сюды, акрамя палка самога Кёніга, уваходзілі Берасцейскі батальён і батальён Рафаловіча [161].

У гэты дзень сонца ўзыходзіла ў 6 гадзін 46 хвілін раніцы [162]. У рапарце, складзеным на імя фельдмаршала Пятра Румянцава, Сувораў пазней з храналагічнай паслядоўнасцю выкладаў ход Крупчыцкага бою. Перад світанкам расійцы *“змянілі пазіцыю і ўсталі... ў лініі ў найбольш прыдатным месцы, не заўважыўшы ў непрыяцеля ніякіх важных рухаў. Вырашана яго атакаваць!”* [163].

Казакі завязалі перастрэлку з паўстанцкімі раз’ездамі, захапіўшы некалькі палонных. Тыя паказалі, што Караль Серакоўскі вырашыў не ісці на Кобрын, а застацца на зручных пазіцыях каля Крупчыцкага кармеліцкага кляштара [164]. *“Выступіўшы а 7 гадзіне раніцы,* – паведамляў А.В. Сувораў, – *цераз тры вярсты маршу перайшлі мы рэчку Мухавец: конніца ўброд, пяхота і артылерыя па мосце”* [165].

Неўзабаве ў Перках з’явіўся і сам Сувораў, які аглядаў пазіцыі праціўніка. Мясцовыя сяляне і праз сто гадоў пасля падзеі ўспаміналі, як расійскі палкаводзец загадаў вынесці на пагорак, што знаходзіўся

прыблізна ў трохстах кроках за вёскаю, стол, залез на яго, аглядаючы праз падзорную трубу пазіцыі праціўніка, размешчаная за балоцістым берагам Трасцяніцы. Селянін Арцём Бабурчык з Перкаў нават прыводзіў словы Суворава, якія той быццам прамовіў да сваіх военачальнікаў: *"Далей пакуль не пойдзем, бо масты цераз рэчку паламаныя; за ёй стаяць польскія гарматы, і на агонь нам ісці нельга – будуць вялікія страты, пашукаем іншае месца, дзе лепей іх абысці"* [166]. Сувораў хацеў пазбегнуць лабавой атакі, таму пачаў шукаць праваднікa, які здолеў бы правесці расійскую конніцу ў тыл непрыяцеля. Паводле адной з версій, гэтую ганебную місію згадзіўся выканаць паляк Андраноўскі, паводле другой – нейкі мясцовы яўрэй [167].

Пачалася хуткая падрыхтоўка да бітвы. Абозы пад аховаю пяці рот Смаленскага мушкецёрскага і двух рот Маларасійскага грэнадзёрскага палкоў Аляксандр Сувораў адаслаў за Кобрын ў Малыя Лепясы, а з астатнімі сіламі паміж Пескамі і Чаравачыцамі бродам перайшоў Мухавец. Пераправу прыкрывалі казакі Ісаева, якія выцеснілі заставы праціўніка з вёсак Перкі і Сухоўчыцы [168].

### *8.00 – 12.00*

### Пераход расійцамі Трасцяніцы
### і "моцная праца артылерыі"

У 8 гадзін раніцы, апынуўшыся ўсяго за тры вярсты ад непрыяцеля, расійцы *"разагнуліся з калонаў у лініі і сфарміравалі часці для атак"* і, не марудзячы, пачалі рухацца наперад [169].

Адлегласць паміж варожымі бакамі імкліва скарачалася. Каралю Серакоўскаму паведамілі, што *"непрыяцель паказваецца здалёку перад фронтам. Войска тут жа імкліва стала пад ружжо так, як і было прадпісана"* [170].

Напачатку вялікай праблемай для расійцаў стаў шчыльны агонь паўстанцкіх гарматаў, якія *"паказалі свае добрыя якасці"* [171], пачаўшы інтэнсіўны абстрэл ворага прыкладна а палове 8-ай гадзіны раніцы [172].

Расійская конніца, якая дзейнічала без прыкрыцця сваіх батарэй, была адкінута артылерыйскім агнём. Караль Серакоўскі даволі хутка разгадаў манёўр суворaўцаў, якія перастройваліся за лесам у калоны, каб з аднаго боку ахапіць правы фланг паўстанцаў, а з другога – адрэзаць іх ад берасцейскага тракта [173]. Аднак вайсковага прадчування паўстанцкаму не хапіла, каб цалкам выкрыць планы Суворава.

А неўзадоўга перад 9-цю гадзінамі раніцы расійскі генерал-аншэф аддаў загад Ісленьеву наступаць на каронную конную гвардыю, размешчаную за Трасцяніцай. Пераяслаўскі коннаегерскі полк пачаў

імкліва выконваць гэты загад, але гвардыя ўцягнула пераяслаўцаў пад моцны агонь артылерыі, да таго ж, не ведаючы броду, расійцы загразлі ў багне. Атака іх захлынулася, і егеры са значнымі стратамі адышлі на правы бераг ракі. Тады Аляксандр Сувораў вырашыў звязаць паўстанцаў сваім цэнтрам і загадаў пяхоце перанесці галоўны ўдар на левы варожы фланг.

Пяхота, узначаленая Буксгеўдэнам устала перад вёскаю Перкі, кавалерыя Шэвіча – паміж пяхотай і лукою Мухаўца, што выступала на паўкіламетра, а Ісленьеў размясціўся за кіламетр з нечым на поўдзень ад вёскі. На ўсходней ускраіне Перкаў ужо стаяў баявы рэзерв, узмоцнены артылерыяй [174].

Нарэшце а 9-ай гадзіне і палявая артылерыя расійцаў адкрыла агонь. Яе бесперапынная кананада стала сапраўдным іспытам для паўстанцкіх рэгіментаў, якія, аднак, мужна выстаялі, у першую чаргу дзякуючы дапамозе сваіх батарэй. Паміж паўстанцкімі і суворaўскімі артылерыстамі завязаўся сапраўдны двубой [175].

Менавіта гэтую гадзіну і Серакоўскі, і Сувораў лічылі сапраўдным пачаткам бітвы: калі раней праціўнікі яшчэ маглі адысці, дык цяпер у бой былі ўцягнутыя такія вялікія сілы пяхоты, конніцы і артылерыі, што разысціся мірам ужо ніяк не атрымлівалася.

Пазней Караль Серакоўскі ўспамінаў: *“У 9 гадзін мы ўбачылі ўжо бліжэй перад фронтам... пяхоту* (праціўніка. – А.Б.)*, а за яе каркамі і ў разрывах – гусар, стральцоў і карабінераў... Убачыўшы, што процьма пяхоты з гарматамі стала набліжацца да батарэі Арлінскага, я загадаў яму паволі адступаць праз грэблю, а для забеспячэння яго загадаў двум батальёнам рассыпацца на тым баку Трасцяніцы”* [176].

Аляксандр Сувораў, ацаніўшы стан сваіх і варожых войскаў, пераканаўся, што франтальная атака не прынясе яму нічога, акрамя бессэнсоўных стратаў.

Ад вока паўстанцаў расійцаў хаваў лес. Гэтую акалічнасць яны і скарысталі, каб перагрупавацца. Сувораў вырашыў кінуць кавалерыю ў глыбокі абыход паўстанцкіх пазіцый. Гэты манёўр генерал-маёр К. Серакоўскі, на жаль, не разгадаў. Значна пазней паўстанцкі генерал, асэнсоўваючы падзеі 17 верасня, асабліва вылучыў гэты істотны момант бою, які дазволіў расійцам атрымаць значную перавагу. Генерал-аншэф А. Сувораў ахвяраваў сваёй пяхотай, якая павінная была прыняць на сябе самыя вялікія страты, але пры гэтым дазволіла конніцы паспяхова здзейсніць рэйд у тыл серакоўцаў.

Прыблізна а палове 10-ай ад палкоў генерал-маёра Буксгеўдэна аддзяліліся чатыры егерскія батальёны, а яшчэ праз паўгадзіны за імі

рушылі і астатнія. Пераправіўшыся цераз гразкі ручай, які ўпадаў у Мухавец, расійская пяхота а 10-ай гадзіне пачала атаку, але мела вялікія цяжкасці з пераадоленнем ракі і багністай тэрыторыі.

Яшчэ праз чвэрць гадзіны (у 10 гадзін 15 хвілін) следам за пяхотай рушыла конніца левага фланга, якой спатрэбілася двойчы фарсіраваць Мухавец. Адначасова пяхотныя часці Фёдара Буксгеўдэна сумесна з Чарнігаўскім і Кінбурнскім карабінернымі палкамі, рэшткамі гусараў і казакоў на флангу павінныя былі фарсіраваць Трасцяніцу і на ўчастку паміж Хадасамі і Рыкавічамі атакаваць непрыяцельскі фланг. Цудоўна разумеючы, што поспеху можна дамагчыся адно зладжанымі дзеяннямі усіх вайсковых фарміраванняў, Сувораў узмоцніў націск, накіраваўшы следам за егерамі яшчэ чатыры батальёны Херсонскага грэнадзёрскага палка, а за імі – ражскіх і азоўскіх мушкецёраў, якія пераправіліся цераз раку побач з Хадасамі [177].

Калі К. Серакоўскі заўважыў, што з лесу насупраць Трасцяніцы выйшла калона інфлянцкіх і беларускіх егераў, а далей – насупраць Рыкавічаў – з’явіліся чарнігаўскія карабінеры, ён рушыў ім насустрач рэзервы. Каб не дазволіць сувораўцам ажыццявіць пераправу, галоўныя сілы серакоўцаў пашкодзілі мост ля Нелаевічаў. Гэты стратэгічны аб’ект, за які паўстанцы раней моцна трымаліся, цяпер зрабіўся небяспечным, паколькі тут маглі прарвацца расійцы. Аднак пашкоджанне моста не спыніла наступальны імпэт праціўніка.

У палове 11-га раніцы Сувораў загадаў другой частцы сваёй кавалерыі абысці варожыя пазіцыі справа і атакаваць паўстанцаў з тылу. У гэты момант паміж Перкамі і Мухаўцом сканцэнтравалася прыблізна 9 000 расійскіх жаўнераў. Шчыльнасць была настолькі вялікаю, што войскі нейкі момант не маглі зрушыцца з месца. Дзеля вырашэння гэтай праблемы на другі бок ракі былі перакінутыя Александрыйскі, Марыупальскі палкі і палова Альвіяпольскіх гусараў (усяго 13 эскадронаў), якія скіраваліся на Залуззе-Савіцкае, каб ніжэй вусця Трасцяніцы, фарсіраваўшы Мухавец, праз Філіпавічы ўдарыць ў тыл паўстанцам [178].

Херсонскія грэнадзёры пад няспынным агнём паўстанцаў разабралі прыбярэжныя хаты і хлявы ў вёсцы Хадасы, склаўшы з іх часовую пераправу. А. Петрушэўскі асабліва адзначыў расійскую пяхоту, якая “*кінулася наперад з вялікім імпэтам*”. Паўстанцкая артылерыя ўзмацніла агонь, ад якога “*асабліва дасталося Херсонскаму палку; карцеч вырывала ў ім цэлыя шэрагі, ён двойчы змыкаўся, але не прыпыняўся і не вагаўся*” [179].

Балота, што даводзілася пераадольваць сувораўцам, як выявілася, было надзвычай глыбокім і цяжкім для фарсіравання. Чатыры палявыя

гарматы нават давялося несці на руках і плячах. Уся астатняя артылерыя, у тым ліку 14 гармат, пастаўленых на пагорку ля Хадасоў, заставалася ззаду і прыкрывала наступ, моцна турбуючы серакоўцаў. Тым часам проста на паўстанцаў ішоў Уладычын. Яму ўдалося авалодаць мостам. Ісленьеў кіраваўся на Сухоўчыцы, адкуль пагражаў серакоўцам абыходам правага фланга.

Для перахода балота і Трасцяніцы расійцам спатрэбілася цэлая гадзіна. У багну кідаліся бярвёны разабраных найбліжэйшых хат, кавалерыя шаблямі секла кусты і масціла імі сябе дарогу. Скарыстаўшы час, які праціўнік выдаткаваў на пераправу, паўстанцы перамянілі пазіцыю, каб сустрэць атакуючага ворага у фронт. Нарэшце а палове 12-ай расійскія пехацінцы пераадолелі дрыгву і хутка перабудаваліся для наступу [180].

### *12.00 – 16.00*

### “Удар у штыкі” і адступленне паўстанцаў

Каля поўдня сувораўцы паскораным крокам рынуліся наперад. Надышоў самы драматычны момант бітвы.

Пад моцным гарматным агнём і градам карцечы расійцы кінуліся на паўстанцкія пазіцыі. А. Петрушэўскі адзначаў: “*Удар у штыкі быў жорсткі, яму папярэднічалі толькі некалькі стрэлаў са стрэльбаў, дый тыя былі мізэрнай процівагай частому агню польскай артылерыі*” [181].

Штыкавы ўдар быў бязлітасны. Нягледзячы на тое, што паўстанцы біліся з адчайнаю храбрасцю, праціўнік паступова пачаў цясніць іх [182].

Тады Сувораў кінуў на каронную конную гвардыю свой левы фланг. Конныя пераяслаўскія егеры перайшлі зламаны мост пад Нелаевічамі і пачалі атакау з поўдня. Але каронная гвардыя зрабіла бліскучы манеўр: адышоўшы за рэчку, яна ўцягнула пераяслаўцаў пад агонь сваёй артылерыі. Не ведаючы бродаў, расійцы вязлі ў балоце і з вялікімі стратамі вымушаны былі адступіць.

Пералом у баі наступіў каля 15 гадзін, калі расійская пяхота захапіла шляхецкі двор, які ўзвышаўся над тыламі паўстанцкіх пазіцый. Гэтае месца было вельмі зручнае для абстрэлу праціўніка [183].

Амаль адначасова з’явілася кавалерыя генерала Георгія Шэвіча, што ажыццяўляла абыход цераз Рыкавічы і Юзэфін (Юзэфпаль) і таксама пераправілася па часовай гаці. Шэвіч паказаўся на тылах левага крыла паўстанцаў, а з іншага боку хутка імчалі вершнікі, якіх ўзначальваў брыгадзір Пётр Ісленьеў. Іншыя расійскія конныя аддзелы перакрылі

дарогу на Берасце. Адначасова ўзмоцніўся націск расійскіх шарагоўцаў у цэнтры.

*"Тут я заўважыў,* – згадваў пазней Караль Серакоўскі, – *што непрыяцель адразае мяне на левым флангу ад берасцейскага тракта на Булькоў і хоча ахапіць наш правы фланг".* На шчасце, паўстанцкі генерал своечасова заўважыў небяспеку і *"загадаў кавалерыі паволі адступаць і з абодвух бакоў прыкрыць адыход гарматаў"* [184].

Серакоўцы пачалі фарміраваць пяхотнае карэ для адступлення. Галоўную ролю тут адыграў Берасцейскі батальён Рафаловіча: ён займаў моцную пазіцыю і заставаўся на месцы, пакуль астатнія адыходзілі. Такім чынам, берасцейцы, ахвяруючы сабою, дазволілі астатнім паўстанцам выйсці з бою. Расійцы ўзмацнілі націск на Берасцейскі батальён, але той здолеў утрымаць фронт дзякуючы своечасовай падтрымцы артылерыі.

Следам за злучэннямі правага фланга серакоўцаў, якія адыходзілі цераз Трасцяніцу, рушылі атрады брыгадзіра Івана Уладычына. Абодва бакі паўстанцкага карэ прыкрывала конніца: правы – эскадроны 3-га і 4-га літоўскіх палкоў, левы – конная гвардыя і палкі Кёніга і Казаноўскага [185].

Адступленне праходзіла пад няспыннымі атакамі расійскай кавалерыі. Палкоўнік Мустафа Ахматовіч на чале 4-га палка літоўскай пярэдняй варты адважна контратакаваў непрыяцельскіх егераў і прымусіў іх павярнуць назад. Аднак у той самы момант на супрацьлеглым флангу Пераяслаўскі коннаегерскі полк рассёк каронную конную гвардыю і полк Казаноўскага. Гвардыя не вытрымала націску шматлікіх непрыяцельскіх эскадронаў і кінулася наўцёкі. Пачалі адступаць і кавалерысты Казаноўскага. За імі кінулася расійская кавалерыя. Узнікла рэальная пагроза для паўстанцкай пяхоты. Тады Караль Серакоўскі прыняў адзіна правільнае рашэнне: *"Убачыўшы тое, я даў арданаpс падпаручніку Сулкоўскаму вярнуцца з гарматамі і адкрыць з іх агонь. Хапіла аднаго стрэлу, каб уся непрыяцельская кавалерыя павярнула назад, а рэгімент коннай гвардыі самкнуўся, акрамя некаторых, якія ганебна кінулі пляц гонару і панеслі ў сваіх сэрцах страх і трывогу"* [186].

Такім чынам, адносна невялікая частка жаўнераў, у першую чаргу рэкрутаў, кінулася на ўцёкі. Некалькі паўстанцаў спрабавалі схавацца за сценамі Крупчыцкага манастыра, але былі пасечаныя там казакамі [187].

Серакоўскі вырашыў скарыстаць адзіны шлях для адступлення – па акольнай дарозе на вёску Багданы. Прыкладна праз кіламетр за вёскай дывізія, не парушаючы баявога строю, пачала ўваходзіць у густы лес. Паўстанцкія гарматы, пастаўленыя на ўзлеску, рашуча адбілі праціўніка,

які яшчэ спрабаваў наладзіць пераслед. Расійцы зразумелі, што кідацца ў пагоню не мае сэнсу.

Было каля 16 гадзін дня. Бітва, якая распачалася амаль на світанні, скончылася [188].

### 17-18 верасня
## ШЛЯХ НА БЕРАСЦЕ

Да захаду сонца заставалася яшчэ амаль тры з паловаю гадзіны [189]. Серакоўскі вёў свае палкі на Берасце.

Калі ўжо стала канчаткова зразумела, што расійцы прыпынілі пагоню, генерал-маёр загадаў трубачам і барабаншчыкам даць сігнал на адпачынак. За вёскаю Бараны быў наладжаны першы кароткі прывал.

Далей дывізія рушыла ўздоўж канавы Чорны Роў праз Целякі на Азяты і Старое Сяло. Дарога паміж Целякамі і Азятамі была пабудаваная толькі праз сто гадоў пасля бітвы, таму паўстанцы скарысталі даволі добрую грэблю, якая мелася паміж гэтымі вёскамі. Удзельнік бітвы стараселец Самуіл Пшонны пазней расказваў, што пры набліжэнні серакоўцаў гаспадар Старога Сяла адстаўны генерал Зельвіч, апрануты ў форму, выйшаў да паўстанцаў і прасіў іх не спыняцца, каб не нашкодзіць вёсцы [190]. Яны рушылі далей – на Франопаль і Радванічы. Прыблізна ў поўнач паўстанцы мінулі Забалацце, а неўзабаве былі ў Камяніцы-Журавіцкай. Тут да іх далучыўся атрад, які пры адступленні адарваўся ад асноўных сілаў дывізіі [191].

Наступнай на шляху серакоўцаў была вёска Шпановічы (сёння частка Берасця). Гэтак, *"маршыруючы ўсю ноч, маючы ззаду лютую сілу... непрыяцеля і шмат запаленых вёсак"* [192], Караль Серакоўскі прайшоў са сваім войскам 45 кіламетраў. Яшчэ на досвітку 18 верасня (прыблізна а 5-ай гадзіне) паўстанцы вярнуліся ў лагер пад Тэрэспалем [193].

Нарэшце войска, стомленае доўгай бітвай і пераходам, атрымала магчымасць адпачыць і палічыць страты, якія прыблізна склалі 300 чалавек [194].

Найбольш пацярпеў у Крупчыцкай бітве 18-ты рэгімент Красінскага, дзе загінулі капітан Краеўскі, паручнік Шушкоўскі, харунжы Рудніцкі, 5 унтэр-афіцэраў, 6 барабаншчыкаў і 101 шараговец. Серакоўскі высока ацаніў учынак Рудніцкага, які, нават смяротна ранены, мужна заклікаў сваіх байцоў да змагання [195].

Сярод афіцэраў не далічыліся таксама паручніка Нячынскага, падпаручнікаў Джэвіньскага і Крукоўскага, харунжага Высоцкага – яны

загінулі смерцю героя. Разам з тым, маёр Карлоўскі і харунжы Арлоўскі збеглі з поля бітвы, зняславіўшы сваё імя [196].

Падвёўшы вынікі Крупчыцкага бою, Караль Серакоўскі зразумеў галоўнае: хоць і стомленае, войска засталося баяздольным, захавала дысцыпліну, было ў стане працягваць барацьбу. Генерал спадзяваўся, што вораг далёка. Аднак памыліўся. У той самы час, калі серакоўцы падыходзілі да Берасця, Аляксандр Сувораў загадаў сваім палкам выступаць у паход.

Расійцы былі стомленыя не менш за паўстанцаў, таму адразу пасля заканчэння бою генерал-аншэф вырашыў даць ім адпачыць. Войска размесцілася за тры кіламетры ад Крупчыцаў, каля фальварка Янопаль. Сюды каля 17 гадзін прыбылі з Малых Лепясоў палявыя кухні, гатавалася вячэра. Раненыя былі адвезеныя ў Кобрын. Тутэйшым сялянам было загадана пахаваць загінулых воінаў.

Сувораў таксама вырашыў адпачыць. Па словах А. Петрушэўскага, ён “*заехаў на невялічкае ўзвышша, злез з каня, скінуў каску, перахрысціўся, прамовіўшы “Слава ў вышніх Богу”, выпіў кілішак гарэлкі, з’еў сухар і, закруціўшыся ў плашч, лёг адпачываць на зямлю пад дрэвам*” [197].

Праз некалькі гадзін “падмацаваны сном” палкаводзец аб’ехаў свае войска. З удзячнасцю прыпыняўся ў кожным палку, дзякаваў за службу. У тую ж ноч ён даслаў веставога з рапартам да фельдмаршала Румянцава-Задунайскага: “*Вашае сіяцельства! Маю гонар павіншаваць з перамогаю, атрыманай над Бржэсцкім польскім корпусам... Атакаваны непрыяцель змагаўся моцна больш за 5 гадзін, але разбіты...; з нашага боку страты малыя*” [198]. Сувораў запэўніваў, што згубіў на Крупчыцкіх палях усяго 318 (ці 325) чалавек забітымі і параненымі. Аднак пазнейшыя гісторыкі, у тым ліку і расійскія, крытычна паставіліся да гэтай лічбы, павялічваючы яе да 700 [199].

Пасля 8-гадзіннага адпачынку пад Янопалем было вырашана рухацца на Берасце. У 2 гадзіны ночы 18 верасня пратрубілі збор. 16 кіламетраў суворaўцы рухаліся трактам праз Рагозна, Хведкавічы (Федзькавічы) і Ракітніцу [200].

Каля 9-ай гадзіны раніцы расійцы дасягнулі Булькова. Тут яны вымушаныя былі прыпыніцца на чатыры гадзіны, каб ізноў пераадольваць Мухавец, які ў гэтых мясцінах быў значна шырэйшы, чым пад Крупчыцамі. Паўстанцы ж паклапаціліся пра знішчэнне Булькоўскага моста. Фарсіраваўшы а 13-ай гадзіне раку, войска рушыла на Шэбрын, Ямна і Вычулкі і праз чатыры гадзіны дасягнула Трышына [201].

Сувораў меў істотныя перавагі: наколькі расійцы рухаліся напрасткі, яны зрабілі толькі 30 кіламетраў (тады як паўстанцы вымушаныя былі прайсці 45), рухаліся незаўважанымі, мелі значную перавагу ў баявой сіле. Цяпер Сувораў добра ўяўляў сапраўдную колькасць серакоўцаў і меў свежыя рэзервы, якія не бралі непасрэднага ўдзелу ў бітве пад Крупчыцамі. Усё гэта магло паўплываць на зыход новага бою.

Аднак і ў становішчы Серакоўскага былі пэўныя дадатныя бакі. Ягоныя палкі ўжо амаль суткі мелі магчымасць адпачываць ва ўмацаваным тэрэспальскім лагеры. Страты, панесеныя ў Крупчыцкай бітве, кампенсаваліся рэзервістамі. Паўстанцкі кіраўнік цяпер дакладна ўяўляў тактычныя і стратэгічныя здольнасці свайго праціўніка.

Ведаючы, наколькі сілы расійцаў пераважаюць ягоныя войскі, Серакоўскі прагнуў пазбегнуць новай бітвы, таму рыхтаваўся для далейшага адступлення ў глыб польскіх тэрыторый. А 22 гадзіне 18 верасня генерал-маёр нават быў загадаў вырушыць трактам на Белую, аднак, пабачыўшы, што значная частка войска яшчэ не адпачыла пасля ранейшага пераходу, адмяніў свой загад [202].

## 19 верасня
# ПАСЛЯ БОЮ – НОВЫ БОЙ

У кароткі прамежак часу Тэрэспалю было наканавана двойчы стаць месцам значных бітваў. Падчас вайны 1792 года на гэтых абшарах мерыліся сіламі войскі генерал-лейтэнанта Шымана Забелы і генерал-паручніка Івана Ферзена. Цяпер тыя ж мясціны павінныя былі стаць арэнай для заключнага акта драмы з удзелам генерал-маёра Караля Серакоўскага і генерал-аншэфа Аляксандра Суворав. Першая частка гістарычнай дзеі, што адбывалася напярэдадні пад Крупчыцамі, ніводнаму з бакоў не прынесла вырашальнай перавагі, хаця абодва военачальнікі лічылі сябе пераможцамі.

Надвячоркам 18 верасня Караль Серакоўскі атрымаў звесткі пра казацкія раз'езды, якія пачалі з'яўляцца каля Берасця [203]. Каб удакладніць дыспазіцыю праціўніка К. Серакоўскі выправіў у выведку свайго афіцэра, аднак той наткнуўшыся на казакоў, не здолеў вярнуцца у час. Цэлы эскадрон з палка Кёніга таксама быў адрэзаны ад сваіх.

Уначы расійцы спыніліся каля вёскі Трышын, у даліне, схаванай за лесам. [204]. Сувораў сам начаваў у хаце, куды неўзабаве склікаў кіраўнікоў сваіх палкоў, каб абмеркаваць план будучай бітвы.

Генерал-аншэф не хацеў паўтараць тры крупчыцкія памылкі, якія каштавалі яму перамогі. Сувораў, безумоўна, умеў вучыцца на ўласных праліках, аналізаваць і пазбаўляцца іх. Першая памылка заключалася ў тым, што ягоныя войскі загадзя не адшукалі месцаў фарсіравання Трасцяніцы, таму давялося гэта рабіць непасрэдна пад час бою пад моцным агнём варожых батарэй. Другая памылка – недаацэнка Суворавым паўстанцкай артылерыі, з-за чаго ягоныя “цуда-волаты” пад Крупчыцамі панеслі значныя страты. Паўстанцкія кананіры паказалі свае лепшыя якасці, не дазволіўшы сувораўцам развіць поспех, а на заключным этапе бітвы менавіта артылерыя дазволіла паўстанцам адысці належным чынам. Трэцяя памылка заключалася ў тым, што расійскія войскі, нягледзячы на лічбавую перавагу, увогуле дазволілі паўстанцам годна пакінуць поле бою.

Аднак нязробленае 17 верасня Сувораў меў намер выканаць праз два дні. Першую памылку ён пачаў выпраўляць адразу. У Трышынскім лагеры заставаліся смаленскія мушкецёры і Кінбурнскі карабінерны полк. Гэтая група павінна была зранку дэманстратыўна фарсіраваць Буг вышэй Берасця, у той самы час, як асноўныя сілы пачнуць пераход ракі бродамі ніжэй горада.

Прыкладна а гадзіне ночы 19 верасня Аляксандр Сувораў загадаў падымаць салдат. Войску абвесцілі лозунг: “З намі Бог!” У месячным святле расійцы без перашкодаў фарсіравалі Мухавец [205]. “*Яшчэ праз 300 сажэняў,* – дакладаў Сувораву генерал П. Пацёмкін, – *ізноў пераадолелі рукаў Мухаўца... На досвітку дасягнулі ракі Буг, фарсіраванне якой было справай вельмі цяжкай. Але ці можа якая перашкода спыніць войскі пад Вашым кіраўніцтвам! Адразу ж казакі, а за імі і ўся конніца, пераехалі Буг. Артылерыя перавезеная, пяхота ішла ў вадзе вышэй за калена*” [206].

Пра хуткае набліжэнне ворага Серакоўскі даведаўся толькі раніцай 19 верасня з рапарта падпалкоўніка Яна Фантаны. Той са сваім 2-ім батальёнам 5-га рэгімента і з дзвюма гарматамі ахоўваў мост цераз Буг. Нават гэтых сілаў было дастаткова, каб не даць праціўніку пераправіцца тут. Аднак Сувораў, улічваючы вопыт Крупчыцкай бітвы, цяпер і не спрабаваў весці свае палкі на паўстанцкія гарматы. Каля 5 гадзін раніцы ён загадаў фарсіраваць раку ніжэй і вышэй моста. Фантана, якому заставалася толькі бездапаможна назіраць за пераправаю ворага, спешна выправіў веставога да Караля Серакоўскага [207]. У Берасці і Тэрэспалі ўдарылі ў набат.

Адразу пасля фарсіравання Буга расійцы сфарміравалі крылы атакі. Правае, пад кіраўніцтвам генерал-маёра Шэвіча, складалася з эскадронаў Алівіяпольскага, Пераяслаўскага і Александрыйскага конных палкоў, якія прыкрывалі Чарнігаўскі карабінерны полк брыгадзіра Паліванава.

Левае крыло вёў генерал Ісленьеў. У ім таксама былі часткі Алівіяпольскіх гусараў і пераяслаўскіх егераў, а яшчэ – Марыупальскі лёгкаконны і Глухаўскі карабінерны палкі [208].

Было прыблізна 6 гадзін, калі серакоўцы заўважылі хуткае набліжэнне праціўніка. Левае крыло паўстанцкай дывізіі ўпіралася непасрэдна ў Тэрэспаль, а правае прымыкала да лесу. Расійцы рухаліся спешна, і ўжо праз гадзіну іх левае крыло дасягнула вёскі Паляцічы, а казакі занялі вышыню ля Блоткаў. Шэвіч першым уступіў у бой. Серакоўцы пад заслонаю артылерыі пачалі адступаць на Лабачэў і Вялікія Ляхуты [209]. Першым ішоў авангард, за ім – тры калоны пяхоты, якую прыкрывалі каронная конная гвардыя, два эскадроны 3-га палка літоўскай пярэдняй варты і эскадрон палка Кёніга. Тут знаходзіліся таксама генерал-маёры Караль Серакоўскі і Дзянізій Панятоўскі. Ар’ергард паўстанцаў ледзь стрымліваў наступ расійскай конніцы, аднак паўстанцкія калоны ўсё ж здолелі заняць зручнае месцы на ўзвышшы за вёскай Карошын, дзе ўсталявалі тры батарэі з 12 гармат.

Серакоўскі меў намер контратакаваць расійскае левае крыло. Аднак Ісленьеў, зразумеўшы ягоны план, накіраваў на падмацаванне казакаў тры эскадроны алівіяпольскіх гусар і два аддзелы ахвотнікаў.

Цяпер для Суворава наспеў час выправіць другую крупчыцкую памылку. Усе галоўныя расійскія сілы былі кінутыя на падаўленне батарэй.

Справу фактычна вырашыла расійская кавалерыя, пад ударам якой шэрагі авангарду паўстанцаў рассыпаліся. Паніка перадалася артылерыстам. І толькі дзякуючы намаганням паручніка Клоса становішча крыху выправілася: “*Гарматы і вазы з амуніцыяй пачалі пакідаць батальёны і гэтак спешна з’язджалі прэч, што былы парадак зусім знік. Узнавіў яго ізноў паручнік Клос, аднак раптам авангард пачаў маршыраваць так хутка, што значна адарваўся ад корпуса*” [210]. Гэта неадкладна скарысталі Алівіяпольскія гусары, якія нанеслі ўдар па пешай гвардыі. Яшчэ трымаўся батальён Крулікоўскага, але і ён быў рассечаны напалам казацкімі часцямі. Аднак давяршылі знішчэнне крулікоўцаў свае ж – літоўская пярэдняя варта, якая “*спешна ўцякаючы, пацягнула за сабою кавалерыю гэтак далёка, што ані крык, ані гукі трубы не здолелі ўтрымаць яе ад галопу*” [211]. Да таго ж сувораўскія гарматы значна ўзмацнілі агонь, выклікаючы яшчэ большы разлад у шэтагах праціўніка. Надышоў час Сувораву выправіць трэцюю і апошнюю памылку, зробленую пад Крупчыцамі.

Паўстанцы адыходзілі трыма калонамі. Генерал-маёр Шэвіч узяў непасрэдна на сябе кіраванне пяццю эскадронамі егераў і ўдарыў па галаўной калоне. Адначасова Чарнігаўскі і Александрыйскі палкі дагналі

другую калону, нанеслі паўстанцам вялікія страты і захапілі шэсць гармат. Трэцяя калона трапіла пад удар левага крыла расійскай конніцы і была амаль цалкам вынішчаная [212]. Караль Серакоўскі сіламі авангарда спрабаваў супрацьстаяць бясконцым атакам конніцы Ісленцьева (на той час генерал Ісленцьеў кіраваў ужо ўсімі наступаючымі сіламі расійцаў, паколькі пад Шэвічам быў падстрэлены конь).

Перад серакоўцамі ляжала вёска Добрынь, за якой іх ужо чакала непрыяцельская кавалерыя. Расійская артылерыя, абстрэльваючы вёску, запаліла яе з розных бакоў. Кола вакол паўстанцаў амаль замкнулася, тады, каб не трапіць у мышалоўку, генерал Серакоўскі загадаў змяніць кірунак адступлення і прабівацца на поўнач, праз дрыгву і лясы да пераправы праз раку Кшну. Цяпер пад ягоным кіраўніцтвам заставалася ледзь 200 жаўнераў. Паміж Дзерачанкай і Навасёлкамі серакоўцы адшукалі брод і перайшлі раку. Да апошняга моманту Караль Серакоўскі спрабаваў захаваць гарматы, але, зразумеўшы, што яны перашкаджаюць пераправе, аддаў загад утапіць рэшту сваёй артылерыі.

За ракой Серакоўскі сабраў рэшткі свайго войска – агульным лікам не больш за тысячу пехацінцаў і эскадрон кароннай коннай гвардыі. Яшчэ невялікая колькасць байцоў разбітых атрадаў пераходзіла Кшну паасобку і групкамі. Расійцы спынілі праслед. Бітва канчаткова згасла а 14-ай гадзіне [213].

### Верасень – лістапад

## “СЛАВА ПЕРАМОЖАНЫМ”

Праз месяц, 18 кастрычніка 1794 года, у суботнім нумары “Варшаўскай вольнай газеты” з’явілася невялікая нататка, прысвечаная падзеям, што адбываліся ў раёне Берасця: “*Абывацелі, якія прыбылі з Брэста-Літоўскага, паведамілі, што корпус Суворава цяпер не мае больш за 8000, страціўшы звыш 4000 чалавек у двух бітвах з генералам Серакоўскім*” [214]. Такім чынам, замоўчваючы сапраўдны стан рэчаў, паўстанцкая газета спрабавала супакоіць грамадства. Аднак гэта ўжо не мела ніякага сэнсу. Чуткі пра катастрафічнае развіццё падзей перасталі быць таямніцаю.

Пасля паразы пад Берасцем Караль Серакоўскі з рэшткамі войска адыходзіў углыб польскіх земляў. Ён страціў корпусныя сцягі і ўсю артылерыю, якой некалі так ганарыўся [215].

8 кастрычніка ў рапарце, дасланым на імя Т. Касцюшкі з Карытніцы, генерал-маёр ацаніў свае агульныя страты ў Крупчыцкай і

Тэрэспальскай бітвах у 2204 чалавек. Фактычна ўсе палкі былі абяскроўленыя: муніцыпальны варшаўскі батальён Рафаловіча выбіты на дзве трэці, 18-ты рэгімент страціў больш за палову байцоў, а кобрынская кавалерыя назаўсёды знікла з рапартаў [216].

Разам з тым, Серакоўскі не забыўся аддаць належнае адважным афіцэрам, якія геранчна змагаліся пад Крупчыцамі і Тэрэспалем. Пералічым тых, хто асабліва вызначыўся падчас Крупчыцкай бітвы:

- палкоўнік 18-га рэгімента, кавалер ордэна "Віртуці Мілітары" Антоні Шушкоўскі;
- палкоўнік кароннай пешай гвардыі Ксаверый Гябдоўскі, будучы генерал брыгады;
- кіраўнік 2-га батальёна 5-га рэгімента падпалкоўнік Ян Фантана (у час баёў на Берасцейшчыне быў падпалкоўнікам, аднак ужо 8 кастрычніка Караль Серакоўскі называе яго палкоўнікам);
- падпалкоўнік Юзаф Гофман;
- маёр кароннай коннай гвардыі Станіслаў Касмоўскі, які пакінуў пасля сябе кнігу ўспамінаў [217];
- артылерыйскія паручнікі Клос, Сулкоўскі і Банчкоўскі.

І ўвогуле, *"у той дзень уся інфантэрыя выканала свой доўг"*, найлепшыя якасці паказалі літоўскія татарскія аддзелы, асабліва 4-ты полк пярэдняй варты пад камандаю палкоўніка Мустафы Ахматовіча [218]. На жаль, праз два дні пад Берасцем нават гераізм серакоўцаў ужо не здолеў супрацьстаяць атакам расійскай кавалерыі і пяхоты.

Пра лёс "берасцейскага корпуса" Тадэвуш Касцюшка даведаўся ўжо на наступны дзень пасля тэрэспальскай паразы. Напярэдадні Найвышэйшы Начальнік збіраўся асабіста ўзначаліць барацьбу з Суворавым і спешна выехаў да месца баявых дзеянняў. Аднак увечары 19 верасня каля Седліцаў яму пачалі сустракацца разрозненыя групкі паўстанцаў. Ад іх генерал даведаўся, што справа пад Тэрэспалем прайграная.

27 верасня Тадэвуш Касцюшка, прыбыўшы ў Вішнёў, дзе спыніліся рэшткі дывізіі Серакоўскага, загадаў судзіць афіцэраў, *"якія ганебна збеглі з поля бою"*. Для гэтага ён запатрабаваў спісы не толькі тых, хто вызначыўся пад Крупчыцамі і Берасцем, але і тых, хто змаладушнічаў. За Крупчыцкую бітву маёр Станіслаў Касмоўскі атрымаў з рук

Найвышэйшага Начальніка залаты пярсцёнак пад № 38 і надпісам “Айчына свайму абаронцу”. А вайсковага капелана, які ў час змагання пад Берасцем падбадзёрваў жаўнераў словам і прыкладам, Т. Касцюшка ўзнагародзіў залатым гадзіннікам [219]. Палявы суд пад кіраўніцтвам генерал-маёра Князевіча, разгледзеўшы справы, разжалаваў пяць афіцэраў, прычым чацвёра яшчэ захавалі шанец вярнуць свае пагоны, калі праявяць мужнасць у наступнай бітве, а адзін афіцэр за страту штандара быў назаўсёды пераведзены ў шараговыя [220].

Пасля таго, як расійцы занялі сталіцу Вялікага Княства і разбілі серакоўцаў паміж Кобрынам і Берасцем, супраціў на Літве-Беларусі губляў усялякі сэнс. Адзіным астраўком паўстання заставалася Гародня, але і яна была пад пагрозаю. Менавіта туды ў суправаджэнні свайго ад’ютанта Юльяна Нямцэвіча накіраваўся Касцюшка. 29 і 30 верасня ў Гарадзенскім каралеўскім палацы адбылася нарада, на якой Найвышэйшы Начальнік крытычна разгледзеў справы ў Вялікім Княстве. Было вырашана спыніць усялякае супраціўленне на Літве. Паўстанцкія атрады адыходзілі ў кірунку Варшавы для абароны сталіцы Рэчы Паспалітай. 10 кастрычніка Тадэвуш Касцюшка, асабіста ўзначаліўшы войска, даў свой апошні бой пад Мацяёвіцамі і, паранены, трапіў у расійскі палон. Лёс свайго кіраўніка падзялілі 1952 жаўнеры, 114 афіцэраў і генералы Караль Князевіч, Міхал Каменскі і Караль Серакоўскі [221]

Яшчэ амаль месяц касцюшкаўцы працягвалі супраціўленне. Аднак пасля крывавага штурму варшаўскага прадмесця Прагі нацыянальна-вызвольнае паўстанне фактычна было задушанае. Генерал-аншэф Суворaў накіраваў Кацярыне II рапарт, што складаўся ўсяго з трох словаў: “*Ура! Варшава наша!*” Адказ быў таксама лаканічны: “*Ура! Фельдмаршал Суворaў!*” За Крупчыцы і Тэрэспаль ён атрымаў “*брыльянтавую пятліцу на капялюш і тры гарматы*”, за Прагу, паклаўшы пад ногі Кацярыны Польшчу і Беларусь, – маршальскую ляску [222]. Амаль на два стагоддзі нашыя землі трапілі пад уладу Расійскай імперыі…

На заканчэнне, нам застаецца толькі паўтарыць пытанні, зададзеныя некалі Уладзімірам Емяльянчыкам – гісторыкам, які шмат у чым адкрыў для беларусаў гераічны і трагічны 1794 год: “*Мы вяртаемся ў сваю ўласную гісторыю. Абцяжараныя няведаннем, апутаныя навязанымі догмамі і стэрэатыпамі... Мы вяртаемся нібыта на папялішча. І бачым, што з нашай спадчыны забраў агонь, а што разграблі з вуголля часу і забралі з сабою больш спрытныя папярэднікі. Нам застаецца адвечнае пытанне – адкуль мы такія? Мужныя і занадта талерантныя, дасціпныя і абыякавыя, змагары і здраднікі, амаль пахаваныя і ўсё ж несмяротныя? Усе мы – са шматлікіх, залітых крывёю і потам, мінулых пакаленняў, старонак сваёй гісторыі*” [223].

Сёння мы паспрабавалі раскрыць толькі адну з тых старонак, каб уважлівей угледзецца ў твары ваяроў, што праславілі свае імёны на Крупчыцкім вайсковым полі ў змаганні “за вашу і нашу свабоду”.

# ВЫСНОВЫ

Па колькасці ўдзельнікаў Крупчыцкі бой – самы вялікі ў Касцюшкаўскім паўстанні і адзін з найбуйнейшых у гісторыі Беларусі. У ім бралі ўдзел больш за 4000 серакоўцаў і 11-12 тысяч сувораўцаў. Агульныя страты склалі звыш 1000 ваяроў, з іх больш за 700 – расійцы.

Пра выключную ролю Крупчыцкай бітвы ў лёсе паўстання сведчыць жаданне Тадэвуша Касцюшкі ўласнай асобай ўзначаліць сілы паміж Кобрынам і Берасцем. Нават пасля таго як расійцы захапілі Берасце, Найвышэйшы Начальнік імкнуўся выбіць сувораўцаў з горада над Бугам. Аднак вестка пра пераход Віслы войскамі Івана Ферзена прымусіла Касцюшку адмовіцца ад намеру даць новы бой пад Берасцем.

Слова “Крупчыцы” жыло ў свядомасці нашага славутага земляка. Населены пункт месціўся недалёка ад Касцюшкавых Сяхновічаў, а ў 1758 годзе, амаль за сорак гадоў да паўстання, крупчыцкія манахі адпявалі цела палкоўніка Людвіка Касцюшкі-Сяхновіцкага – бацькі Тадэвуша.

Слова “Крупчыцы” месцілася і ў падсвядомасці генерала. Праз дваццаць дзён пасля Крупчыцкай бітвы на лісце да Станіслава Макраноўскага рука Касцюшкі міжвольна вывела: *“Дня 7 кастрычніка, у лагеры пад Крупчыцамі”…*

Галоўную ролю ў бітве адыгралі паўстанцкія артылерыя і кавалерыя, асабліва 4-ы полк літоўскай пярэдняй варты, які традыцыйна фарміраваўся з татараў. Усталяваную ў беларускай гістарыяграфіі думку наконт удзелу ў баі значнай колькасці паўстанцаў-касінераў лічым недарэчнасцю. Менавіта рэгулярныя, спрактыкаваныя ў вайсковай справе жаўнеры сталі галоўнымі дзейнымі асобамі бітвы 17 верасня.

Падзеі паўстання, і ў прыватнасці баі пад Крупчыцамі і Берасцем, у чарговы раз выявілі, што для беларусаў 1794 год набыў рысы грамадзянскай вайны, паколькі нашыя суайчыннікі змагаліся па абодвух баках барыкад. Асаблівае ўражанне пакідае вобраз егераў Беларускага корпусу, што першымі па багнах пачалі самазабойчую атаку на цэнтр дывізіі Серакоўскага, каб адцягнуць увагу ад манёўра на флангах. У папулярных працах беларускіх гісторыкаў канца XX стагоддзя сцвярджалася, што касцяк корпусу быў набраны ў 1780-х гадах у

Беларускім генерал-губернатарстве. Гэтым егерам у немалой ступені супрацьстаялі паўстанцы-беларусы.

Мы крытычна перагледзілі дадзеныя рапартаў Аляксандра Суворава і ягоных военачальнікаў, асабліва ў той частцы, якая тычылася колькасці праціўніка. З аднаго боку, расійскі палкаводзец паверыў дэзінфармацыі, распаўсюджанай паўстанцамі, з другога, няўдачна спрацавала ягоная выведка. Нарэшце, сам Сувораў лічыў магчымым распаўсюджваць неправераныя дадзеныя, каб трактаваць Крупчыцкую бітву як уласны поспех.

Страты расійцаў пад Крупчыцамі і Тэрэспалем былі настолькі значнымі, а стома сярод іх настолькі адчувальнаю, што Аляксандр Сувораў быў вымушаны на цэлы месяц спыніцца ў Берасці.

Тым не менш, паход суворауцаў пад Кобрын і Берасце прадвызначыў ліквідацыю паўстанцкага супраціву на землях Вялікага Княства Літоўскага. Аднак Крупчыцкую бітву нельга аднабока трактаваць як перамогу Суворава і паразу серакоўцаў. Насуперак распаўсюджанай думцы, іх процістаянне, па сутнасці, скончылася ўнічыю. Тут напрошваецца аналогія з вядомай Барадзінскай бітвай 1812 года, якую нельга лічыць перамогаю французаў ці расійцаў: адыход М. Кутузава пасля Барадзіна і нават страта расійцамі Масквы не прынеслі канчатковай перамогі французам, а пазнейшыя падзеі ўвогуле перакрэслілі ўсе перавагі, атрыманыя Напалеонам. Гэтак жа і адступленне паўстанцаў з-пад Крупчыцаў яшчэ ні пра што не сведчыла, бо Караль Серакоўскі захаваў цалкам баяздольныя вайсковыя фарміраванні. Праўда, маральная перавага ўсё ж аказалася на баку ягонага праціўніка.

Вынікі бою ў нейкай ступені разбураюць вобраз Суворава як палкаводца, што заўсёды змагаўся “не чыслом, а ўменнем” і быццам бы атрымаў “60 перамог у 60 бітвах”. Усім сваім перавагам пад Крупчыцамі расійскі генерал абавязаны выключна таму, што ягонае войска было ўтрая большае за паўстанчае.

Крупчыцкая бітва мела агульгістарычнае значэнне. Яна паўплывала не толькі на вынік усяго збройнага чыну, але і на доўгія стагоддзі вызначыла лёсы цэлых краін і народаў.

# ЧАСТКА V

## 1701 – 1864 гады
## КАРМЯЛІЦКІ КЛЯШТАР

Паколькі бітва 17 верасня 1794 года адбывалася побач з Крупчыцкім кармеліцкім кляштарам, яна атрымала назву Крупчыцкай. Аднак каталіцкі манастыр зрабіў гэтыя мясціны вядомымі задоўга да сутыкнення войскаў Серакоўскага і Суворава. На працягу XVIII стагоддзя паселішча Крупчыцы неаднаразова трапляла на еўрапейскія мапы [224].

У дакументах кляштар часам называўся Нелаевіцкім (узнік на землях маёнтка Нелаевічы) [225]. У гэтых мясцінах ордэн кармелітаў з’явіўся, верагодна, яшчэ ў сярэдзіне XVII стагоддзя [226]. У лісце, датаваным 24 сакавіка 1676 года, ужо згадваюцца “крупчыцкія кармеліты”. Аднак кляштарныя пабудовы ўзніклі толькі пасля 1683 года, калі зямянін Андрэй Асоўскі, уладар блізкага маёнтка Нелаевічы-Чыжэўшчына, падараваў манахам надзелы для пабудовы манастыра [227]. Пазней апекаваліся будоўляй берасцейскія кашталяны Нестаровічы. З’яўляючыся адначасова дзяржаўцамі навакольных земляў, яны былі зацікаўленыя ў заснаванні кляштара і касцёла ў Крупчыцах. 14 мая 1699 года Ян Пётр Нестаровіч разам з жонкаю Кацярынаю з Вольскіх Нестаровічавай накіравалі на разгляд луцка-берасцейскага біскупа фундуш на права забудовы наваколля Крупчыцаў культавымі будынкамі. У пачатку кастрычніка дазвол на будаўніцтва драўлянага кармеліцкага кляштара плошчаю 300 м$^2$ быў атрыманы. Двухпавярховы Крупчыцкі манастыр меў каменны падмурак. Даўжыня яго склала прыблізна 15 метраў, шырыня – 7 з паловай метраў. Будынак часткова пакрылі гонтай, часткова саломаю (напярэдадні Крупчыцкай бітвы кляштар быў перакрыты чарапіцай).

Да 1701-1702 гадоў работы ў асноўным былі завершаныя. 5 мая 1701 года крупчыцкія кармеліты атрымалі ў дар фальварак Нелаевічы, а ў красавіку 1714 года Нестаровічы дадалі да земляў, якімі ўжо валодалі манахі, вёску Чыжэўшчына і фальварак Багданы. Такім чынам, ужо ў першай чвэрці XVIII стагоддзя кляштар у Крупчыцах стаў прыкметным землеўладальнікам на захадзе Берасцейскага ваяводства.

У архітэктурны комплекс, акрамя кляштара, уваходзіў таксама крупчыцкі касцёл (плошчаю прыблізна 300 м$^2$), узведзены зноў жа дбаннем Нестаровічаў [228]. Зроблены з дрэва, на каменным падмурку, ён меў у даўжыню 17,5 метры, а ў шырыню – каля 13 метраў. У 1729 годзе

крупчыцкі касцёл быў асвечаны хелмскім біскупам-суфраганам, атрымаўшы імя Нявіннага Зачацця Прасвятой Дзевы Марыі. Улетку 1800 года гэтыя мясціны наведаў віленскі біскуп Ян Непамуцэн Капакоўскі. Скарыстаўшыся выпадкам, Нестаровічы дамагліся ад яго ператварэння касцёла ў парафіяльны (прыхадскі). Крупчыцкім кармелітам належалі некалькі капліц, найбуйнейшая з якіх знаходзілася ў вёсцы Азяты. Пры Азяцкай капліцы пад 1724 годам згадваецца "ўласная казна", створаная берасцейскім падстоліем Янам Нестаровічам. Гэтыя сродкі ішлі на ўтрыманне шпіталя – прытулку для жабракоў, сляпых і бяздомных. У 1736 годзе ягоны сваяк Міхал Нестаровіч, чашнік берасцейскі ды староста азяцкі, ізноў адпісалі ахвяру на шпіталь [229].

Цягам усяго XVIII стагоддзя крупчыцкія кармеліты атрымлівалі ад тутэйшай шляхты грошы і пацверджанні на ўсё новыя зямельныя ўладанні. У 1732 годзе Даніла Нестаровіч перадаў манахам аблігацыі коштам у 2000 злотых, а у 1728 годзе берасцейскі кашталян Ян Пётр Нестаровіч абавязаў кармелітаў штодзённа звяртацца да Багародзіцы ў малітвах за паноў-заснавальнікаў. У тым самым годзе Міхал Нестаровіч ахвяраваў 1000 злотых на ўсталяванне ў касцёле аргана, а пазней дадаў яшчэ 2000 злотых. У 1737 годзе паны Нестаровічы на нейкі тэрмін павінныя былі перадаць у заклад манахам маёнтак Ківаверты-Хадасы. Наступнай вясной састарэлая Маргарыта з Фядзюшкаў Непакойчыцкая падаравала Крупчыцкаму касцёлу 2000 злотых, каб заснаваць пры ім брацтва святога Юзафа. Восенню 1747 года князь Восіп Шуйскі запісаў кармелітам яшчэ 4000 злотых, забяспечаных ягоным маёнткам Рыкавічы. Ахвяраванні ішлі і ў пазнейшыя часы.

Да 1960-х гадоў у Крупчыцах існавалі вялікія каталіцкія могілкі, на якіх знайшлі свой апошні прытулак каля тысячы нябожчыкаў, галоўным чынам – шляхта. У пярыяд паміж 1702 і 1818 гадамі кармеліцкімі святарамі былі ахрышчаныя 1659 дзяцей. У другой палове XVIII стагоддзя за манастырскімі сценамі жылі 14 братоў-мніхаў, узначальваў прыход прыюр.

Пасля Крупчыцкай бітвы кляштар і касцёл набылі сусветную вядомасць як месца, звязанае з самымі напружаннымі момантамі бою. У час бітвы паўстанцы, што замацаваліся за іх сценамі, былі выбітыя адтуль рускімі казакамі. Пры гэтым былі пашкоджаныя і манастырскія пабудовы.

Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай Крупчыцы апынуліся ў складзе Расійскай імперыі. Указам імператара Паўла І кляштар быў перададзены з Луцка-Берасцейскай у Віленскую каталіцкую дыяцэзію. Кармеліты адкрылі ў Крупчыцах духоўную школу, якая з 1803 года перайшла пад апеку Віленскага універсітэта. Кляштарная бібліятэка, што

складалася з 278 тамоў на лацінскай і польскай мовах, дазваляла праводзіць заняткі па тэалогіі, гісторыі, філасофіі і г.д. У кармеліцкай школе ў 1817 навучальным годзе займаліся сем хлопчыкаў-сірот, настаўнікам якіх быў манах-кармеліт. Але ўжо ў 30-ыя гады XIX стагоддзя будынак бібліятэкі пры кляштары быў прыстасаваны пад хлеў, што яскрава сведчыла пра заняпад духоўнасці і асветы не толькі ў Крупчыцах, але і на ўсёй Беларусі, далучанай да Расійскай імперыі.

Інвентар 1835 года дазваляе скласці ўяўленне пра кляштар і касцёл апошніх гадоў іх дзейнасці. На пачатку XIX стагоддзя купал касцёла абнавілі: пакрылі бляхай, усталявалі чатыры крыжы. Выдатнымі дасягненнямі мясцовых разьбяроў па дрэве быў крупчыцкі арган, амбон і восем алтароў. Усе алтары мелі дастатковую колькасць ліхтароў са свечкамі. Пры выкананні інтэр'ераў выкарыстоўваліся золата і серабро. На пачэсных месцах пры алтарах знаходзіліся абразы святых і царкоўныя рэліквіі (у тым ліку абразок, знойдзены на месцы Крупчыцкай бітвы). Перад франтонам касцёла месцілася мураваная званіца з падвойнымі дзвярыма на жалезных завесах, з двух бакоў аддзеленная агароджай ад пабудоў кляштара.

Уезд у манастыр ажыццяўляўся цераз вялікую браму. У двухпавярховым будынку знаходзіліся памяшканні для манахаў – келлі. Пад кляштарам існавалі вінныя і піўныя склепы. Апошнія папаўняліся півам з бровара, што месціўся на ўскрайку Нелаевіцкага фальварка (за тры вярсты ад Крупчыцаў, над ракой Трасцяніцай).

З гаспадарчых пабудоў у інвентары згадваюцца стайня і вазоўня, падноўленыя ў 1834 годзе, хлеў у выглядзе літары "L", побач з якім месціўся млын, перанесены з фальварка. Кляштар у гэты перыяд валодаў толькі 12 валокамі ворыва (прыкладна 256 гектарамі). Яму належалі 17 сялянскіх сядзібаў (26 сем'яў) [230].

Пасля жорсткага падаўлення паўстанняў 1830-1831 і 1863-1864 гадоў царскі ўрад узмацніў рэпрэсіі супраць каталіцкага насельніцтва Беларусі. Пачалося масавае закрыццё каталіцкіх храмаў. У 1832 годзе прыпыніў сваю дзейнасць Крупчыцкі кляштар. Апошнім прыёрам тут быў айцец Баніфацы Вілімовіч, у якога пад началам заставаліся толькі восем манахаў.

Касцёл у Крупчыцах праіснаваў яшчэ колькі дзесяцігоддзяў, пасля чаго быў ператвораны ў праваслаўную царкву [231].

### 1866 – 1882 гады
## АЛЯКСАНДРАНЕЎСКАЯ ЦАРКВА

У 1864-1866 гадах, пасля падаўлення паўстання Кастуся Каліноўскага, узмоцніўся ціск на каталіцкую царкву, у выніку шматлікія храмы, якія належалі рымска-каталіцкаму касцёлу, пазачыняліся, а астатнія былі абкладзеныя непамернымі падаткамі.

Крупчыцкі прыходскі касцёл ў 1864 годзе таксама прыпыніў дзейнасць, ягоныя землі былі перададзеныя ў казну. Апошнім настаяцелем (з 1862 года) быў ксёндз Адольф Ануфрыевіч Тамкевіч.

3 верасня (22 жніўня) 1866 года [232] кобрынскі прыстаў Чарнецкі спецыяльна аглядаў былую кляштарную маёмасць: цагляны будынак на 20 келляў, драўляныя багадзельня, флігель і сарай [233].

У 1866 годзе колішні касцёл быў перароблены ў праваслаўную царкву [234], асвечаную 25 (12) лістапада 1867 года ў гонар "абаронцы рускага воінства ды ратнай справы" святога князя Аляксандра Неўскага (як бачым, памяць пра Крупчыцкую бітву заставалася вельмі моцнай). Абрад здзейсніў ураджэнец блізкай вёскі Вялікія Сяхновічы берасцейскі епіскап Ігнацій Жалязоўскі [235].

У 1874 годзе пасля агляду храма адмысловая камісія засведчыла, што царква *"драўляная 27х16х12 аршынаў, умяшчае 480 чалавек, у сценах трывалая, калі пабудавана – невядома"* [236]. Крупчыцкі прыход складалі 703 прыхаджаніны з вёсак Мышчыцы, Багданы, Рыкавічы і Чыжэўшчына.

22 (9) верасня 1882 года ў 6 гадзін вечара ў Крупчыцах здарыўся пажар. За некалькі гадзін вёска была вынішчаная амаль ушчэнт, згарэла і драўляная Аляксандранеўская царква. Эпіцэнтрам пажару стаў сенавал, які належаў святару [237]. На працягу амаль года Крупчыцаў літаральна не існавала [238].

### 1899 – 1900 гады
## ЛЕГЕНДЫ КРУПЧЫЦКАГА ПОЛЯ

Зімой 1899/1900 года капітан 2-га Брэст-Літоўскага крапаснога батальёна Філіп Харкевіч, наведаўшы Крупчыцы і навакольныя вёскі, падрабязна распытваў мясцовых сялян пра Крупчыцкую бітву. Часцей за ўсё "ўспаміны" з'ўляліся сямейнымі паданнямі, паколькі ніхто з сялян не мог быць сведкам падзеяў больш чым стогадовай даўніны. Аднак тутэйшыя легенды, безумоўна, захоўвалі пэўную інфармацыю, якую часам немагчыма адшукаць у афіцыйных дакументах. "Успаміны" сялян таксама сведчылі пра моцную гістарычную памяць, якая ў гэтых мясцінах звязвалася з падзеямі 17 верасня 1794 года.

Усяго капітан Харкевіч апытаў 19 сялян [239] з вёсак Перкі, Пескі, Сухоўчыцы, Азяты, Мышчыцы, Старое Сяло, Хадасы, Крупчыцы, Рыкавічы і Чыжэўшчына ва ўзросце ад 40 да 83 гадоў [240]. Акрамя сялян з капітанам вялі бяседы неназваны па імені памешчык з-пад Жабінкі [241] і заснавальнік Крупчыцкага храма-помніка святар Міканор Катовіч.

Асаблівую цікавасць выклікаюць звесткі, звязаныя з ушанаваннем палеглых на Крупчыцкіх палях, а таксама знаходкі вайсковых рэчаў. Са сведчанняў, сабраных Ф. Харкевічам, вымалёўваецца даволі зладжаная карціна [242].

Каленік Загонскі, сухоўчыцкі селянін: *"Мой дзед расказваў, што незадоўга да Крупчыцкай бітвы народ усё пагаворваў пра хуткую вайну. Напярэдадні... у нас было ўсё спакойна. Раптам раніцай у дзень бітвы ўсе палі паміж вёскамі Пескі і Перкі былі занятыя рускімі войскамі".*

Дзяніс Ахрымук: *"... калі рускія прыпыніліся ў вёсцы Перкі, там быў забіты адзін з кіраўнікоў, якога Суворaў загадаў адразу прыбраць, а сам сядзеў на камені і маліўся Богу. Тут яму генералы даклалі, што ўжо многа войска пабіта і прыйшоў час пачынаць бітву, а ён, не пераставаючы маліцца, адказаў ім, што яшчэ нельга пачынаць – трэба пачакаць, пакуль не скончыцца абедня, а тады пачнем і паб'ём палякаў".*

Пётр Літвінюк (Хадасы): *"Я быў яшчэ хлопчыкам. У нас кватараваў паляк, удзельнік Крупчыцкай бітвы, узяты рускімі ў палон. Ён часта расказваў майму бацьку пра тую вайну. Палякі стаялі за ракою ў калонах. Рускую конніцу адвёў на Чаравачыцы, Савіцк, урочышча Вілы, Філіпавічы, Бусні і Крупчыцы нейкі паляк-вартаўнік".* Іншыя сяляне называлі яго шляхціцам, лесніком, згадваючы прозвішча Андраноўскі.

Сцяпан Шыганскі з Рыкавічаў: *"Я чуў ад бацькі і маці ды іншых старых, што ў Крупчыцкую вайну руская конніца з адной гарматай перайшла Трасцяніцу ў Вілах. Там у мінулым* (1898-ым. – А.Б.) *годзе, калі капалі канаву, знайшлі цэлы слой жэрдак, пасланых упоперак балота. Дубовыя жордкі добра захаваліся, астатнія – гніль".*

Перкаўскі селянін Трафім Бадзюк згадваў, *"што некалькі рускіх афіцэраў пахаваныя ў канцы нашай вёскі на зямлі Давіда Газукі, які памёр гадоў 40 назад і таксама мне тое гаварыў. Раней там было поле, а цяпер маленькі сад таго самага гаспадара. Параненых рускіх адвозілі ў Кобрын. Найбольшая колькасць іх была параненая на гары паміж нашай вёскай і Трасцяніцай. Тут, распавядалі, стаялі рускія гарматы. Сам яшчэ памятаю, як стаяў крыж на зямлі Арцёма Бабурчыка, дзе знаходзіцца тая самая гара".*

Сам А. Бабурчык дадаваў: “*Пахаваныя палякі часткаю на пагорку ля гаці, часткаю на ўзвышшы па дарозе да фальварка Янопаль, дзе цяпер стаіць капліца памешчыка Відацкага. На маёй зямлі некалі стаяў старажытны крыж, падпёрты трыма камянямі. Паколькі крыж збуцвеў, я прыбраў яго гадоў 40 назад, таксама прыбраў і камяні. Крыж стаяў за паўвярсты ад гаці... Мне старыя казалі, што на ўзвышшы за Трасцяніцаю быў пахаваны рускі палкоўнік, забіты ў Крупчыцкую вайну. Там таксама стаяў рускі* (праваслаўны. – А.Б.) *крыж, пафарбаваны чорнаю фарбай. Гадоў 35 назад ён зваліўся... У былыя часы мы шмат знаходзілі снарадаў і асколкаў на пагорку, дзе стаяў крыж, падпёрты камянямі*”.

Пра вайсковыя знаходкі згадвалі многія з апытаных. Лука Курыга з Хадасоў казаў: “*Калі я быў хлопчыкам, часта пасвіў жывёлу каля Перкаў. Адна бабуля з той вёскі неаднойчы гаварыла мне, што ў Перках пры гасцінцы стаяў крыж, які бачыў і я. Яна распавядала, што ў гэтым месцы, калі аралі палі, траплялiся людскія косткі, верагодна, з Крупчыцкай вайны... Нашыя сяляне найбольш снарадаў і асколкаў знаходзілі на пагорку перад Трасцяніцкай грэбляй і ў стаўках каля яе.*”

Філіп Барташук успамінаў, што ягоны дзед “*чуў, як палякі пакідалі свае скрыні ў ставок каля грэблі*”. Якаў Чырок дадаваў: “*Ксяндзы з Крупчыцкага манастыра, калі купаліся ў ставе, гаварылі, што там нешта кінута палякамі, але дастаць немагчыма, паколькі рэчы зацягнула цінаю і пяском. Найбольш усялякіх снарадаў знаходзілі каля грэблі, часта выцягвалі іх нератам*”.

Павел Пашычук з Рыкавічаў (сёння ў складзе Чыжэўшчыны) таксама сведчыў пра цікавыя знаходкі: “*Найбольш куляў і снарадаў мы знаходзілі паміж кляштарам і ракою, каля Краснагоркі і нашай вёскі не знаходзілі, паколькі тут, гаварылі старыя, сутычкі не было. Біліся рускія з палякамі за кляштарам, на палях ля вёскі Чыжэўшчына і па дарозе на Янопаль*” [243].

Асобную цікавасць у капітана Харкевіча выклікала сведчанне Нестара Паўлючука з Мышчыцаў пра месцы пахавання ўдзельнікаў бою: “*Гадоў 40 таму на пясках паміж Крупчыцамі і Янопалем з іншымі рабочымі я будаваў капліцу. На гэтым месцы былі пахаваныя польскія жаўнеры, забітыя ў Крупчыцкай бітве*”. А Іван Сірацюк з Чыжэўшчыны дадаваў: “*Забітыя пахаваныя на тым месцы, дзе цяпер стаіць капліца памешчыка* (Відацкага. – А.Б.). *Каля грэблі цераз Трасцяніцу гадоў 50 таму былі створаныя вайсковыя могілкі, на якіх хавалі салдат з лазарэта ў Крупчыцах. Цяпер гэтыя могілкі зараслі хвояй. Яшчэ да адкрыцця могілак там стаяў чорны рускі крыж*”.

Набыўшы ў рыкавіцкіх, хадасоўскіх і перкаўскіх сялян рэчы, якія адносіліся да часоў Крупчыцкага бою, капітан Харкевіч стварыў невялічкую калекцыю з двух гранат, пяці ядраў, трох карцечаў і некалькіх асколкаў. Апошні, з кім ён меў размову, стаў крупчыцкі святар Міканор Катовіч. Надзвычай актыўны настаяцель, які паўжыцця прысвяціў сваёму храму, засведчыў: *"На царкоўных палях, што паміж ракой Трасцяніцай і былым Крупчыцкім кляштарам, пры мне было знойдзена некалькі круглых куляў, два ядры і маленькі медзяны абразок. Гэтыя рэчы захоўваюцца ў Крупчыцкай царкве* [244]. *У дзень асвячэння тут новага храма я склаў і раздаў сялянам невялікую брашуру якая напамін пра важную гістарычную падзею, што адбылася 6 верасня 1794 года на Крупчыцкіх палях"*.

Менавіта айцу Міканору было наканавана адрадзіць Крупчыцкую царкву, знішчаную страшэнным пажарам 1882 года.

## 1891 – 1894 гады
## ХРАМ-ПОМНІК

26 (13) кастрычніка 1882 года, праз месяц пасля пажару ў Крупчыцах і наваколлі, складанне каштарыса і праекта на новую царкву было даручанае малодшаму архітэктару А. Рэмеру. 1 снежня (18 лістапада) ён разам з настаяцелем крупчыцкага прыхода айцом Яўстафіем Маркевічам аглядаў нанесеныя агнём страты і спусташенні і выявіў наступнае. Былая драўляная царква, перароблена з касцёла, з алтаром у паўночным баку, стаяла на каменным падмурку. Падвал раней служыў для пахаванняў (захаваліся некалькі каталіцкіх дамавінаў). З усходняга боку амаль ушчыльную да згарэлай царквы знаходзіліся рэшткі кляштара, прададзеныя з таргоў. У зямлі былі сводчатыя сутарэнні, ацалела таксама пашкоджаная каменная званіца. Навокал знаходзіліся старадаўнія пахаванні, у асноўным – паўразбураныя. З абодвух бакоў вуліцы, што цягнулася ад царквы, стаяла старая цагляная агароджа [245].

З-за хваробы і частых раз'ездаў па іншых справах А. Рэмера толькі ў лютым 1884 года перадаў Гродзенскаму царкоўна-будаўнічаму ўпраўленню замоўленыя дакументы на пабудову новай Крупчыцкай царквы, разлічанай на 375 прыхаджан.

Увосень 1884 года пасля чарговай праверкі справы былі перададзеныя малодшаму архітэктару Залатарову, які, перагледзеўшы каштарыс, павялічыў неабходную суму да 25 тысяч рублёў. Дазвол на пачатак будаўніцтва быў атрыманы ад Міністэрства ўнутраных спраў толькі летам 1886 года. Але і тады закладка першага каменя ўсё адкладалася. Сяляне з суседніх вёсак – Мышчыцаў, Багданоў, Рыкавічаў, Чыжэўшчыны – (усяго 400 вернікаў), як адзначаў мясцовы святар,

*"вымушаныя былі бадзяцца па чужых прыходах для выканання хрысціянскага доўгу"*. Усе найважнейшыя царкоўныя святы яны праводзілі дома ці ў карчме, сярод п'янага разгулу. Самыя сяляне казалі, *"што без царквы яны і Бога забудуць"* [246].

У 1883 годзе пасля смерці Я. Маркевіча на крупчыцкую кафедру быў абраны айцец Міканор Катовіч (1845-1938), для якога бітва пад Крупчыцамі была знітаваная з сямейнымі паданнямі. *"У Чаравачыцах, дзе ў старажытнасці існаваў мост праз Мухавец, былі святарамі мае бацька, дзед і прадзед,* – пазней згадваў М. Катовіч. – *Мой прадзед, святар Пётр Катовіч, у час пераходу Суворава праз Мухавец атрымаў ад яго ўзнагароду"* [247]. Менавіта айцу Міканору належала ідэя ператварыць новую царкву ў храм-помнік рускім воінам, што загінулі на Крупчыцкім полі. Сябра духоўнай кансісторыі пратаерэй Іаан Катовіч (родны брат крупчыцкага настаяцеля) заўважаў, што айцец Міканор *"як на асаблівую прычыну для пабудовы ў с. Крупчыцах новай... царквы лічыць патрэбным указаць на тое, што гэта месца гістарычнае, палітаее крывёю рускіх воінаў, з якім звязаныя ўспамін пра бліскучую і важную па сваіх выніках перамогу, атрыманую тут рускімі войскамі пад асабістым кіраўніцтвам фельдмаршала Суворава над польскімі войскамі Серакоўскага"* [248].

Настаяцель як мага прыспешваў пачатак работ. І калі высветлілася, што не хапае патрэбнага матэрыялу, паведаміў начальніку губерні А.М. Пацёмкіну пра падмурак былога кляштара [249]: *"каля сяла Крупчыцы зусім няма камянёў, прыдатных для будоўлі"*, але за 15 крокаў ад месца, дзе планавалася новая царква, *"захаваўся неразбураны падмурак былога велізарнага двухпавярховага манастырскага будынка ў 40 аршынаў даўжыні і 20 аршынаў шырыні, з масіўнымі ўнутранымі перагародкамі"*. Паводле паведамлення айца Міканора, тут была *"агромністая маса булыжнага каменя"*, выкарыстанага пры будаўніцтве замест каменнага друзу. Так пад шуфлямі і кіркамі рабочых у лістападзе-снежні 1888 года знікла большая частка рэшткаў некалі багатага кляштара ў Крупчыцах [250].

У студзені наступнага года Міканор Катовіч ездзіў у Вялікія Якаўчыцы, Пруск, Бабры, Вежкі і іншыя вёскі, каб дамовіцца з сялянамі аб продажы неабходнага для царквы каменя. У выніку ў Крупчыцы былі прывезеныя 50 кубічных сажаняў камення, прыдатнага для пабудовы падмурка (дзеля гэтага на два тыдні нават была прыпыненая дастаўка матэрыялу на будоўлю Маскоўска-Брэсцкай шашы). Малодшы памочнік кобрынскага павятовага спраўніка Ф.Ф. Рынейскага ў гэты час пабываў у вёсцы Азяты і дамовіўся з памешчыкам К.Ю. Выганоўскім пра выраб на ягонай цагельні неабходнай колькасці цэглы. Адначасова айцец Міканор

адшукаў вёсцы Гутава купца Майсея Піманава, які ў лютым 1890 года згадзіўся пачаць узвядзенне Крупчыцкай царквы.

Пры афармленні ўнутранага ўбранства, вырабе іканастаса і алтара былі выкарыстаныя работы лепшых пецярбуржскіх дойлідаў Жубера і Бенуа. Крупчыцкі храм стаў копияй імператарскай царквы ў Белавежы: яны былі выкананыя па адным праекце [251].

19 (6) жніўня 1891 года ў прысутнасці вялікай колькасці прыхаджан і святароў быў урачыста закладзены першы камень у падмурак храма, названага ў гонар князя Уладзіміра, хрысціцеля Русі. (Хаця сярод тутэйшых жыхароў царква атрымала назоў "Сувораўскай") [252]. Асвячэнне храма-помніка было прымеркаванае да сотых угодкаў Крупчыцкай бітвы (верасень 1894 года). Напярэдадні айцец Міканор склаў і раздаў сялянам невялікую брашуру, у якой згадваў пра *"значную гістарычную падзею"*, што адбылася каля Крупчыцаў. У дзень асвячэння настаяцель адслужыў абедню і ганаровую паніхіду па Аляксандры Суvoраве *"з абвяшчэннем вечнай памяці яму і ўсім загінулым у Крупчыцкім баі праваслаўным воінам"* [253].

Сам святар амаль паўстагоддзя служыў у царкве, пабудаванай ягонымі клопатамі. Збіраў рэчы і сродкі, у тым ліку *"прыхаджане, што эміgравалі ў Амерыку, успомнілі на далёкай чужыне пра свой родны храм і сабралі на яго ўпрыгожванне амаль 1000 даляраў"*, кожныя 4-5 гадоў царква рамантавалася.

У 1913 годзе на царкве з'явілася шыльда: *"Генералісімусу Сувораву ў памяць слаўнай перамогі яго 6 верасня 1794 года над войскамі польскага генерала Серакоўскага на тутэйшых Крупчыцкіх палях ад размешчаных ў Кобрыне, Картуз-Бярозе і Брэст-Літоўску – 149 Чарнаморскага, 150 Таманскага, 151 Пяцігорскага і 152 Уладзікаўказскага палкоў 38-ай пяхотнай дывізіі"* [254].

Улетку наступнага года пачалася Першая сусветная вайны, якая прынесла храму-помніку велізарныя страты. *"Усе найбольш каштоўныя рэчы, эвакуяваныя ў Расію,* – успамінаў пазней Міканор Катовіч, – *там і зніклі. Менш каштоўныя, якія заставаліся ў царкве, былі разрабаваныя. Ацалела толькі тое, што я разам з царкоўным старастам у апошнюю ноч перад ад'ездам у бежанскія блуканні пад гром гармат і пры свеце зарыва пажараў закапалі ў зямлю на могілках"* [255]. У купале царквы немцы стварылі назіральны пункт, павыбівалі там усе вокны, дах у многіх месцах быў прастрэлены кулямі. У 20-я і 30-я гады царква рамантавалася, а ў 1960 годзе была ператвораная ў калгаснае сховішча. І толькі на пачатку 90-х мінулага стагоддзя, калі пераслед рэлігіі прыпыніўся, прыгожы каменны храм у колішніх Крупчыцах быў адноўлены і адчыніўся для службаў [256].

## 2004 год
# КРУПЧЫЦКАЯ КАПЛІЦА

У 1993 годзе з’явілася ідэя ўшанавання ахвяраў Крупчыцкай бітвы. Спачатку планавалася проста паставіць у Чыжэўшчыне памятны камень, аднак у 1997 года было вырашана аддаць належную даніну павагі продкам, што змагаліся “За нашу і вашу свабоду“, і на месцы пахавання, акрамя закладкі каменя, узвесці мемарыяльную капліцу. Падставаю для гэтага рашэння стаў факт існавання на Крупчыцкіх каталіцкіх могілках драўлянай капліцы, знішчанай у гады Вялікай Айчыннай вайны. Самая ідэя паходзіла ад спецыяліста па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Л.М. Несцерчука. 23 снежня 1993 года кіраўніцтву Брэсцкага абласнога Савета народных дэпутатаў і выканаўчага камітэта ад імя грамадскасці быў накіраваны ліст з прапановаю стварыць на Берасцейшчыне аргкамітэт па падрыхтоўцы да святкавання 200-годдзя паўстання і 250-х угодкаў з дня нараджэння Тадэвуша Касцюшкі. Сярод шматлікіх мерапрыемстваў планавалася грунтоўнае абследаванне Крупчыцкага поля бітвы і ўсталяванне абеліска ў памяць пра палеглых [257].

Пасля заснавання напрыканцы 1994 года Брэсцкага абласнога Фонду Т. Касцюшкі ідэя пабудовы помніка на Крупчыцкім полі атрымала далейшае развіццё. Ужо 6 студзеня 1995 года быў накіраваны зварот на адрас Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь [258].

На месцы пахавання воінаў-касінераў прапаноўвалася ўсталяваць мемарыяльны камень-валун з наступным тэкстам: *“Паўстанцам-касінерам, загінуўшым у бітве на Крупчыцкім полі 6-га верасня 1794 г. у часы паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Нашчадкі 1996 г.”* Праз год на месцы пахавання вырашылі ўзвесці капліцу, і ўжо 7 лістапада 1998 года быў заліты яе падмурак. Адначасова па даручэнні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь была распрацаваная і зацверджаная дзяржаўная Праграма стварэння ў краіне помнікаў манументальнага мастацтва. Сярод 17 аб’ектаў, якія планавалася ўзвесці на Берасцейшчыне, значылася і “мемарыяльная капліца на Крупчыцкіх палях” [259].

Аднак мінула яшчэ пяць гадоў, пакуль ў цэнтры сучаснай вёскі Чыжэўшчына Жабінкаўскага раёна з’явілася годная памятка, прысвечаная падзеям 17 верасня 1794 года.

Праз 210 гадоў пасля бітвы – каля апоўдня 23 верасня 2004 года была адкрытая і ганарова асвечаная Крупчыцкая капліца, створаная па праекце жабінкаўскага архітэктара Сцяпана Кандрацюка [260]. У мерапрыемстве бралі ўдзел кіраўнікі Брэсцкай вобласці і Жабінкаўскага

раёна, консул Генеральнага консульства Польшчы ў Берасце, прадстаўнікі працоўных калектываў, навучэнцы школ раёна [261].

На плітах гранітнай піраміды, змешчанай ў цэнтры капліцы, пазначаныя палкі Серакоўскага і Суворава, што біліся на Крупчыцкім Вялікім полі. На задняй пліце пад выяваю Божай Маці выбітыя радкі з верша Расціслава Бензерука "Канец легенды" [262]:

*Памолімся: хай Бог грахі даруе*
*І тым, хто па-геройску лёг у бітве,*
*І тым, хто ісціну па-свойму перайначваў,*
*І ўсім, хто сёння на зямлі жыве!*

У сучаснасці Крупчыцкая мемарыяльная капліца пакрысе становіцца візітнай карткай Жабінкаўшчыны [263].

## 23 верасня 2004 года
## "СХІЛІЦЕ ГАЛОВЫ НА КРУПЧЫЦКІМ ПОЛІ"

23 верасня 2004 года — в. Чыжэўшчына, Жабінкаўскі раён
11.00 – 11.32

*Каля 11 гадзін раніцы побач з мемарыяльнай Крупчыцкай капліцай прызыўна гучаць фанфары, якія абвяшчаюць пачатак цырыманіялу адкрыцця мемарыяльнай капліцы ў памяць загінулых у Крупчыцкай бітве 1794 года. Госці мерапрыемства падыходзяць да капліцы. Гучыць мелодыя паланеза, якая раптоўна абрываецца. Ёй на змену прыходзіць нарастаючы грукат барабанаў. Трывожная, бы спалох бліскавіцы, нота гучыць як фон вершаваным словам з Караткевічавых "Каласоў пад сярпом тваім", што прамаўляюць* В я д у ч а я і В я д у ч ы.

*Вядучая.* Чым угнявіла Ты Бога? І чым раззлавала,
Што над табою, яшчэ не апетай і сотняю строф,
Маятнік часу ўпаў, і касцельная цемра настала,
Цемра прабітых далоняў і тысяч няправых галгоф?

*Вядучы.* Хто адабраў тваю памяць, зямля дарагая,
Што, на працягу вякоў, забываючы мукі свае,
Лепшых паэтаў сваіх забыццём ты смяротным караеш,
Лепшых прарокаў каменнем няведання б'еш?

*Вядучая.* У бітвах скрываўлена, каб чалавецтва ўваскрэсла,
Каб на палетках ягоных калоссі свабоды ўзышлі!

*Усплеск музыкі, сярод якой дамінуе тэма паланеза.*

*Дыктар 1.* 17 верасня 1794 года на гэтым месцы адбылася самая значная на беларускіх землях бітва часоў паўстання, узначаленага нацыянальным героем Беларусі, Польшчы і Злучаных Штатаў Амерыкі Андрэем Тадэвушам Банавентурай Касцюшкам, ад роду – Сяхновіцкім.

*Вядучы.* Роўна 210 гадоў назад у вялікай бітве на Вялікім Крупчыцкім полі зышліся ў крывавай сечы палкі.

*Вядучая.* 16 тысяч адважных ваяроў з абодвух бакоў вялі пад сваімі ўладнымі далонямі ў немінучае супрацьстаянне егенралы Караль Серакоўскі ды Аляксандр Сувораў.

*Вядучы.* Гэтыя падзеі сталі ўжо часткаю сусветнай гісторыі. Бо тут вырашаўся лёс усёй нашай краіны, усёй Еўропы, у сэрцы якой жыла і жыве дагэтуль Беларусь – славутая зямля пад белымі крыламі.

*Разам.* Ёй – слава, кветкі ў дараванен, нялёгкі і патрэбны ўспамін!

*Узмацненне музычнага фону бітвы.*

*Дыктар 1.* Зліліся шэрагі, злучыліся страі.
І з вуснаў вырваўся раптоўны крык:
Прызыў-праклён да ворагаў сваіх…

*Дыктар 2.* …Чаканне спорага крывавага спаткання,
Пасля якога застаюцца зданні
Ад некалі жывых…

*Дыктар 1.* І раптам цішыня абрынулася з неба.
Працята ёю была гэта глеба,
Гатовая прыняць ў сябе байцоў…

*Дыктар 2.* І Богу памаліліся яны,
Схіліўшы долу галавы свае.

*Дыктар 1.* Адзначыў ранак цішыні хвіліну…

*Дыктар 2.* А потым – бой прыйшоў у адначассе.
І загудзела наваколле,

Нібыта вулей дзікіх пчол,
Разораны нязграбнаю рукой.

*Усплеск музыкі.*

*Дыктар 1.* Успыхнулі лясы, лугі, бы свечы.
Схіснуліся адразу ваяры.
На дыбу ўзышлі вялікай сечы.
І мір вайною стаўся пакалечан…
І ўстаў знявечаны, прастрэлены Усход.
А супраць – Захад, ранены карцеччу…

*Фонавая музыка рэзка абрываецца.*
*Пасля паўзы зноў нараджаецца ціхая лірычная мелодыя.*

*Дыктар 2.* Дзень існякаў, як вільгаць ў рацэ,
Як прыгаршні вады ў тваёй руцэ.
І вось ужо прыйшла тая хвіліна,
Калі ўзяла зямля ў абдымкі сына.
Ён перад ёю ўстаў ні на калені…
А целам лёг, прыціснуты агнём,
Што перарваў янгоны стогн і боль.

*Дыктар 1.* Не туманоў чароўны сырадой
Сцяліўся ў гэты час па-над зямлёй,
А дым-смурод, узняты над дрыгвою,
Накрыў раптоўна сэрца маладое.

*Дыктар 2.* І сонца – яркі і гарачы яблык –
Кацілася над гэтаю бядой,
Разбуджанай гарматнаю гульнёй,
казацкай шабляй,
точаным клінком,
крывавай куляй, кінутай у яго…

*Народны вакальны калектыў Жабінкаўскага ГДК “Каларыт”*
*пад кіраўніцтвам Мікалая Зіноўева а капэльна выконвае песню*
*“Было ў салдата два полі” (музыка Э. Ханка, словы А. Вярцінскага).*

*Вядучы.* Дзевяць гадзін цягнулася супрацьстаянне.

Вядучая. Ад світання да змяркання набухалі крывёю берагі Трасцяніцы.

*Вядучы.* А калі патухла дзённае сонца і ўзышоў месяц сярповы, стаміліся іх рукі ад ваеннага жніва… І прыйшлі жанчыны ды манахі, каб узняць забітых, каб загоіць раны знявечаным.

*Выходзяць дзяўчаты са свечкамі, апранутыя ў белыя строі.*

*Дыктар 1.* Увага, мірны наш народ!
Хвіліны славы робяць ход!

*Ад натоўпу дзяўчат аддзяляюцца тры.*

*Дзяўчына 1.* Славутыя ваяры беларускіх харугваў, з'яднаныя ў імя Свабоды! У мужным парыве баранілі Вы сваю зямлю. Пакрыжаваліся Вашыя шаблі з сялянскімі косамі. І быў між вамі люд вясковы, прызвычаены болей да звычаёвай працы. Але ж у часіну небяспекі падняліся яны з каленяў, каб бараніць свае хлебныя палі на Крупчыцкім вайсковым полі… Слава Вам навечна!

*Дзяўчына 2 (па-польску).* Жолнежэ Арміі Короннэй! Станенлісьце на Крупчыцкім полю, бы сточыць буй о вольносьць, цалосьць і неподлеглосьць Ойчызны. Дзісяй взывам Вас до апелю! Чэсьць Вашэй паменці!

*Дзяўчына 3 (па-руску).* В бесчисленных сражениях поднимали Вы победные знамёна. За храбрость, силу и отчаянный манёвр звали Вас «чудо-богатырями». Всюду, где несли Вы свободу, цветами встречали Вас народы. Здесь же, под Крупчицами и Брестом, невольно послужили Вы орудием угнетения… Но сгинувшим на поле брани, мы возвращаем позабытую память. Слава погибшим бойцам!

*Гучыць музычны пройгрыш.*

*Дыктар 1.* Дзвесце гадоў Крупчыцкая бітва была паўзабытаю старонкаю нашай гісторыі. Нават назвы такой геаграфічнай – Крупчыцы – ужо не існуе ў Беларусі. Але ёсць такая назва гістарычная – Крупчыцы, навечна занесеная ў скрыжалі гісторыі.

*Дыктар 2.* Сёння мы прыйшлі на Крупчыцкае поле, каб абудзіць сваю памяць і надаць пачэсную даніну салдатам 1794 года.

*Дыктар 1.* Сёлета, у 210-ую гадавіну бітвы на Вялікім Крупчыцкім полі, у сённяшняй вёсцы Чыжэўшчына адкрываецца мемарыяльная капліца ва ўшанаванне памяці памёрлых у славуты дзень 17 верасня.

*Дыктар 2.* Слова надаецца старшыні Жабінкаўскага раённага выканаўчага камітэта Мікалаю Токару.

*Выступленне* [265].

*Дыктар 1.* Слова бярэ намеснік старшыні Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта Леанід Цупрык.

*Выступленне* [266].

*Дыктар 2.* Права перарэзаць сімвалічную стужку і адкрыць мемарыяльную капліцу надаецца намесніку старшыні аблвыканкама Леаніду Аляксандравічу Цупрыку і старшыні райвыканкама Мікалаю Васільевічу Токару.

*Названыя асобы падымаюцца*
*па ступенях і пераразаюць стужку.*

*Дыктар 1.* Слова прамаўляе консул Генеральнага консульства Рэспублікі Польшча ў Брэсце Аліна Чарняўская.

*Выступленне.*

*Дыктар 2.* Згодна воінскім традыцыям слова бярэ ваенны камісар раёна палкоўнік Сяргей Мікалаевіч Ненартовіч.

*Пасля выступу ваенкома воіны роты*
*ганаровага каравула 38-й асобнай мабільнай брыгады*
*ўскладаюць герлянду з жывога ядлоўца да помніка.*
*Тройчы наваколле абуджаюць аўтаматныя стрэл.*

*Дыктар 1.* Хвіліна маўчання настае!

*Гучыць метраном, выступоўцы з карзінамі кветак падымаюцца*
*па ступенях капліцы і становяць іх каля пірамiды ўнутры капліцы.*

*Дыктар 1.* Памолімся: хай Бог грахі даруе
І тым, хто па-геройску лёг у бітве,
І тым, хто ісціну па-свойму перайначваў,

І ўсім, хто сёння на зямлі жыве!

*Дыктар 2.* У шэрагах ваяроў 1794 года былі ўсіх хрысціянскіх канфесій. Сённяшні наш цырыманіял прызваны прымірыць іх душы паміж сабою. І нашую памяць перад гісторыяй. Каб больш ніколі насенне варожасці не ўзрасло на гэтым полі. Каб больш ніколі не было вайны!..

*Дыктар 1.* Асвячэнне Крупчыцкай мемарыяльнай капліцы праводзіць настаяцель Свята-Уладзімірскага храма ў вёсцы Чыжэўшчына айцец Анатоль.

*Адбываецца абрад асвячэння.*

*Дыктар 2 (пад гукі фанфар).* Схіліце галовы на Крупчыцкім полі!
І кветкі, сарваныя шчодрай рукою,
Нясіце ў дарунак байцам,
Што славу здабылі сабе на вякі
На Крупчыцкім полі – на воінскім полі,
На Крупчыцкім полі, дзе кветкі ўзыйшлі.

*Мерапрыемства завяршаецца ўскладаннем кветак да Крупчыцкага помніка-капліцы.*

# Крыніцы і каментарыі


1. Падлічана па: *Ілюстраваная храналогія* гісторыі Беларусі: Ад старажытнасці да пачатку XX ст. – Ч. 1. С. 66-136. Нельга не згадзіцца з меркаваннем беларускага даследчыка Міколы Ермаловіча: "Гісторыя Беларусі – гэта найперш гісторыя войнаў, пры гэтым самых крывавых і разбуральных. Цяжка пералічыць іх з-за вялікай колькасці на нашай зямлі" (*Ермаловіч М.* Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае. – Мн., 2000. – С. 376). Таму прыведзеная намі лічба – вельмі прыблізная, але і яна яскрава характарызуе надта выразныя суадносіны: на кожны год міру прыходзіўся адзін нямірны год, і гэта пры тым, што ВКЛ перыядычна заключала з праціўнікамі так званыя "вечныя міры" (іх "вечнасці" хапала зусім ненадоўга).
2. Гл., напрыклад, пералік літаратуры пры артыкуле: *Пасэ У.С.* Вялікая Айчынная вайна 1941-45 // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі (далей – *ЭГБ*). – Мн., 1994. – Т. 2. С. 434-435. Практычна адзіным выключэннем з'яўляецца абарона Брэсцкай крэпасці 1941 года, якую нездарма называлі "легендарнай" – вакол гэтых падзеяў было створана так многа міфаў, што часам бывае цяжка адрозніць сапраўдныя факты ад цалкам прыдуманых, якія не маюць аніякага дачынення да сапраўднасці. Разам з тым, трэба заўважыць: упершыню подзвіг Брэсцкай крэпасці ўславілі расійскія даследчыкі. Вузлавыя моманты роднай гісторыі беларускім гісторыкам распрацоўваць "не рэкамендавалася".
3. *Wawrzeniecki M.* Racławice. Rozumowy opis przebiegu bitwy 4 IV 1794 r. – W-wa, 1906; *Bartoszewicz K.* Kościuszko i Racławice. – Kr., 1917; *Lubicz-Pachoński J.* Bitwa pod Racławicami. – W-wa, Kr., 1987.
4. *Kukiel M.* Maciejowice. – Kr., 1929; *Mikuła W.* Maciejowice 1794. – W-wa, 1991.
5. Адказ Суворава варшавянам, што прыйшлі прасіць у расійскага палкаводца міру пасля крывавага захопу Прагі, быў вельмі паказальны: *"З Польшчаю ў нас вайны няма!"* Такім чынам, фельдмаршал разглядаў свой паход супраць Рэчы Паспалітай менавіта як карную экспедыцыю (*Бензярук А.* "Ура! Варшава наша!" Гібель Рэчы Паспалітай // Радавод (Брэст). – 1998. – № 2. – С. 15).
6. *Бобровский П.* Материалы для географии и статистики России. Гродненская губерния. – СПб., 1863. – Ч. 2. С. 928.
7. Военная энциклопедия. – Петербург, 1914. – Т. 14. С. 324.
8. *Бантыш-Каменский Д.* Биографии российских генералиссимусов и генерал-фельдмаршалов. Репринт. воспроизведение издания 1840 года. – В 4-х ч. – М., 1991. – Ч. 2. С. 133. На падставе дакументаў, выяўленых у Расійскім дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве, Яўген Анішчанка сцвярджаве, што Кацярына II за бітвы пад Берасцем шчодра ўзнагародзіла і іншых сувораўцаў: генерал Павел Пацёмкін атрымаў крыж Аляксандра Неўскага з дыяментавай зоркай, Георгій Шэвіч, Пётр Ісленьеў і Іван Ісаеў – крыжы 3-га класа з ордэнамі Георгія Пабеданосца. Брыгадзіру Юрыю Паліванаву царыца дaравала залатую шпагу, Фёдару Буксгеўдэну – ордэн па чыну і маёнтак у Рэвельскай губерні, князю Мікалаю Шахаўскому непасрэдна за Крупчыцы – ордэн святога Уладзіміра са стужкай. Сувораў прасіў адзначыць яшчэ 82 чалавек, у тым ліку 1 палкоўніка, 4 падпалкоўнікаў, 18 маёраў, 6 капітанаў, 17 паручнікаў, 16 сяржантаў, 16 карнетаў і кадэтаў (*Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. Імем Айчыны: Дакументы паўстання 1794 г. у Літоўскай правінцыі. – Мн., 2004. – С. 7-9).
9. *Энгельгардт Л.Н.* Записки. 1766 – 1836. – М., 1867. – С. 171-172.

10. *Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции (по документам архивов Москвы и Минска) / Сост., ред. и предисл. Е.К. Анищенко. – Мн., 2001. – С. 170. *А.В. Сувораў – П.А. Румянцаву. 16-17. (5-6).09. 1794 г. На маршы.*
11. Згадку пра 16000 серакоўцаў гл. напрыклад: *Швед В.В.* Падзеі і постаці Гродзенскай даўніны. – Гродна, 1995. – С. 20. Увогуле, імкненне палкаводцаў у сваіх рэляцыях шматкроць павялічваць страты ворага і адначасова як мага змяншаць колькасць сваіх забітых і параненых – з'ява тыповая не толькі для XVIII і XIX стагоддзяў. Б.Ц. Урланіс справядліва заўважаў: "Умовы ваеннага часу мала спрыяльныя для атрымання поўных статыстычных звестак". Гэты даследчык прыводзіў таксама выслоўе Напалеона "хлусня, як у ваенным бюлетэні", якое каментаваў прыкладам з пачатку XVIII стагоддзя: французскі маршал герцаг дэ Війяр у сваёй справаздачы пра бітву з 3000-ай арміяй праціўніка, сцвярджаў, што варожыя страты склалі 4000 чалавек. Калі сакратар звярнуў увагу маршала на яўную неадпаведнасць лічбаў, той загадаў зменшыць колькасць страт праціўніка да 2500 чалавек (*Урланис Б.Ц.* История военных потерь. Войны и народонаселение Европы. – СПб., 1994. – С. 28).
12. *Харкевич Ф.К.* Розыски на Суворовских полях сражений // Варшавский военный журнал. – 1900. – №№ 2, 3, 4; *Его же.* О памятниках на брестском Суворовском поле сражения. – Брест, 1902; *Альбом Суворовских полей* сражений. – Издание редакции "Варшавского военного журнала". – 1900. У прадмове да публікацыі запісак В.Ф. Харкевіча рэдакцыя, побач з вельмі каштоўнымі дадзенымі, часам падавала зусім неверагодныя. Так, напрыклад, сцвярджалася, што на крупчыцкіх каталіцкіх могілках, "*удалечы ад сваёй славутай радзімы знайшоў вечны спакой міністр Францыі, віноўнік ліпеньскай рэвалюцыі 1830 года, герцаг Паліньяк*", а ніжэй гаворка ішла пра 20-тысячны (!!!) корпус К. Серакоўскага, які нібыта напярэдадні бою схаваўся "*за сценамі* (!) *Крупчыцкага манастыра*" Зразумела, што такая астранамічная колькасць ваяроў не магла там змясціцца (*Харкевич Ф.К.* Розыски на Суворовских полях сражений // Варшавский военный журнал. – 1900. – № 2. – С. 115, 116). Цяпер публіцысты часцей гавораць больш памяркоўна пра 20 тысяч воінаў з абодвух бакоў, якія бралі ўдзел у бітве пад Крупчыцамі (*Міршчына М.* Пад ахоўвай Маці Божай і Святой Ганны... // Маладосць. – 2007. – № 11. – С. 130).
13. Цыт. па: Запісы капітана Ф. Харкевіча // *Памяць:* Гіст.-дакум. Хроніка *Жабінк. р-на.* (далей – *Памяць... Жабінк. р-на*) – Мн., 1999. – С. 79.
14. *Красный архив.* – 1940. – № 4. – С.159-164; *Фельдмаршал Румянцев.* Сб. док-тов и материалов.– М., 1947. – С.316-346; *Суворов А.В.* Документы. – М., 1952. – Т. 3. С. 343-402; *Его же.* Письма / Изд. подг. В.С. Лопатин. – М., 1987. – С. 267-280; *Его же.* Походы и сражения в письмах и записках. – М., 1990. – С. 353-357. Складальнік апошняга зборніка А.Л. Сірын, двойчы згадаўшы, што паміж 3 і 8 верасня (старога стылю) А.В. Сувораў "атрымаў чатыры перамогі", дэталёва не разбіраючы гэтыя падзеі, толькі канстатаваў: "Гэтыя баі ўяўляюць вялікую цікавасць з пункту погляду развіцця тактыкі".
15. *Zenowicz Despot M.* Kampania oddziału wojsk polskich pod generałem Sierakowskim w roku 1794 // Pamiętniki wojenne 1792-1812. – Drezno, 1871; *Tegoż.* Opis kompanii wojska polskiego pod jenerałem Sierakowskim 1794 r. // Biblioteka Polska w Paryżu, rkps 48, s. 8.
16. *„Kościuszko 1893 – 1896”* / Pod red. T.B. Otrębskiego. Wydanie nowe uzupełnione. – Kr., 1994. – S. 184-185.
17. *Bartoszewicz K.* Dzieje insurekcji kościuszkowskiej. / Reprint z wydania wiedeńskiego 1909 roku. – Poznań, 2002. – S. 341.

18. Праца А. Хланеўскага вызначалася асаблівай неахайнасцю: “*Затрымаць паход Суварава* (sic!) *Касцюшка даручыў генералу Юзафу* (?) *Серакоўскаму з дывізіяй у 5000 чалавек. Пад вёскай Крупчыцы за мілю ад Кобрына 16* (?) *верасня адбылася сустрэча двух войскаў. Заняўшы абарончую пазіцыю, Серакоўскі, нягледзячы на няроўнасць сіл, на працягу сямігадзіннай бітвы паклаў трупамі 3000 расійскіх салдат... і адступіў за Буг, упэўнены, што знясілены Сувараў* (?!) *не будзе яго праследаваць. Пралічыўся. Праз два дні пад Тэрэспалем страціў 1000 чалавек, усе гарматы (у лічбе 28) і быў рассеяны*” (*Chłonewski A.* Tadeusz Kościuszko. – Lwów, 1902. – S. 110).
19. *Śmiałowski E.* Tadeusz Kościuszko. Jego życie i czyny. – Kr., 1891. – S. 55.
20. *„Kościuszko 1893 – 1896”*. – S. 185.
21. *Korzon T.* Kościszko, biografia z dokumentów wysnuta. – Wyd. 2. – Kr., W-wa, [1906]. – S. 423-424. Падрабязней пра Сяхновічы і пра спрэчкі вакол пытання радзімы генерала Тадэвуша Касцюшкі гл.: *Бензярук А.Р.* Касцюшкі-Сяхновіцкія: Гісторыя старадаўняга роду. – Брэст, 2006. – С. 61-70.
22. Гл.: *Korzon T.* Wewnętrzne dzieje Polski za Stanisława Augusta. – Wyd. 2. – Kr., W-wa, 1898. – S. 205-359.
23. *Śliwiński A.* Powstanie Kościuszkowskie. – W-wa, 2004. – S. 149-151.
24. *Akty powstania Kościuszki* / Wyd. S. Askenazy i W. Dzwonkowski. – Kr., 1918. – T. 1-2. Выданне працягнута наступным пакаленнем польскіх гісторыкаў. Гл.: *Akty powstania Kościuszki* / Wyd. W. Dzwonkowski, E. Kipa, R. Morcinek. – Wrocław, 1955 – T. 3.
25. *Herbst S.* Z dziejów powstania kościuszkowskiego 1794. – W-wa, 1983. – S. 343-382. Пасля смерці С. Хербста манаграфія шырока выкарыстоўваліся, у тым ліку у выданні *Powstanie kościuszkowskie 1794*. Dzieje militarnie / Red. T. Rawski. – W-wa, 1996. – T. 2. S. 3-14, 17-23, 72-82, 104-109, 118-128, 166-179. Часткова праца была перакладзеная на рускую мову: *Хербст С.* Восстание Костюшко на Полесье. Крупчицкая битва // Гістарычная брама. – 2004. – № 1. – С. 7-16.
26. *Majewski W.* Litwa 1794. Działania wojenne kwiecień – sierpień // Powstanie 1794 roku. Dzieje i tradycja / Red. H. Szwankowska. – W-wa, 1996. – S. 70-86.
27. *Sulek Z.* Działania wojenne dywizii gen. mjr. Karola Sierakowskiego // *Powstanie kościuszkowskie 1794*. Dzieje militarnie. – T. 2. S. 436.
28. *Powstanie kościuszkowskie 1794*. Dzieje militarnie. – T. 1-2.
29. *Herbst S.* Krupczyce – grobla Terespolska // *Ibidem*. – T. 2. S. 166-179.
30. *Szyndler B.* Tadeusz Kościuszko. 1746-1817. – S. 375, przyp. 48.
31. *Ibidem*. – S. 250-251.
32. *Szyndler B.* Powstanie kościuszkowskie 1794. – W-wa, 1994. – S. 308-320.
33. *Біч М. і інш.* Гістарыяграфія гісторыі Беларусі // *ЭГБ*. – Мн., 1996. – Т. 3. С. 19.
34. *Гісторыі Беларускай ССР*. – У 5-ці тамах. – Мн., 1972. – Т. 1. С. 446.
35. Баявым шляхам // Белар. мінуўшчына. – 1994. – № 1. – С. 16. Яшчэ раней гэта сцвярджалася ў даведніку “Брэст” (*Брест*. Энциклопедический справочник. – Мн., 1987. – С. 346) і ў артыкуле Анатоля Грыцкевіча (*Грыцкевіч А.* Паўстанне 1794 г.: перадумовы, ход і вынікі // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994. – № 1. – С. 46). Памылка магла ўзнікнуць таму, што паміж 1959 і 1966 гадамі землі Чыжэўшчыны (колішніх Крупчыцаў) сапраўды знаходзіліся ў складзе Кобрынскага раёна. Акрамя таго, яшчэ раней, у XIX стагоддзі яны адносіліся да Кобрынскага павета Гродзенскай губерні.
36. Аднак змешчаныя ў экспазіцыі дадзеныя стэндаў часам дрэнна стасуюцца паміж сабою. Так, у табліцы “Победы, одержанные русской армией под командованием Суворова в Польском походе 1794 г.” у першых двух калонках

наступным чынам паказаны суадносіны сілаў: 1) *Крупчыцы*: у палякаў 5000 чалавек і 26 гармат; у рускіх 8500 чалавек і 39 гармат; 2) *Брэст*: у палякаў 4640 чалавек і 28 гармат; у рускіх 4500 чалавек і 10 гармат. Аднак трэцяя і чацвёртая калонкі табліцы ўжо сведчаць пра іншае: у абодвух бітвах палякі быццам страцілі 3000 чалавек і 28 гармат, а руская – толькі 614 чалавек і ніводнай гарматы! Адзначым, што гэтыя дадзеныя пэўным чынам супярэчаць міфалагізаванаму вобразу А. Суворава як палкаводца, што "баталій не прайграваў", атрымаўшы "60 перамог ў 60 бітвах і ніводнае паразы" (*Суворов А.В.* Походы и сражения в письмах и записках. – М., 1990. – С. 3). А тут выходзіць, што К. Серакоўскі пад Крупчыцамі страціў усяго 360 ваяроў, а А. Сувораў паклаў ажно 4000 байцоў, згубіўшы амаль тры чвэрці сваёй артылерыі! Няменш фантастычнай выглядае інфармацыя, змешчаная на суседнім стэндзе, названым "Бой при монастыре Крупчицы 17/6 сентября 1794 г." Сілы паўстанцаў быццам складаліся з 3500 пехацінцаў, 4500 коннікаў, 26 гармат. Ім супрацьстаялі 8500 рускіх (з іх 3000 вершнікаў), якія мелі толькі 18 гармат. Калі першая табліца сведчыць пра значную перавагу расійцаў у жывой сіле, дык табліца № 2 гэтыя сілы амаль "ураўнівае": паводле яе, 8500 суворацам супрацьстаялі 8000 серакоўцаў, прычым колькасць расійскіх гармат раптам зменшылася больш чым удвая. У сваю чаргу, табліца № 3 "Бой при Брест-Литовском 19 (8) сентября 1794 года" быццам пацвярджае дадзеныя, прыведзеныя ў табліцы № 1, аднак і тут не сыходзіцца колькасць гармат, якімі дыспанаваў А. Сувораў у Тэрэспальскай бітве: 2700 пяхоты, 1940 конніцы і 26 гармат войска Рэчы Паспалітай супраць 1500 пяхоты, 3000 конніцы і 6 палявых гармат у расійцаў.

37. *Пліско Н.М.* Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А.В. Суворава = Кобринский военно-исторический музей имени А.В. Суворава. – Мн., 1990. – С. 50, 51, 53.
38. *Тамсама.* – С. 54.
39. *Грыцкевіч А.П. і інш.* Вялікае княства Літоўскае // *ЭГБ.* – Т. 2. С. 401. Аднак ужо праз пяць гадоў у 5-ым томе энцыклапедыі Анатоль Грыцкевіч сцвярджаў (таксама памылкова), што Караль Князевіч браў удзел у бітве пад Тэрэспалем (*Грыцкевіч А.* Паўстанне 1794 // *ЭГБ.* – Мн., 1999. – Т. 5. С. 447). Памылка наконт удзелу атрада Князевіча ў Крупчыцкім баі налічвае ўжо звыш 30 гадоў. Упершыню А.П. Грыцкевіч дапусціў яе ў 1975 годзе, потым паўтарыў у 1978-1979 гадах (гл.: *Грыцкевіч А.П.* Паўстанне 1794 // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. – Мн., 1975. – Т. 8. С. 349; *Яго ж.* Паўстанне 1794 // Беларуская ССР: кароткая энцыклапедыя. – Мн., 1978. – Т. 1. С. 547; *Его же.* Восстание 1794 // Белорусская ССР: Краткая Энциклопедия. – Мн., 1979. – Т. 1. С. 162).
40. *Пліско Н.М.* Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А.В. Суворава. – С. 46-48, 50. У іншай працы, выдадзенай Нінай Пліско сумесна з Львом Казловым, нават сцвярджалася, што бой ля Крупчыцкага манастыра цягнуўся два дні (5 і 6 верасня па старым стылі), а праваруч ад шашы Кобрын – Брэст (відаць, маецца на ўвазе магістраль Брэст – Мінск?) перад паваротам да санаторыя "Буг" (прыпынак "Сасновы Бор") "*дасюль захавалася некалькі ўзвышшаў, якія ўзняліся над брацкімі магіламі загінулых*" (*Плиско Н.М, Козлов Л.Р.* Кобрин: Ист.-экон. очерк. – Мн., 1987. – С. 22). Пра двухдзённы (!) Тэрэспальскі бой расказвае Вячаслаў Швед: "*17 верасня* (Серакоўскі. – А.Б.) *пацярпеў паражэнне ад Суворава пад в. Крупчыцы, а 18-19 верасня – пад Брэстам, каля в. в. Коршын і Добрын*" (*Швед В.В.* Падзеі і постаці Гродзенскай даўніны. – С. 111).

41. *Грыгор’еў М.* Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765-1794). – Мн., 1994. – С. 73-74.
42. *Емяльянчык У.* Паланез для касінераў: (З падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі на Беларусі). – Мн., 1994. – С. 113-114; *Юхо Я., Емяльянчык У.* “Нарадзіўся я ліцьвінам...”: Тадэвуш Касцюшка. – Мн., 1994. – С. 46.
43. *Емяльянчык У.* Крупчыцкі бой 1794 // Беларусь: Энцыклапедычны даведнік. – Мн., 1995. – С. 403; *Яго ж.* Крупчыцкі бой 1794 // *ЭГБ.* – Мн., 1997. – Т. 4. С. 266; *Яго ж.* Крупчыцкі бой 1794 // Беларуская энцыклапедыя. – У 18 т. – Мн., 1999. – Т. 8. С. 488. Прычым, рыхтуючы да друку згаданыя артыкулы, даследчык ужо значна зменшыў колькасць ахвяраў, даводзячы, што *“ў час бою абодва бакі страцілі каля 300 чал. забітымі і параненымі”.*
44. *Гісторыя Беларусі.* –У 6 т.– Мн., 2004. – Т. 3. С. 255-256.
45. *Гісторыя Беларусі* / А.Л. Абецэдарская, П.І. Брыгадзін, Л.А. Жылуновіч і інш.; Пад рэд. А.Г. Каханоўскага і інш. – Мн., 1996. – С. 170.
46. *Гісторыя Беларусі:* Білеты ў пытаннях і адказах: 9 клас / Аўт.-склад.: П.А. Лойка і інш.; Пад рэд. А.Г. Каханоўскага, А.А. Яноўскага. – Мн., 2004. – С. 94
47. Гл.: *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 164-170. *К. Серакоўскі – Т. Касцюшку. 22.09. 1794 г. Макотуў.* Акрамя гэтага зборніка свет пабачылі і іншыя: *Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции*:* (по документам российских архивов) / Сост., ред. Е.К. Анищенко. – М., 2000; *Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции*:* (по документам архивов Москвы и Минска) / Сост., ред. Е.К. Анищенко. – Мн., 2001; *Стогн:* Паўстанне і вайна 1794 года ў Літоўскай правінцыі / Саст., рэд. Я.К. Анішчанка. – Мн., 2002; *Анішчанка Я.К.* Збор твораў. – У 6-ці т. – Т. 1. Камісары Касцюшкі: Дакументы паўстання 1794 г. у Літоўскай правінцыі. – Мн., 2004.
48. Калі сярод гісторыкаў няма разыходжанняў у напісанні назвы Крупчыцкага бою, дык падзеі 19 верасня 1794 года завуць то Берасцейскай, то Коршынскай, то Тэрэспальскай (Цярэспальскай) бітвай. Назву апошняга населенага пункта нават адны і тыя ж даследчыкі (А.П. Грыцкевіч, У.П. Емяльянчык) у сваіх працах падаюць варыятыўна: калі Тэрэспаль, калі Цярэспаль.
49. *Несцярчук Л.М.*: Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка: Вяртанне героя на радзіму. – Мн., 2006. – 101-102, 104-106, 183-184, 224-226.
50. Нават сёння беларускія перыядычныя выданні нярэдка памылкова цвердзяць, што Тадэвуш Касцюшка непасрэдна браў удзел у справе пад Крупчыцамі, *“дзе яго палкі былі разбітыя, і генерал трапіў у палон”* (*Арлова І.* Найярчэйшая // Народная газета. – 2006. – 14 студз.). Відавочна, аўтар пераблытала Крупчыцкі бой з Мацяёвіцкім (10 кастрычніка), у якім, сапраўды, удзельнічаў кіраўнік паўстання.
51. *Бензярук А.* Крупчыцкі бой: Ва ўспамінах удзельнікаў і памяці нашчадкаў // Белар. мінуўшчына. – 1994. – № 1. – С. 21-23; *Яго ж.* Наш край – Жабінкаўшчына. – Брэст, 1996. – С. 49; *Яго ж.* Памяць нашае зямлі. – Брэст, 2002. – С. 15; *Памяць... Жабінк. р-на.* – С. 79-81.
52. *Харкевич Ф.К.* Розыски на Суворовских полях сражений // Варшавский военный журнал. – 1900. – № 3. – С. 226, 229. *С. Шыганскі і Е. Каршук. 1899/1900 г. Рыкавічы, Старое Сяло.*
53. *Majewski W.* Litwa 1794. Działania wojenne kwiecień – sierpień // Powstanie 1794 roku. Dzieje i tradycja. – S. 70-71; *Sulek Z.* Sprzysiężenie Jakuba Jasińskiego. – S. 136-145.

54. *Энгельгардт Л. Н.* Записки. – С. 153-154; *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 212-214.
55. *Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции. – С. 46. *М.В. Рапнін – В.Х. Дэрфельдэну. 6.05. (26.04). 1794 г.*
56. *Емяльянчык У.* Паланез для касінераў. – С. 68. Тут заўважым, што К.Н. Сапега быў ураджэнцам Берасця.
57. *Żuraw J.* Filozofia oświeceniowa Tadeusza Kościuszki. – S. 151.
58. *Szyndler B.* Powstanie kościuszkowskie 1794. – S. 276.
59. *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T .2. S. 73-82.
60. *Szyndler B.* Powstanie kościuszkowskie 1794. – C. 308.
61. Цыт. па: *Korzon T.* Wewnętrzne dzieje Polski za Stanisława Augusta. – T. 6. S. 212. *М. Вяльгорскі – К. Серакоўскаму. 8.08. 1794 г. Лейпуны.*
62. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 119-120. *Т. Касцюшка – К. Серакоўскаму. 9.08.1794 г. Макотуў.*
63. *Skałkowski A.* Jan Henryk Dąbrowski (1755-1818). – W-wa, 1904. – S. 310; *Herbst S.* Z dziejów wojskowych powstania kościuszkowskiego 1794 roku. – W-wa, 1983. – S. 343.
64. *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. S. 73.
65. *Korzon T.* Wewnętrzne dzieje Polski za Stanisława Augusta. – T. 6. S. 205-206.
66. *Szyndler B.* Powstanie kościuszkowskie 1794. – S. 311.
67. *Gazeta Rządowa.* – 1794. – 8 sierp. – № 38. – S. 152.
68. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т.2. С. 113. *Т. Касцюшка – К. Серакоўскаму. 5.08. 1794 г. Макотуў.*
69. *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. S. 78. Вайсковая хітрасць серакоўцаў, як выявілася, была разгаданая даволі хутка, і расійцы, з лёгкасцю захапіўшыя Слонім, нават не спрабавалі праследаваць дывізію Караля Серакоўскага.
70. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 113-114. *Т. Касцюшка – К. Серакоўскаму. 7.08. 1794 г. Макотуў.*
71. Цыт. па: *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. – S. 80. *К. Серакоўскі – Т. Касцюшку. 10.08. 1794 г.*
72. Каманда Паўла Грабоўскага складалася з двух батальёнаў 5-га літоўскага рэгімента, аднаго батальёна пешай літоўскай гвардыі, а таксама коннай літоўскай гвардыі і 3-га палка літоўскай варты (*Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. S. 81).
73. Заходні бераг ракі быў ніжэйшы, па ім цягнуўся яшчэ адзін – Слонімскі тракт. Менавіта яго К. Серакоўскі скарыстаў, адступаючы з-пад Слоніма ў кірунку Сяльца (*Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. S. 78).
74. *Korzon T.* Wewnętrzne dzieje Polski za Stanisława Augusta. – T. 6. – S. 213.
75. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 119. *Т. Касцюшка – К. Серакоўскаму. 9.08. 1794 г. Макотуў.*
76. *Szyndler B.* Powstanie kościuszkowskie 1794. – S. 312.
77. Цыт. па: *Mościcki H.* Generał Jasiński i powstanie kościuszkowskie. – W-wa, 1917. – S. 276-277.
78. Цыт. па: *Powstanie kościuszkowskie 1794. Dzieje militarnie.* – T. 2. S. 80-81.
79. Гл. падрабязней пра так званы "літоўскі сепаратызм": *Емяльянчык У.* Паланез для касінераў. – С. 16-17 і наступныя.
80. *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. S. 81.
81. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 139. *С. Макраноўскі – К. Серакоўскаму. 28.08. 1794 г. Беласток.* У тым самым лісце Макраноўскі пісаў: "*Пасылаю*

*табе, генерал, копію толькі што атрыманнага загаду Найвышэйшага Начальніка. ... старайся згодна з тым наказам выбраць такую пазіцыю, каб разам сачыць і за маскоўскай калонай і за цэсарскім войскам. Знаю, як цяжка выканаць гэта".* А праз тры дні ўжо і сам Тадэвуш Касцюшка хваліў Серакоўскага за дзеянні, якія супярэчылі ягоным загадам: *"Добра зрабіў, што не пайшоў за Дэрфельдэнам".* Але адразу дадаваў: *"Добра зробіш, калі станеш з гэтага боку Берасця, або ад Варшавы"* (*Тамсама.* – Т. 2. С. 143. *Т. Касцюшка – К. Серакоўскаму. 31.08. 1794 г.*). Перад корпусам Серакоўскага ставіліся занадта вялікія задачы, якія ён проста не мог выканаць, паколькі дзейнічаў супраць значна большых сіл праціўніка.

82. Пры гэтым турэцкія страты былі вельмі значныя. Па звестках Б.Ц. Урланіса, у 34 буйных бітвах з расійцамі і аўстрыякамі ў XVIII стагоддзі туркі згубілі 200000 забітымі і параненымі, а агульныя іх страты за стагоддзе навуковец ацэньваў у 600000 чалавек. (*Урланис Б.Ц.* История военных потерь. – С. 61).
83. *Кутузов М.И.* Письма, записки. – С. 24. *М.І. Кутузаў – А.А. Безбародку. 29 (18).05. 1793 г. Елізаветград.*
84. *Тамсама.* – С. 29. *М.І. Кутузаў – А.С. Хвастову. 20 (9).08. 1793 г. Бухарэст.* У падобных выразах пасол рапартаваў і ўсемагутнаму царскаму фаварыту графу Платону Зубаву: *"Атрыманыя сёння звесткі пра падпісанне трактата паміж Расіяй і Польшчай з саступкаю Расіі на вечныя часы абласцей, безумоўна, супакояць Порту Атаманскую і прымусяць яе да маўчання".* (*Кутузов М.И.* Письма, записки. – С. 29-30. *М.І. Кутузаў – П.А. Зубаву. 20 (9).08. 1793 г. Бухарэст*).
85. *Тамсама.* – С. 31-32. *М.І. Кутузаў – Я.Я. Сіверсу. 23 (12).08. 1793 г. Фаласток.*
86. *Тамсама.* – С. 101, 103. *М.І. Кутузаў – І.П. Салтыкову. 15 (4).05. 1794 г. Бырлад; М.І. Кутузаў – П.А. Румянцаву. 8.06. (29.05). 1794 г. Дубасары.*
87. *Фельдмаршал Румянцев.* Сб. док-тов и м-лов. – С. 319; *Суворов А.В.* Сб. док-тов. – Т. 3. С. 343. *П.А. Румянцаў – А.В. Сувораву. 18 (7).08. 1794 г. Тамань.*
88. Аднак часам Кацярына ІІ дазваляла і значна больш шчырыя выказванні на адрас турэцкага двара. Прыкладам, пасля нараджэння свайго другога ўнука імператрыца пісала: *"Мяне пыталі, хто будзе хросным бацькам. Я адказвала: толькі мой лепшы сябар* (султан. – А.Б.) *Абдул-Хамід можа быць хросным, але паколькі турку нельга хрысціць хрысціяніна, прынамсі, уганаруем яго, назваўшы немаўля Канстанцінам. І ён стаў Канстанцінам, велічынёй з кулак, і ў мяне цяпер па правую руку – Аляксандр, па левую – Канстанцін"* (Цыт. па: *Пчелов Е.В.* Романовы. История династии. – М., 2001. – С. 164).
89. *Фельдмаршал Румянцев.* Сб. док-тов и м-лов. – С. 320-321. *Кацярына ІІ – П.А. Румянцаву. 18 (7).08.1794 г. Царскае Сяло.*
90. *Грыгор'еў М.* Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі. – С. 72. З таго самага поваду Кацярыны бэсціла прускага караля яшчэ з большай нянавісцю, называючы *"паскуднікам без гонару і веры"*, якому *"слава і гонар наўрад ці па імені вядомыя"* (*„Kościuszko 1893 – 1896"*. – S. 175).
91. *Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции. – С. 136. *М.В. Рапнін – А.А. Безбародку. 8.08. (29.07). 1794 г.*
92. *Тамсама.* – С. 143. *М.В. Рапнін – П.А. Зубаву. 1.09. (21.08). 1794 г.*
93. Іншы раз военачальнік адзначаў: *"Цяжкасць тутэйшых справаў у вас вядомая, ... поспех іх залежыць ад узяцця Варшавы са зніштэннем Касцюшкавых сілаў і ад выхаду адсюль Ферзенава корпуса".*
94. *Фельдмаршал Румянцев.* Сб. док-тов и м-лов. – С.325. *П.А. Румянцаў – А.В. Сувораву. 31 (20).08. 1794 г. Тамань.*

95. *Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции. – С. 144. *М.В. Рапнін – А.А. Безбародку. 1.09. (21.08). 1794 г.*
96. *Тамсама.*– С. 144. *М.В. Рапнін – М. Салтыкову. 1.09. (21.08). 1794 г.*
97. Напрыклад, князь Сяргей Галіцын, рапартуючы пра справы, у якіх браў удзел, неяк налічваў "*да дзесяці тысяч усякай сволачы*". Генерал Іван Няплюеў бачыў у паўстанцах "*натоўп прыдуркаватых і прасякнутых буянствам бунтаўшчыкоў спакою і цішыні*", а барон Лявонцій Бенігсен – "*зборышчы бунтаўнікоў*" (*Архив Виленского генерал-губернаторства*, издаваемый Андреем Энгелем. – Вильно, 1870. – Т. 2. Ч. 1. С. 61).
98. *Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции.– С. 143. *М.В. Рапнін – П.А. Зубаву. 1.09. (21.08). 1794 г.* У той самы дзень і амаль у аднолькавых выразах Мікалай Рапнін скардзіўся графу Безбародку: "*Я як раней прызнаваўся вашаму сіяцельству, так і цяпер шчыра паўтараю, што сапраўды галавы маёй не стае да гэтай вялікай справы, а таму лепей было б прыслаць каго іншага на маё месца, больш здольнага, бо я, на няшчасце, не бачу добрага выніку*" (*Тамасама.*– С. 144. *М.В. Рапнін – А.А. Безбародку. 1.09.(21.08). 1794 г.).*
99. *Бензярук А.Р.* Крупчыцкі бой // *Памяць... Жабінк. р-на.* – С. 76.
100. *Суворов А.В.* Сб. док-тов. – Т. 3. С. 343.
101. *Хербст С.* Восстание Костюшко на Полесье. Крупчицкая битва // Гістарычная брама. – 2004. – № 1. – С. 12.
102. *Суворов А.В.* Письма. – С. 271-272. *А.В. Сувораў – Дз. І. Хвастову. 26 (15).07.1794 г. Нямїраў.*
103. *Тамсама.* – С. 274. *А.В. Сувораў – Дз. І. Хвастову. 1.08. (21.07). 1794 г. Няміраў.*
104. *Тамсама.* – С. 275. *А.В. Сувораў – П.А. Румянцаву. 4.08. (24.07). 1794 г. Няміраў.*
105. *Тамсама.* – С. 276. *А.В. Сувораў – І.М. Рыбасу. 17.08. (6.08). 1794 г. Няміраў.*
106. *Емяльянчык У.* Паланез для касінераў. – С. 112.
107. *Суворов А.В.* Письма. – С. 274. *А.В. Сувораў – Дз. І. Хвастову. 4.08. (24.07). 1794 г. Неміраў.*
108. *Тамсама.* – С. 274. *А.В. Сувораў – Кацярыне ІІ. 4.08. (24.07). 1794 г. Неміраў.*
109. *Тамсама.* – С. 275. *А.В. Сувораў – П.А. Румянцаву. 4.08.(24.07). 1794 г. Няміраў.*
110. *Хербст С.* Восстание Костюшко на Полесье. Крупчицкая битва // Гістарычная брама. – 2004. – № 1. – С.12; *Mikuła W.* Maciejowice 1794. – S. 19-20.
111. *Фельдмаршал Румянцев.* Сб. док-тов и м-лов. – С. 325. *П.А. Румянцаў – А.В. Суворову. 31 (20).08. 1794 г. Тамань.*
112. "*Ваша сіяцельства заўсёды былі жахам для палякаў і туркаў, і вы гарыце кожны раз нецярпеннем і руплівасцю, калі толькі справа тычыцца службы*" (*Фельдмаршал Румянцев.* Сб. док-тов и м-лов. – С. 320. *П.А. Румянцаў – А.В. Суворову. 18 (7).08. 1794 г. Тамань).* Цікава, што і праз стагоддзе ва ўспамінах тутэйшых сялян Аляксандр Сувораў успрымаўся як граза палякаў, відаць, гэты вобраз быў узмоцнены так званай "Пражскай разнёй": "*Палякі вельмі цікавіліся, які Сувораў камандуе расійскімі войскамі: ці той, што паклаў многа народу на Каўказе і ў Турцыі, ці ягоны цёзка па прозвішчы? Калі ж даведаліся, што той самы, то сказалі: "Нашая справа цяпер прапала".* (*Харкевич Ф.К.* Розыски на Суворовских полях сражений // Варшавский военный журнал. – 1900. – № 3. – С. 118. *Т. Бадзюк. 1899/1900 г. Перкі*).

113. *Фельдмаршал Румянцев.* Сб. док-тов и м-лов. – С. 319-320. *П.А. Румянцаў – А.В. Сувораву. 18 (7).08.1794 г. Тамань.*

114. Цыт. па: *Емяльянчык У.* Паланез для касінераў. – С. 112. Як паказалі далейшыя падзеі, Сувораў амаль не перабольшваў: паміж часам, калі ён з'явіўся на Беларусі і штурмам Пражскага прадмесця сталіцы Рэчы Паспалітай мінула ўсяго каля двух месяцаў.

115. Цыт. па: *Szyndler B.* Powstanie kościuszkowskie 1794. – S. 315.

116. Цыт. па: *Бантыш-Каменский Д.Н.* Биографии российских генералиссимусов и генерал-фельдмаршалов. – Ч. 2. С. 132. Тэмпы сувораўскіх манёўраў ды адсутнасць нават спробы харчовага забеспячэння арміі прымушалі армію рабаваць і хаваць у вогнішчы сялянскіх хат свае злоўжыванні. Французскі эмігрант А.Ф. Ланжэрон пакінуў цікавыя ўспаміны пра расійскую армію XVIII стагоддзя. Ён лічыў Суворава надзвычай жорскім военачальнікам, які ніколі не клапаціўся пра забеспячэнне войскаў. Пасля падаўлення паўстання Касцюшкі ў шэрагах сувораўцаў было выкрыта каласальнае “казнакрадства”, справа магла скончыцца трыбуналам. Але захопленая поспехамі Суворава Кацярына II даравала фельдмаршалу параскраданыя грошы. (Гл. падрабязней: *Ланжерон А.Ф.* Русская армия в год смерти Екатерины II // Русская старина. – 1895. – Т. 83-84. Кн. 1-12. – С. 147-166).

117. *Суворов А.В.* Сб. док-тов. – Т. 3. С. 343. *А.В. Сувораў – П.А. Румянцаву. 14(25).08. 1794 г. Няміраў.*

118. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 137. *К. Рушчыц – К. Серакоўскаму. Першы рапарт ад 26.08. 1794 г. Кобрын.*

119. *Тамсама.* – Т.2. С. 138. *К. Рушчыц – К. Серакоўскаму. Другі рапарт ад 26.08. 1794 г. Кобрын.* У прыватнасці, Казімір Рушчыц пісаў: “*Калі той чалавек* (інфарматар – А.Б.) *сёння праходзіў праз Кобрын, то я цікавіўся ў яго пра дзеянні непрыяцеля і даведаўся, што ўся калона Дэрфельдэна і Зубава, што стаіць пад Ружанамі, збіраецца ў паход, часткай на Слонім, а часткай праз Бярозу на Берасце. Нават самі маскалі яго надта запэўнівалі, што нападуць на Берасце*”.

120. *Таксама.* – Т. 2. С. 138. *К. Рушчыц – К. Серакоўскаму. 27.08. 1794 г. Кобрын.*

121. *Суворов А.В.* Сб. док-тов. – Т. 3. С. 345-346. *А.В. Сувораў – П.А. Румянцаву. 26 (15).08. 1794 г. Прылукі; 29 (18).08. 1794 г. Беляцкова; 1.09. (21.08). 1794 г. Астрог.*

122. *Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции. – С. 170. *А.В. Сувораў – П.А. Румянцаву. 26 (15).09. 1794 г. Берасце.*

123. *Хербст С.* Восстание Костюшко на Полесье. Крупчицкая битва // Гістарычная брама. – 2004. – № 1. – С. 12.

124. Самога Аркадзя Маркава ў войску не было, ён захварэў (*Mikuła W.* Maciejowice 1794. – S. 20). Дарэчы, даследчыкі нярэдка блытаюць А.І. Маркава з ягоным малодшым братам Іраклієм.

125. С. Хербст, паказаўшы, што з Маларасійскага палка было вылучана ½ батальёна, а са Смаленскага палка – 1 ¼ батальёна, вызначыў лічбу расійскіх войскаў у 13 ¾ батальёна (*Хербст С.* Восстание Костюшко на Полесье. Крупчицкая битва // Гістарычная брама. – 2004. – № 1. – С. 12).

126. Польскія даследчыкі першай паловы XX стагоддзя спыняліся на лічбе ў 11 000 сувораўцаў (*Mościcki H.* Generał Jasiński i powstanie kościuszkowskie. – S. 320), у 1983 годзе С. Хербст на падставе архіўных крыніц вызначаў сілы А. Суворава ў 12000, а Я.К. Анішчанка сцвярджае, што “*знакаміты Аляксандр Сувораў*

*прывёў 13 тысяч штыкоў*" (*Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 6). Крыніцамі для гэтага сталі рапарты расійскіх вайскоўцаў, сучаснікаў згаданых падзей.

127. Т. Корзан адзначаў, што сярод памылковых паведамленняў пра колькасць войска Караля Серакоўскага называлася нават лічба ў 22000 штыкоў (*Korzon T.* Wewnętrzne dzieje Polski za Stanisława Augusta. – T. 6. S. 246).
128. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 148. *К. Рушчыц – К. Серакоўскаму. 10.09. 1794 г. Кобрын.*
129. Пра марш А. Суворава гл. падрабязней: *Петрушевский А.* Генералиссимус князь Суворов. – СПб., 1884.
130. *Mikuła W.* Maciejowice 1794. – S. 21-22.
131. *Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции.– С. 163. *А.В. Сувораў – М.В. Рапніну. 16 (5).09. 1794 г. Кобрын.*
132. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 149. *К. Рушчыц – К. Серакоўскаму. 14.09. 1794 г. Кобрын.*
133. У 1970 годзе В.І. Парфёнаў пісаў: "*На Кобрыншчыне два шматвекавых волата – каля Дзівіна і ў Крупчыцкага поля бітвы, завуцца "Сувораўскімі дубамі". Ці адпачываў пад імі вялікі палкаводзец, ці размяшчаў свой штаб – не мае значэння. Істотна і бясспрэчна, што абодва яны былі сведкамі славы рускай зброі, паблізу ад іх грымела пераможнае рускае «ура»*". (*Памятники природы Белоруссии.* – Мн., 1970. – С. 27). Так званы "Сувораўскі" дуб каля Дзівіна ў 1968 годзе быў абвешчаны помнікам прыроды. Мае ўзрост каля 450 гадоў, вышыню 31-32 метры, дыяметр ствала дасягае 1,5 метра (*Энцыклапедыя прыроды Беларусі.* – У 5-ці т. – Мн.. 1986. – Т. 5. С. 31; *Брест.* Энциклопедический справочник. – Мн., 1987. – С. 294). Аднак тутэйшыя лічаць, што калі Сувораў і адпачываў пад дубам, дык не пад тым, які цяпер звязваецца з ягоным імем.
134. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 141.
135. Дарэчы, цяпер А.В. Сувораў меркаваў, што К. Серакоўскага ажно з 20-цітысячным корпусам чакаюць назаўтра ў Кобрыне.
136. *Петрушевский Д.* Генералиссимус князь Суворов. – С. 54-55.
137. *Szyndler B.* Powstanie kościuszkowskie 1794. – S. 316.
138. *Емяльянчык У.* Паланез для касінераў. – С. 113. Пад началам генерала Караля Князевіча С. Хербст налічыў 690 пехацінцаў і 320 кавалерыстаў, узмоцненых 5 гарматамі (*Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarne. – T. 2. S. 168). 15 верасня К. Князевіч з абозу пад Станіслававам выслаў на імя К. Серакоўскага паведамленне пра марш сваёй пяхотнай калоны ў кірунку Берасця.
139. *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. S. 170. Тадэвуш Корзан налічваў 3800 паўстанцаў, што ўдзельнічалі ў гэтым паходзе, называючы драгічынскую міліцыю, батальён К. Крулікоўскага, каманду палка Віртэмберга і полк Казаноўскага ў ліку фарміраванняў, што былі адасланыя да лагера ці пакінутыя ў Берасці (*Korzon T.* Wewnętrzne dzieje Polski za Stanisława Augusta. – T. 6. S. 247-248).
140. Серакоўскі паведамляў: "*Як толькі мой корпус прымаршыраваў з Булкова* (Булькова – вёска на Жабінкаўшчыне. – А.Б.) *у Крупчыцы, я даведаўся, што Сувораў са сваім корпусам стаў у Кобрыне, і зараз жа загадаў зрабіць абарону насыпаннем батарэі калі не для адбіцця, то хаця б для доўгай затрымкі далёка ад сябе мацнейшага непрыяцеля*" (*Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 164. *К. Серакоўскі – Т. Касцюшку. 22.09. 1794 г. Морды*).
141. *Бензярук А.* Крупчыцкі кляштар кармелітаў // *ЭГБ.* – Т. 4. С. 266.

142. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна (*НГАБ у Гродна*), ф. 1143, воп. 1, спр. 111, арк. 6 адв.
143. *Szyndler B.* Powstanie kościuszkowskie 1794. – S. 316.
144. *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. S. 170.
145. З рапарта Караля Серакоўскага: “*Перад сабою мы мелі багністую рэчку Трасцяніцу з грэбляй да карчмы, ля якой была насыпана батарэя з 2 гарматамі пад камандай паручніка Арлінскага і якую закрывала дывізія пяхоты з адным батальёнам фузілераў. Правым крылом камандаваў генерал Панятоўскі, левае было даручана генералу Красінскаму. Рэзервам жа кіраваў палкоўнік Кёніг*” (*Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 165. *К. Серакоўскі – Т. Касцюшку. 22.09. 1794 г. Макотуў).*
146. *Тамсама*. – Т. 2. С. 164.
147. *Zenowicz M.* Kampania oddziału wojsk polskich pod generałem Sierakowskim w roku 1794 // Pamiętniki wojenne 1792 – 1812. – Drezno, 1871. – S. 3.
148. *Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции. – С. 164. *А.В. Суво раў – П.А. Румянцаву. 16 (5). 09. 1794 г. Кобрын.*
149. *Тамсама*. – С. 163. *А.В. Суво раў – М.І. Дзіваву. 16 (5). 09. 1794 г. Кобрын.*
150. *Szyndler D.* Powstanie kościuszkowskie 1794. – S. 317.
151. *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. S. 171.
152. *Петрушевский А.* Генералиссимус князь Суворов. – С. 56.
153. Кобрынец Давід Якубовіч расказваў, што чуў ад свайго дзеда: “*Суво раў, выступаючы на бітву ў Крупчыцы, калі ўсё войска сабралося каля горада, аб’ехаў яго і заплакаў. Адразу ж падышлі кіраўнікі і пачалі супакойваць Суворава. Ён плакаў і гаварыў, што гэтых салдатаў больш за ўсё загіне ў Крупчыцах. Старыя гаварылі, што Суворао быў прарок і ўсё мог прадказаць*” (*Харкевич Ф.К.* Розыски на Суворовских полях сражений // Варшавский военный журнал. – 1900. – № 4. – С. 354).
154. Маецца на ўвазе сучасная вёска ў Кобрынскім раёне (мясцовая назва “Огородныкы”), якую нельга блытаць з суседняй вёскай Агароднікі Жабінкаўскага раёна (мясцовая назва-мянушка “Бараны”) (*Бензярук А.Р.* З гісторыі населеных пунктаў Жабінкаўшчыны // *Памяць... Жабінк. р-на.* – С. 480; *Князева В.М.* З гісторыі населеных пунктаў // *Памяць... Кобрынск. р-на.* – С. 561).
155. *Szyndler B.* Powstanie kościuszkowskie 1794. – S. 317. Гл. таксама сведчанні, пакінутыя на карце-схеме Крупчыцкага бою сувораўскім картографам П. Івашовым.
156. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 156. *А.В. Суво раў – П.А. Румянцаву. 2.10. 1794 г.* У дапаўненнях да гэтай кнігі “Спіс расійскіх палкоў, якія ўдзельнічалі ў Крупчыцкай і Тарэспальскай бітвах (17 і 19 верасня 1794 года)” названыя 16 палкоў, але трэба мець на ўвазе, што ўказаная колькасць адносіцца да абедзьвюх бітваў, акрамя таго не ўсе вайскоўцы бралі непасрэны ўдзел у баях: частка іх знаходзілася пры лагерах, забяспечваючы тылы, некаторыя, зразумела, былі раненымі ці хворымі.
157. Гл. у дапаўненнях да гэтай кнігі “Алфавітны паказальнік расійскіх генералаў і афіцэраў, што бралі ўдзел у Крупчыцкай і Тарэспальскай бітвах”.
158. Беручы пад увагу гэтыя разлікі, нельга пагадзіцца з меркаваннямі Хенрыка Масціцкага, які лічыў, што ў Суворава было усяго 11 000 салдат (*Mościcki H.* Generał Jasiński i powstanie kościuszkowskie. – S. 320). Мы больш схільныя згадзіцца з высновамі Я. Анішчанкі, які гаворыць пра 13 тысяч сувораўскіх штыкоў (*Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 6). Галоўная іх частка ўзяла ўдзел

у бітве, аднак рэшта салдат была пакінутая ў Кобрыне для прыкрыцця тылоў сувораўцаў і ў Малых Лепясах для ладавання абозаў.

159. 24 чэрвеня 1794 года падпаручнік 5-га рэгімента Ізыдар Красінскі разам з родзічамі выказаў жаданне за ўласны кошт сфарміраваць батальён і стаў ягоным кіраўніком у званні палкоўніка. Пазней, калі батальён быў ператвораны ў 18-ты рэгімент, палкоўнік стаў генерал-маёрам (*Herbst S.* Z dziejów wojskowych powstania. – S. 344).
160. Дзянізій Панятоўскі стаў генерал-маёрам 23 мая 1794 года (*Skałkowski A.* Jan Henryk Dąbrowski. 1755-1818. – W-wa, 1904. – Cz. 1. S. 319).
161. *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. S. 170.
162. *Родны край.* Адрыўны каляндар на 1993 год. – Мн., 1992. – С. 521.
163. *Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции. – С. 170. *А.В. Сувораў – П.А. Румянцаву. 26 (15). 09. 1794 г.*
164. *Бензярук А.* Крупчыцкі кляштар кармелітаў // *ЭГБ.* – Т. 4. С. 266. Пра кляштар і касцёл у Крупчыцах падрабязней гл. у наступным раздзеле гэтай кнігі.
165. *Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции. – С. 170. *А.В. Сувораў – П.А. Румянцаву. 26 (15). 09. 1794 г.*
166. Цыт. па: *Памяць... Жабінк. р-на.* – С. 80.
167. А. Бабурчык нават пераказваў словы Суворава, скіраваныя да Андраноўскага: *“Скажы, на міласць Бога, дзе тут лепш перайсці? Калі адвядзеш добра, дык узнагароджу цябе, а калі не – пакараю смерцю”.* Адраноўскі быццам адразу павёў конніцу ў абыход на ўрочышча Вілы (недалёка ад упадзення Трасцяніцы ў Мухавец), потым на Філіпавічы, Бусні і ў тыл паўстанцаў. Т. Бадзюк дадаваў, што ў Андраноўскага расійцы забралі коней, *“і ён прасіў іх вярнуць, а за тое абяцаў паказаць пераправу ва ўрочышчы Вілы”* (*Харкевич Ф.К.* Розыски на Суворовских полях сражений // Варшавский военный журнал. – 1900. – № 2. – С. 118).
168. *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarne. – T. 2. S. 171.
169. *Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции. – С. 170. *А.В. Сувораў – П.А. Румянцаву. 26 (15). 09. 1794 г.*
170. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 165. *К. Серакоўскі – Т. Касцюшку. 22.09. 1794 г. Морды.*
171. *Петрушевский А.* Генералиссимус князь Суворов. – С. 57.
172. *Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции. – С. 170. *А.В. Сувораў – П.А. Румянцаву. 26 (15). 09. 1794 г.*
173. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 165. *К. Серакоўскі – Т. Касцюшку. 22.09. 1794 г. Морды.*
174. *Herbst S.* Z dziejów wojskowych powstania. – S. 370-371.
175. *Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции. – С. 170. *А.В. Сувораў – П.А. Румянцаву. 26 (15). 09. 1794 г.*
176. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 165. *К. Серакоўскі – Т. Касцюшку. 22.09. 1794 г. Морды.*
177. Абагульняючы вынікі Крупчыцкага бою, Сувораў пісаў Пятру Румянцаву: *“У той жа самы час пяхота, пераправіўшыся цераз гразкі ручай, што ўпадае ў Мухавец, пачала атакаваць а 10 гадзіне, а конніца левага флангу за ёй – праз чвэрць гадзіны правага ж флангу, перайшоўшы два разы рэчку Мухавец і апошні захапіўшы, таксама пасля левага флангу праз чвэрць гадзіны.”* (*Восстание и война 1794 года* в Литовской провинции. – С. 170-171. *А.В. Сувораў – П.А. Румянцаву. 26 (15). 09. 1794 г.*).
178. *Herbst S.* Z dziejów wojskowych powstania. – S. 373.

179. *Петрушевский А.* Генералиссимус князь Суворов. – С. 57.
180. *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarne. – T. 2. S. 173.
181. *Петрушевский А.* Генералиссимус князь Суворов. – С. 58.
182. *Бензярук А.* Памяць нашае зямлі. – С.16.
183. Гэты дом звaўся "Дваром Малішэўскага". М. Зяновіч сцвярджаў, што на ўласныя вочы бачыў, як на ягоным ганку тры жанчыны ўпалі на калені перад суворaўцамі, просячы літасці, але былі забітыя (гл.: *Bartoszewicz K.* Dzieje insurekcji kościuszkowskiej. – S. 341, przyp. 3).
184. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 166. *К. Серакоўскі – Т. Касцюшку. 22.09. 1794 г. Морды.*
185. *Herbst S.* Z dziejów wojskowych powstania. – S. 373-374; *Szyndler B.* Powstanie kościuszkowskie 1794. – S. 317.
186. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 166. *К. Серакоўскі – Т. Касцюшку. 22.09. 1794 г. Морды.* Пра выключную ролю артылерыі пад Крупчыцамі і Тэрэспалем расказвалі нават тыя, хто не браў непасрэднага ўдзелу ў бітвах. Напрыклад, Дэрфельдэн, які знаходзіўся ў Пружанах (!), рапартаваў князю Рапніну, што чуў кананаду з боку Берасця і з гэтага робіць выснову: Суворaў штурмуе Берасце (*Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarne. – T. 2. S. 227).
187. Селянін з вёскі Чыжэўшчына Іван Сірацюк сведчыў: "*Мой дзядуля жыў каля 100 год. Ён часта гаварыў, што бітва паміж рускай і польскай конніцай была на пясках па дарозе да ф(альварка) Янопаль. Лесу там раней не было, а сённяшні не гэтак даўно пасаджаны памешчыкам Відацкім. Біліся там "на палашы". Забітыя пахаваныя на тым месцы, дзе цяпер стаіць капліца таго самага памешчыка. Каля грэблі праз Трасяніцу таму гадоў 50 назад былі створаныя ваенныя могілкі, дзе хавалі салдат з лазарэта ў Крупчыцах. Цяпер гэтыя могілкі пазарасталі хвояю. Яшчэ да адкрыцця могілак там стаяў чорны рускі крыж. Вакол манастыра ў старажытнасці была каменная агароджа. Туды спрабавалі схавацца палякі, але іх амаль усіх рускія выразалі*". (*Харкевич Ф.К.* Розыски на Суворовских полях сражений // Варшавский военный журнал. – 1900. – № 3. – С. 226-227. *І. Сірацюк. 1899/1900 г. Чыжэўшчына*). Пра гэта распавядае і А. Петрушэўскі: "*... некаторыя беглі, каб схавацца за мурамі манастыра, дзе, аднак, былі дагнаныя і пераколатыя*" (*Петрушевский А.* Генералиссимус князь Суворов. – С. 58).
188. Пра яе вынікі Караль Серакоўскі пісаў: "*Зрэшты, што да жаўнераў, то колькасць забітых і... параненых яшчэ меней, акрамя рэкрутаў, якія паразбягаліся*" (*Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 167. *К. Серакоўскі – Т. Касцюшку. 22.09. 1794 г. Морды*). Пад уплывам прац У.П. Емяльянчыка ў беларускай гістарыяграфіі склалася ўяўленне, што асноўнымі паўстанцкімі сіламі, якія змагаліся пад Крупчыцамі, былі сяляне-касінеры. Аднак гэта не адпавядае рэчаіснасці. Галоўную сілу складалі рэгулярныя аддзелы. Баяздольнасць паспалітага рушання, валанцёраў ды рэкрутаў была невысокаю. Існуе шмат сведчанняў на гэты конт. Павел Грабоўскі нават катэгарычна пісаў Серакоўскаму: "*Абывацелі тут... непатрэбныя*" (*Тамсама.* – Т. 2. С. 142. *П. Грабоўскі – К. Серакоўскаму. 30.08. 1794 г. Грынкі*). І тут гаворыць не шляхецкая фанаберыя, а рэальная ацэнка ваенных вартасцяў воінаў-сялян. Магчыма, на погляды У.П. Емяльянчыка паўплывалі дзеянні касінераў пад Рацлавіцамі 4 красавіка 1794 года (*Емяльянчык У.* Рацлавіцкая бітва 1794 // *ЭГБ.* – Т. 6. Кн. І. – Мн., 2001. – С. 115).
189. 17 верасня сонца зайшло ў 19 гадзін 22 хвіліны (*Родны край.* Адрыўны каляндар на 1993 год. – С. 521).

190. *Харкевич Ф.К.* Розыски на Суворовских полях сражений // Варшавский военный журнал. – 1900. – № 3. – С. 228. *Р. Созан, І. Алексяевіч, А. Каржук. 1899/1900 г. Азяты, Старое Сяло.* Характэрна, што расказваючы пра падзеі 1794 года, Ілля Алексяевіч у адносінах да паўстанцаў ужывае займеннік *“нашы”*, таксама згадвае, што казакі *“падпалілі вёску Целякі, якая і згарэла дашчэнту”*.

191. *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. S. 174. Верагодна, гэты атрад прабіваўся да Берасця іншым шляхам: праз Амялінку, Задзерць і Булькова. Каб спыніць рух расійцаў, яны спалілі Булькоўскі мост (*НГАБ у г. Гродне*, ф. 8, воп. 1, спр. 29, арк. 2.).

192. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 166. *К. Серакоўскі – Т. Касцюшку. 22.09. 1794 г. Морды.*

193. *Herbst S.* Z dziejów wojskowych powstania. – S. 374.

194. М. Дэспат-Зяновіч налічваў 67 раненых серакоўцаў, яшчэ 192 былі забітыя ці пакінулі поле бою. (Гл.: *Szyndler B.* Powstanie kościuszkowskie 1794. – S. 318, 410). А. Сувораў увогуле гаворыць пра 2000 (ці нават 3000) знішчаных і паланёных палякаў пад Крупчыцамі. Расійскі военачальнік нават называе сярод забітых генерала К. Рушчыца, а пазней – і генерала І. Красінскага. Аднак праз два дні Сувораў будзе мець шчасце зноў сустрэцца з тымі “забітымі” (на паперы) паўстанцамі, якіх ізноў павядзе ў бой малады генерал-маёр Ізыдар Красінскі. Той увогуле пражыве доўга, у 1806 годзе стане брыгадным генералам, у 1812-м – генералам дывізіі, а ў 1830-м – ваенным міністрам. Казімір Рушчыц таксама шчасліва перажыве 1794 год. І памрэ толькі каля 1815-га. Гэтыя факты яшчэ раз сведчаць, наколькі “надзейнаю” крыніцаю з’яўляюцца сувораўскія рапарты.

195. *Анішчанка Я.* Збор твораў. – Т. 2. С. 166-167. *К. Серакоўскі – Т. Касцюшку. 22.09. 1794 г. Морды.*

196. *Korzon T.* Wewnętrzne dzieje Polski za Stanisława Augusta. – T. 6. – S. 252-255.

197. *Петрушевский А.* Генералиссимус князь Суворов. – С. 59. Так званы “Сувораўскі” дуб, які да ліпеня 1993 года рос на ўскрайку Крупчыцкага поля, рэальна не мог быць месцам адпачынку Суворава, паколькі знаходзіўся далёка ад Янопаля. Тут, безумоўна, мы маем прыклад народнай легенды (*Сахарчук В.Я.* Помнікі прыроды // *Памяць... Жабінк. р-на.* – С. 435-436). Згодна даведнікаў, дуб каля Хадасоў “меў незвычайную таўшчыню ствала – звыш двух з паловаю метраў у дыяметры” (*Памятники природы Белоруссии.* – Изд. 2, перераб. и доп. – Мн., 1986. – С. 117, фота дрэва).

198. *Суворов А.В.* Походы и сражения в письмах и записках. – С. 354-355. *А.В. Сувораў – П.А. Румянцаву. 17(6).09. 1794 г. На маршы.* Мы пазначаем, што рапарт складзены ў дарозе, аднак ліст напісаны, хутчэй за ўсё, яшчэ ў Янопалі, паколькі сувораўцы пакінулі фальварак ноччу 18 верасня.

199. Гл.: *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. S. 180, przyp. 30; *Петрушевский А.* Генералиссимус князь Суворов. – С. 59. Сярод забітых расійцаў паказаны капітан Фёдар Керн і ротмістр Паткуль. Казімеж Барташэвіч у свой час настойваў на лічбе ў 3000 забітых сувораўцаў. Пры гэтым абапіраўся на працу М. Зяновіча (*Zenowicz Despot M.* Kampania oddziału wojsk polskich pod generałem Sierakowskim w roku 1794 // Pamiętniki wojenne 1792 – 1812. – Drezno, 1871). Той апавядаў, што расійскі генерал Грэсер, які ў 1794 годзе быў капітанам пры штабе Суворава, заўсёды цвердзіў: *“Паверыць ніхто не можа, чаго каштавала для нас тое спатканне”*, а калі Зяновіч напомніў яму пра

3000, Грэсер толькі паўтарыў: “*верыць ніхто не хацеў бы, колькі мы страцілі*” (цыт. па: *Bartoszewicz K.* Dzieje insurekcji kościuszkowskiej. – S. 341, przyp. 2).

200. Гэты шлях Сувораву ўжо быў знаёмы. Упершыню ён праходзіў праз Ракітніцу ў 1771 годзе, калі браў удзел у задушэнні Барскай канфедэрацыі. (*Пліско Н.М.* Час Суворава // *Памяць... Кобрынск. р-на.* – С. 52). Расійцы рухаліся так званым Старым трактам, які фактычна перастаў функцыянаваць пасля пабудовы ў 40-ыя гады XIX стагоддзя “Варшаўкі” – Маскоўска-Варшаўскай шашы (сёння яна носіць назву шашы Брэст – Мінск, але ў народзе завецца “Алімпійкаю”, паколькі была значна рэканструяваная напрыканцы 1970-ых гадоў, перад XXII Алімпійскімі гульнямі).
201. *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. S. 174.
202. *Ibidem.* – T. 2. S. 175.
203. З рапарта Суворава вядома, што гэтымі высілкамі кіраваў падпалкоўнік Пётр Івашаў, аўтар планаў Крупчыцкай і Тэрэспальскай бітваў.
204. У 1968 года вёска Трышын увайшла ў межы Брэста. Сёння пра яе існаванне нагадвае назва вуліцы – Трышынская. Каля мясцовай школы-інтэрната месціцца абеліск, пастаўлены ў 1837 годзе. На ім надпіс: “*На тэрыторыі Трышына 7 верасня 1794 года стаялі войскі А.В. Суворава, рыхтуючыся фарсіраваць Мухавец*”. Помнік двойчы рэстаўраваўся (ў 1952 і 2000 гадах). У 1990-ыя гады быў моцна пабіты. (*Брест.* Энциклопедический справочник. – Мн., 1987. – С. 346; *Купцова В.Р.* Вёскі, якія ўвайшлі ў межы Брэста // *Памяць... Брэста.* – Кн. 2. С. 473; Гістарычная брама. – 2004. – № 1. – С. 2, фотаздымак Уладзіміра Сухапара).
205. У месцы пераправы сувораўцаў у 1902 годзе архітэктарам В. Панам быў узведзены абеліск. Праз паўстагоддзя помнік быў адноўлены, а ў 1973 годзе дэмантаваны. (У 1996 годзе пастаўлены новы). Каля гэтага месца праз Мухавец быў пабудаваны мост, названы Сувораўскім. У 1943 годзе яго двойчы ўзрывалі партызаны. Сувораўскі мост рэстаўраваны ў 1952 годзе і канчаткова знесены ў 1970-м. (*Купцова В.Р.* Вёскі, якія ўвайшлі ў межы Брэста // *Памяць... Брэста.* – Кн. 2. С. 474). Два зручныя броды і звесткі пра паўстанцкія сілы А. Сувораву ўказаў прадстаўнік берасцейскага кагалу, які прасіў за гэта не дазваляць расійскім салдатам чапаць яўрэяў і іх маёмасць (*Szyndler B.* Powstanie kościuszkowskie 1794. – S. 318).
206. *Анішчанка Я.К.* Збор твораў. –Т. 2. С. 157. *П.С. Пацёмкін – А.В. Сувораву. 1.10. (20.09). 1794 г.*
207. *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. S. 175.
208. *Анішчанка Я.К.* Збор твораў. –Т. 2. С. 158. *П.С. Пацёмкін – А.В. Сувораву. 1.10. (20.09). 1794 г.*
209. У рапарце Пятра Пацёмкіна зноў з’яўляецца вобраз “Суворава – жаха палякаў”: “*Непрыяцель, адчувачы раны ад першага ўдару, нанесенага пад Крупчыцамі, унікаў новага бою з войскамі пад кіраўніцтвам знакамітага героя, адно імя якога наводзіць на іх жах*”. (*Анішчанка Я.К.* Збор твораў. – Т. 2. С. 159. *П.С. Пацёмкін – А.В. Сувораву. 1.10. (20.09). 1794 г.*).
210. Цыт. па: *Mościcki H.* Generał Jasiński i powstanie kościuszkowskie. – S. 324. *К. Серакоўскі – Т. Касцюшку. 22.09. 1794 г. Макотуў.*
211. Цыт. па: *Szyndler B.* Powstanie kościuszkowskie 1794. – S. 319.
212. *Анішчанка Я.К.* Збор твораў. –Т. 2. С. 161. *П.С. Пацёмкін – А.В. Сувораву. 1.10. (20.09). 1794 г.*
213. *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. S. 178-179.

214. *Insurekcja, insurekcja...* Wypisy z Gazety Wolnej Warszawskiej. – W-wa, 1994. – S. 45. Пра паражэнне К. Серакоўскага пад Берасцем “Вольная варшаўская газета” паведаміла толькі 28 кастрычніка.
215. Пацёмкін дакладаў Сувораву: “*Такім чынам была здзейснена гэтая знакамітая перамога. Непрыяцель, які да паразы пры Крупчыцы меў корпус больш за 16 000, ледзь да ста пяцідзесяці чалавек выратаваць змог, а генерал Серакоўскі з Панятоўскім, двума афіцэрамі і такой самай колькасцю ніжніх чыноў збег. І тым яна знакамітая, што адна нашая конніца пачала і завершыла такую слынную перамогу. Уся непрыяцельская артылерыя: 24 гарматы і 2 гаўбіцы медныя і 2 гарматы чыгунныя, – усяго 28 гарматаў ў нашых руках, шмат скрыняў са снарадамі, два сцягі корпусныя, з якіх адзін белы для пяхоты, а другі светла-сіні для кавалерыі... Палонных да 500 чалавек. Такая колькасць невялікая, калі параўноўваць з вынішчэннем усяго непрыяцельскага корпуса, але разлютаваныя нашыя войскі нідзе літасці не давалі*”. (*Анішчанка Я.К.* Збор твораў. –Т. 2. С. 164. *П.С. Пацёмкін – А.В. Сувораву. 1.10. (20.09). 1794 г.*). К. Барташэвіч вельмі крытычна ставіўся да паведамленняў, якія паходзілі з сувораўскага штаба: “*Суvораў заўсёды пісаў рапарты з такой фантазіяй. У адным з расійскіх мемуараў мы чытаем, што пасля нейкай бітвы з туркамі ад’ютант, складаючы рапарт, запытаў яго: ці будзе досыць паказаць непрыяцельскія страты ў 5000? “Напішы 15 000, – адказаў Суvораў, – навошта нам туркаў шкадаваць*” (*Bartoszewicz K.* Dzieje insurekcji kościuszkowskiej. – S. 342, przyp. 1).
216. *Korzon T.* Wewnętrzne dzieje Polski za Stanisława Augusta. – T. 6. S. 256-257.
217. Гл.: *Pamiętnik* Stanisława Kosmowskiego z końca XVIII wieku. – Wyd. 2. – Poznań, 1867.
218. Ібрагім Канапацкі вызначаў паўстанне 1794 года як “*адну з самых трагічных і разам з тым гераічных старонак гісторыі татараў Вялікага княства Літоўскага. Яно пацвердзіла правільны кірунак выпрацоўкі ўласнай нацыянальнай самасвядомасці – змагацца разам з іншымі народамі за лепшую долю сваёй краіны*” (*Канапацкі І.* Удзел татараў ВКЛ у паўстанні 1794 г. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 12. – С. 26).
219. *Mościcki H.* Generał Jasiński i powstanie kościuszkowskie. – S. 328.
220. *Powstanie kościuszkowskie 1794.* Dzieje militarnie. – T. 2. S. 215.
221. *Ratajczyk L.* Losy Tadeusza Kościuszki po bitwie Macieowickiej // Krajowe sympozjum Kościuszkowskie w Macieowicach. – S. 1.
222. *Бантыш-Каменский Д.* Биографии российских генералиссимусов и генерал-фельдмаршалов – Ч. 2. С. 133, 136-137.
223. *Емяльянчык У.* Паланез для касінераў. – С. 158.
224. У 1770 годзе створана рукапісная карта “Польшча, прадстаўленая стратэаграфічна на аснове дакладных памераў” К. дэ Партэеса, у 1793 годзе – “Чарцёж земляў, новапрыдбаных Расіяй ад Польшчы”. На абодвух мапах паказаныя Крупчыцы (*Казлоў Л.Р.* Картаграфія Беларусі падчас паўстання Тадэвуша Касцюшкі. – Мн., Брэст, 2004. – С. 6, 8-9).
225. *Бензярук А.* Крупчыцкі кляштар кармелітаў // *ЭГБ.* – Мн., 1997. – Т. 4. С. 266.
226. *Ярашэвіч А.* Кармеліты // *ЭГБ.* – Т. 4. С. 117.
227. *Podręczna encyklopedya kościelna.* – W-wa, Kr., 1910. – S. 341; *Дзярновіч А.* Ордэн Шчаснай Панны Марыі з гары Кармэль // Наша Ніва. – 1992. – № 8. – С. 9.
228. *НГАБ г. Гродне,* ф. 1159, воп. 3, спр. 97, арк. 76.

229. *Бензярук А.* Кармяліцкі кляштар у Крупчыцах // Беларуская мінуўшчына. – 1996. – № 2. – С. 35.
230. Некаторыя беларускія даследчыкі памылкова лічылі, што Крупчыцкі манастыр быў заснаваны ў XVI стагоддзі, а ў 1882 годзе згарэў (гл.: *Чернявская Т.И.* Владимирская церковь // Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область. – Мн., 1990. – С. 187; *Лаўрэцкі Г.А.* Чыжэўшчынская Уладзімірская царква // Архітэктура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. – Мн., 1993. – С. 485).
231. *НГАБ у г. Гродне*, ф. 1143, воп. 1, спр. 111, арк. 1-9 адв.
232. Тут і надалей побач з датамі грыгарыянскага (новага) стылю ў дужках падаюцца даты па юліянскім (старым) стылі.
233. *НГАБ у г. Гродне*, ф. 714, воп. 3, спр. 16, арк. 4, 25-26 адв.
234. *Тамсама*, ф. 97, воп. 1, спр. 513, арк. 18.
235. *Бензярук А.* З гісторыі Крупчыц // Гістарычная брама. – 2004. – № 1. – С. 27. Падрабязней пра І. Жалязоўскага гл.: *Литовские епархиальные ведомости.* – 1872. – № 8. – С. 279-282; *Орловский Е.* Судьбы православия в связи с историею латинства и унии в Гродненской губернии в XIX столетии (1794 – 1900). – Гродна, 1903. – С. 83-473; *Бензярук А.* Ігнацій, епіскап Брэсцкі // *Памяць... Жабінк. р-на.* –С. 131-133; *Яго ж.* Шлях і турботы епіскапа Ігнація // Przegląd Prawosławny. – № 3. – S. 42-43.
236. *НГАБ у г. Гродне*, ф. 97, воп. 1, спр. 513, арк. 18-18 адв.
237. *Тамсама*, арк. 1.
238. *Харкевич Ф.К.* Розыски на Суворовских полях сражений // Варшавский военный журнал. – 1900. – № 2. – С. 116. Тутэйшыя сяляне бачылі ў пажары нядобры знак, лічачы, што ягонаю прычынаю стаў факт пераўтварэння каталіцкага храма ў праваслаўны.
239. Арцём Бабурчык, Трафім Бадзюк, Каленік Загонскі, Лука Курыга, Якаў Чырок, Філіп Барташук, Сцяпан Шыганскі, Дзяніс Ахрымук, Ефрасіння Каршук, Радзіён Іллінскі, Пётр Літвінюк, Павел Пашычук, Іван Сірацюк, Нестар Паўлючук, Сцяпан Станіслаўскі, Рыгор Сазон, Ілля Алексяевіч, Аляксандр Каржук, Павел Чарнак.
240. Апошнія тры вёскі ў 1971 годзе былі аб'ядналыя ў адну з агульнай назвай Чыжэўшчына (*Рапановіч Я.Н.* Слоўнік назваў населеных пунктаў Брэсцкай вобласці. – Мн., 1980. – С. 112.).
241. Верагодна, ім быў Фларыян Непакойчыцкі, уласнік земляў, на якіх у 70-ыя гады XIX стагоддзя ўзнікла чыгуначная станцыя Жабінка (*НГАБ у г. Гродне*, ф. 2, воп. 10, спр. 1744, арк. 50 адв.-51; ф. 27, воп. 1, спр. 225, арк. 8 адв.; *Памятная книжка* Гродненской губернии за 1914 г. – Гродна, 1913. – С. 277.)
242. Гл. падрабязней: *Харкевич Ф.К.* Розыски на Суворовских полях сражений // Варшавский военный журнал. – 1900. – №№ 2, 3.
243. Жабінкаўскі памешчык, з якім вёў размову Ф. Харкевіч, памылкова згадваў пра згубу паўстанцамі пад Крупчыцамі артылерыі: "*Чуў я ад самых палякаў, што калі войска Серакоўскага было пабітае на крупчыцкай пазіцыі, некалькі гармат і зарадных скрыняў яны кінулі ў глыбокі ставок каля трасцяніцкай грэблі. Там яны ляжаць і цяпер*".
244. Верагодна, гэта тыя самыя рэчы, што цяпер экспануюцца ў Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А.В. Суворава.
245. *НГАБ у г. Гродне*, ф. 97, воп. 1, спр. 513, арк. 17-17 адв.

246. *Бензярук А.* З гісторыі Крупчыц // Гістарычная брама. – 2004. – № 1. – С. 27-28; *НГАБ у г. Гродне,* ф. 97, воп. 1, спр. 513, арк. 20-21.

247. Ф. Харкевіч лічыў, што чаравачыцкі святар быў узнагароджаны за абедню, якую адслужыў напярэдадні бою.

248. *НГАБ у г. Гродне,* ф. 97, воп. 1, спр. 513, арк. 22-22 адв. Сваімі поглядамі Міканор Катовіч падзяліўся і з капітанам Харкевічам: *“У дзень асвячэння тут новага храма мною была складзеная і раздадзеная сялянам невялікая брашура, якая нагадвала ім пра значную гістарычную падзею, што адбылася 6 верасня 1794 года на Крупчыцкіх палях”* (*Харкевич Ф.К.* Розыски на Суворовских полях сражений // Варшавский военный журнал. – 1900. – № 3. – С. 229).

249. *Бензярук А.* Кармяліцкі кляштар у Крупчыцах // Беларуская мінуўшчына. – 1996. – № 2. – С. 36.

250. *Памяць... Жабінк. р-на.*– С. 110. Аднак штабс-капітан Высоцкі ўзімку 1899/1900 года ўсё ж паспеў сфатаграфаваць некаторыя напаўразбураныя манастырскія пабудовы (гл.: *Альбом Суворовских путей сражений.* Издание редакции “Варшавского военного журнала”. – Варшава, 1900. – № 22).

251. У сховішчах Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці пінскі краязнаўца Аляксандр Ільін адшукаў цікавую дакладную запіску Міканора Катовіча на імя архіепіскапа палекага і пінскага Аляксандра ад 17 снежня 1936 года, у якой святар падрабязна расказвае пра будаўніцтва Крупчыцкага храма-помніка. У прыватнасці, ён даводзіў: *“Амаль 10 гадоў працягваліся мае клопаты, якія завяршыліся бліскучым поспехам: прыняўшы пад увагу гістарычнае значэнне Крупчыцаў (тут 6 верасня 1794 года адбылася бітва Суворава з ген. Серакоўскім), руская казна асігнавала 23 000 руб. на будаўніцтва каменнага храма-помніка. А разам з дадатковымі асігноўкамі і ахвярамі прыхаджанаў і прыватных асобаў гэтая сума ўзрасла амаль да 30 000 руб. Акадэмікі Бенуа і Жубер склалі цудоўны план (пазней паводле яго была пабудаваная царква пры царскім двары ў Белавежы), і ў 1891 годзе пачалася будоўля, пад час якой недабрасумленны падрадчык, на жаль, дапусціў некаторыя злоўжыванні. ... Я павёў з гэтым падрадчыкам энергічную барацьбу, нягледзячы на тое, што ён карыстаўся моцнай падтрымкай з боку ўплывовых асоб, нават самога Начальніка Края – Віленскага генерал-губернатара. Змаганне гэтае здавалася безнадзейным – я быў адзін, а супраць мяне – усе. Я нават атрымаў загад на звальненне з прыходу. Але “Не ў сіле Бог, а ў праўдзе”. Я дасюль застаюся на месцы, а з маіх ганіцеляў нікога ўжо няма на свеце. Падрадчык вымушаны быў лічыцца са мной, зменшыць свае апетыты і добрасумленна ставіцца да справы. Я цэлыя тры гады штодзённа праводзіў на будоўлі, наглядаючы за ёй, забыўся на гэты час пра ўсе асабістыя справы. Без перабольшання можна сказаць, што кожная цагліна ў гэтай царкве была пакладзеная пад маім наглядам...”* (*Ильин А.* Полесские священники Котовичи (черевачицкая ветвь) // Гістарычная брама. – 2004. – № 1. – С. 32).

252. *Харкевич Ф.К.* Розыски на Суворовских полях сражений // Варшавский военный журнал. – 1900. – № 3. – С. 230.

253. *Памяць... Жабінк. р-на.*– С. 112.

254. Цяпер мемарыяльная дошка экспануецца ў Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А.В. Суворава.

255. *Ильин А.* Полесские священники Котовичи (черевачицкая ветвь) // Гістарычная брама. – 2004. – № 1. – С. 32.

256. *Бензярук А.* З гісторыі Крупчыц // Гістарычная брама. – 2004. – № 1. – С. 28. У 1999 годзе намаганнямі аддзела культуры Жабінкаўскага райвыканкама на будынку была ўсталяваная дошка з надпісам: *"Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Гісторыка-культурная каштоўнасць. Чыжэўшчынская (Крупчыцкая) Свята-Уладзімірская царква (1894 г.). Ахоўваецца дзяржавай"*. Таксама было складзенае хадайніцтва да Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі пра наданне храму статусу каштоўнасці рэспубліканскага значэння. Адпаведнае рашэнне было прынятае навукова-метадычнай радай Міністэрства культуры і зацверджанае пастановаю Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь: царква ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны, атрымаўшы III ахоўную катэгорыю.
257. Выяву абеліска ("Помніка салдатам А.В. Суворава") гл.: *Гарады і вёскі Беларусі*: энцыклапедыя. – Мн., 2006. – Т. 3. Кн. 1. С. 352.
258. *Несцярчук Л.М.* Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка. – С. 225. Са звароту берасцейскай Рады Фонда Тадэвуша Касцюшкі ад 6 студзеня 1995 года: *"Ва ўсіх дзяржавах, дзе жыў і дзейнічаў Касцюшка... яго імя ўшанавана належным чынам... Зараз у Брэсцкай вобласці разгортваецца работа па адраджэнні спадчыны Касцюшкі... Але відавочна, што на абласным узроўні гэтыя праблемы вырашыць немагчыма. Юбілей Касцюшкі... мае сусветнае значэнне, таму патрабуецца ўвага і падтрымка Урада Рэспублікі Беларусь, шырокамаштабная праграма падрыхтоўкі да гэтай знамянальнай даты. У сувязі з вышэй выкладзеным, прапануем наступнае:*
*Кабінету Міністраў Рэспублікі Беларусь разгледзець і прыняць адпаведнае рашэнне аб падрыхтоўцы да 250-годдзя з дня нараджэння Т. Касцюшкі;*
*Уключыць у рэспубліканскую праграму падрыхтоўкі юбілею... наступныя пытанні:*
*– абвяшчэнне 1996 года – Годам Тадэвуша Касцюшкі;*
*– аднаўленне Дома-сядзібы Касцюшкі і палаца графаў Пуслоўскіх ва ўрочышчы Марачоўшчына пад Косавам Івацэвіцкага раёна і стварэння ў іх музейна-турыстычнага комплексу (Мемарыяльнага музея Тадэвуша Касцюшкі);*
*– будаўніцтва помніка Касцюшку ў Брэсце;*
*– устаноўка помніка на месцы пахавання (Крупчыцкія палі пад Жабінкай і Кобрынам) беларускіх воінаў-касінераў, загінуўшых у часы паўстання 1794 г. на Беларусі;*
*– правядзенне Міжнароднага навуковага сімпозіума, прысвечанага юбілею Касцюшкі"*. Трэба зазначыць, што за дзесяцігоддзе, якое мінула пасля абвяшчэння гэтага гістарычнага дакумента, засталіся невыкананымі толькі два падпункты (1996 год так і не быў афіцыйна абвешчаны годам Тадэвуша Касцюшкі, хоць і святкаваўся вельмі годна на Берасцейшчыне, а ў Берасце дагэтуль не ўсталяваны помнік генералу).
259. Папярэдне (5 сакавіка 1999 года) будаўніцтва было ўзгодненае з Адміністрацыяй Прэзідэнта, а праз шэсць дзён – з Саўмінам.
260. *Бензярук А.* Адгукнулася мінулае словам-успамінам // Гістарычная брама. – 2004. – № 1. – С. 27.
261. *Іванчанка М.* Святыня ў памяць загінуўшых воінаў // Сельская праўда. – 2004. – 29 верас.; *Бензярук А.* Капліца на Крупчыцкім полі // Przegląd Prawosławny. – 2004 – № 12. – S. 50-51.
262. *Бензярук Р.* Тры свечкі: Вершы. – Брэст, 1997. – С. 22.
263. Крупчыцкая капліца стала часткаю турыстычнага маршруту. Яе наведваюць госці з многіх краін свету. Напрыклад, 4 лютага 2006 года тут пабывалі пасол

